ЛіМ
ТАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА
28 студзеня 1994 г. № 4 (3726) Кошт 30 руб.

«ЁСЦЬ ЖА ЯШЧЭ Ў МЯНЕ ВЕРА...»

(ЗАМЕСТ РЭЦЭНЗІІ)

Спектакль закончаны. Задаволеныя сабою акцёры пасмейваюцца, віншуюць адзін аднаго, паціскаюць рукі, ляскаюць у ладкі. Усё прайшло па сцэнарыі — гладка і без накладак. Не ўтойвае радасці і рэжысёр, ён жа сцэнарыст і выканаўца адной з галоўных роляў: перамога поўная. Ён і не чакаў, што ягоны апанент прайграе гэтак бяздарна і лёгка. Зрэшты, што яму было рабіць, калі яшчэ да пачатку спектакля ўсё было ясна — пралічана і распісана да дробязей.

Рэжысёр пакуль не думае пра заўтра. Ён дабіўся сваёй мэты і цяпер ніхто і нішто не будзе перашкаджаць яму кіраваць тэатрам абсурду, ставіць у ім любыя п'есы. Ён пакуль не думае, што заўтра яму ўжо не будзе на каго спісваць свае пралікі, непрафесійнасць, недальнабачнасць. Не думае ён і пра гледачоў. А што думаць пра бязвольных, памяркоўных людзей, якія гатовы верыць любому прыгожаму абяцанню і не хочуць думаць ні пра што, акрамя свайго страўніка...

Што ж, няхай парадуецца сваёй перамозе. Але гэтая перамога — пірава. Яна раскрые, нарэшце, вочы народу, дазволіць яму агледзецца і ўбачыць, хто ім кіруе і як, хто вінаваты ў ягоных бедах і нягодах. І тады ўжо нішто не спыніць ягонае імкненне да волі... Мы верым у гэта.

Незалежнасць дасталася нам лёгка. Прыйшла сама. Але так і засталася госцяй у роднай хаце. Не змаглі мы яе прывеціць па-чалавечы. Ці ж дазволім цяпер розным прыхадням і янычарам выгнаць яе? Верым, што не. Верым у мудрасць народа, верым у ягоны інстынкт самазахавання, які павінен прачнуцца, верым у лепшую долю.

Як заўсёды, у змрочныя часы хочацца звярнуцца па параду да нацыянальнага прарока — Янкі Купалы. У далёкім 1926 годзе ён напісаў верш «Ёсць жа яшчэ...», які прасякнуты верай у сябе і ў цябе, няшчасны народзе:

Ёсць жа яшчэ ў мяне сіла
Крыўдзе не дацца, змагацца,
Над спячых продкаў магілай
Вольна маланкай мігацца.

Ёсць жа яшчэ ў мяне сэрца,
Поўнае шчырых жаданняў,
Якое перш разарвецца,
Чымся любіць перастане.

Ёсць жа яшчэ ў мяне песень,
Поўных надзеі, жыцця, —
Як бы ні быў ім свет цесен,
Вырвуцца ў свет з небыцця.

Ёсць жа яшчэ ў мяне вера
У вольны мой родны народ,
Што — у патрэбе — з сякерай
Выйдзе за волю ў паход!

Ёсць жа яшчэ... Ну, а людзі?
Сябры-суседзі тут, там?
Вы — непадкупныя суддзі,
Што ж яшчэ хочацца вам?!

Будзьма ж дастойнымі сынамі і дочкамі сваёй Бацькаўшчыны!



Гэты артыст бліскуча мог бы вызначыцца і на самай прэстыжнай сцэне расійскай правінцыі. Яго мог бы заангажаваць і сталічны тэатр хоць на Маскве-рацэ, хоць на Няве. Ён маляўніча і па-акцёрску сакавіта малюе незвычайны чалавечы характар у вельмі звычайнай па вонкавых адзнаках, нават у дэманстратыўна немудрагелістай асобе. Пэўная адметнасць рускага нораву выдатна праяўляецца ў тым, што робіць Павел Кармунін з ролямі ў п'есах Гогаля, Астроўскага, Чэхава, Горкага...

Мог бы — у Казані ці Разані, у Маскве або Піцеры, а вось трыццаць гадоў запар служыць любімай справе на купалаўскіх падмостках. Тут ён стварыў самыя яркія сцэнічныя партрэты ў сваёй даволі вялікай галерэі акцёрскіх работ. Тут яму давялося адчуць і потым старанна, па-вучнёўску пераадольваючы цяжкасці, зразумелыя пры пераходзе на іншую мову, вымаўляць па-беларуску самыя запаветныя для свайго сённяшняга героя словы. І па-мастакоўску даследаваць, паглыбляцца, увасабляць характар беларускага мужыка — ад Лявона Зяблікa і Сцяпана Крыніцкага да Антона Кроплі або Чарнушкі... Але, П. Кармунін тое-сёе і пераймаў, ён вучыўся на класічных узорах беларускіх акцёраў Г. Глебава і У. Дзядзюшкі. І ганарыцца тым, што мае права лічыць сябе прадаўжальнікам якраз іхніх традыцый у артыстычным мастацтве Беларусі.

У мяне нешта гучыць усё гэта занадта ўзнёсла. Узнёсласць жа — зусім чужая інтанацыя ў тэатральнай палітры гэтага сціплага чалавека. Ён прываблівае глядзельную залу чароўнай шчырасцю ў душэўнай дынаміцы свайго героя. Сумленных і высакародных парыванняў альбо нізкіх і ганебных — тых, што прадугледжаны прыродай тае асобы, якую называюць на падмостках «дзейная». Яго персанажы дзейнічаюць у промнях рампы. І глыбока перажываюць свой лёс. Бо П. Кармунін аддае сцэне жыццё...

— Інакш нельга, браце, — казаў ён мне надоечы. — Мне ж шчасціць выходзіць на такую сцэну... з такімі артыстамі... з такімі актрысамі... Ведаеш, наш любімы купалаўскі мае надзвычайную аўру... таямніча-чароўны павеў такі... Нельга тут хлусіць ні словам, ні рухам, ні позіркам, ні ўздыхам. Ну грэх вялікі — пнуцца як жаба на купіну і вырабляць акцёрскія выкрутасы!..

Сёння яго, хворага на вочы, выведуць на сцэну. Ён будзе старым бацькам Аўдзея. І памоліцца Богу, як гэта прадугледзеў У. Бутрамееў у п'есе «Крык на хутары». Памоліцца... Ды не толькі таму, што так яму дыктуе тэкст. Мой сябра Павел Кармунін мо і развітваецца са сцэнай у дзень свайго 75-годдзя. У асяроддзі партнёраў і калег. Пад удзячныя воплескі залы. Беларускі артыст. Народны...

Барыс БУР'ЯН

ЛІМ кола дзён

Вядома: хто не стварае, а толькі спажывае створанае іншымі. рана ці позна ператвараецца ў разбуральніка. Разбурыўшы асяроддзе, пачынае знішчаць самога сябе. Так і не здолеўшы за столькі гадоў стаць карысным для Беларусі, Вярхоўны Савет і сёння спакойна назірае, як разбураецца наша эканоміка, раскрадаецца і распрадаецца дзяржава. Сімптом самазнішчэння — замах наменклатурнай большасці ВС на кіраўнікоў так званых сілавых міністэрстваў, КДБ і МУС. Незалежна ад эмацыйнай афарбоўкі, якую маюць гэтыя абрэвіятуры яшчэ з бальшавіцкіх часоў, служба дзяржаўнай бяспекі і міліцыя — адзін з гарантаў спакою і парадку ў краіне, зрэшты, гарант існавання самога Вярхоўнага Савета. Раскол у КДБ і МУС, справакаваны Вярхоўным Саветам, пагражае стабільнасці ў грамадстве, набліжае нас да новых выпрабаванняў.

ПРАГНОЗ ТЫДНЯ

Пасля таго, як тры дні запар /мабыць, іншай справы ў Вярхоўнага Савета няма/ у авальнай зале Дома ўрада дэпутаты за зачыненымі дзвярамі абмяркоўвалі факт выдачы Жамойці двух жамойцкіх грамадзян, якіх улады суседняй краіны лічаць дзяржаўнымі злачынцамі, на прэс-канферэнцыі апазіцыі БНФ лідэр Фронту Зянон Пазняк назваў спробу зняцця з пасад міністра ўнутраных спраў, старшыні КДБ і Старшыні Вярхоўнага Савета звяном у плане стварэння на Беларусі аўтарытарнага рэжыму па прыкладзе Узбекістана. Спачатку адстаўка названых асоб, прызначэнне старшынёю парламента В. Кузняцова, той парупіцца, каб былі прыняты папраўкі ў Канстытуцыю, якія ўводзілі б пасаду прэзідэнта, роспуск Вярхоўнага Савета, далей — прэзідэнцкія выбары пад кантролем урада. Першае, што зробіць абраны такім чынам прэзідэнт РБ ад наменклатуры, — забароніць няўгодныя партыі і пазакрывае няўгодныя газеты, справакуе далейшае абвастрэнне эканамічнага і палітычнага крызісу ў Беларускай дзяржаве. І нарэшце — абвесціць адзіным выйсцем з крызісу далучэнне да Расіі ў якасці суб'екта канфедэрацыі альбо федэрацыі /ці не ўсё роўна, як назваць Мінскую губерню РФ?/. Зразумела ж, усе гэта «для выратавання суверэнітэту Беларусі». Шэф КДБ і міністр унутраных спраў адпраўлены ў адстаўку, пазбаўлены пасады Шушкевіч. Працэс пайшоў? Пакуль што Пазняк у палітычных прагнозах не памыляўся...

АДТЭРМІНОЎКА ТЫДНЯ

Расійскага прэм'ера Чарнамырдзіна чакалі ў Мінску для падпісання канчатковых дакументаў па «аб'яднанні» грашовых сістэм. 21 студзеня, потым — 29 студзеня, цяпер гаворка ідзе аб першай дэкадзе лютага. Відаць, не настолькі моцна стаіць на нагах сама Расія, каб, карыстаючыся выразам нашага прэм'ера, «узяць за руку Беларусь»...

ІМЯНІНЫ ТЫДНЯ

25 студзеня споўнілася 56 год з дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага /1938—1980/. Хоць дата і не круглая, «Астанкіна» і тэлеканал «Расія» адзначылі гадавіну спецыяльнымі праграмамі, прысвечанымі барду.

«И мой корабль без меня уйдет —
На нем, должно быть, люди выше сортом.
Вперед смотрящий смотрит лишь вперед —
Не видит он, что человек за бортом.

Я вижу — мимо суда проплывают,
Ждет их приветливый порт, —
Мало ли кто выпадает
С главной дороги за борт!»

СПАЛОХ ТЫДНЯ

Як паведамілі сродкі масавай інфармацыі, на Ігналінскай АЭС /Жамойць, на мяжы з Беларуссю/ з прычыны аварыі спынены першы блок. Рамонт планавалася здзейсніць за 4—5 дзён, і 26 зноў уключыць энергаблок. Пасля чарнобыльскай катастрофы грамадскасць Жамойці патрабавала закрыцця Ігналінскай АЭС. Урад незалежнай Жамойці такога пытання нават не ставіць, бо рэспубліка не мае альтэрнатыўных крыніц энергазабеспячэння.

КРЫЎДА ТЫДНЯ

25 студзеня, выступаючы на пасяджэнні Вярхоўнага Савета ў раздзеле «рознае», прадстаўнік ветэранскай арганізацыі выказаў крыўду на сродкі масавай інфармацыі Беларусі за тое, што тыя праігнаравалі /не паказалі па тэлебачанні, не пахвалілі ў газетах/ ветэранскі пікет ля «жалезнага Фелікса» насупраць КДБ у дзень візіту ў Мінск прэзідэнта ЗША; нават словам не абмовіліся наконт бальшавіцкай лістоўкі, распаўсюджанай у той дзень па горадзе.

Калі б таварышы ветэраны лепш разбіраліся ў законах /пасада народнага дэпутата РБ усё ж такі абавязвае.../, дык, мабыць, прыхавалі б сваю крыўду. Бо несанкцыянаваная акцыя палітычнага характару пад лозунгамі, змест якіх можна трактаваць як асабістую абразу прэзідэнта ЗША і старшыні парламента Беларусі — гэта, згодна законаў Беларусі, крымінал. Больш таго, палітычная правакацыя на мяжы з тэрарызмам.

Такім чынам, сваёй крыўдай ветэраны-дэпутаты дэманструюць непаразуменне тыдня ў адносінах да закона і няўдзячнасць тыдня ў адносінах да ўлад, якія свядома заплюшчваюць вочы тады, калі б трэба было закон выконваць.

Ну, а якія будуць дзеянні міліцыі, калі Чарнамырдзіна ў Мінску сустрэнуць пікеты праціўнікаў «аб'яднання»?

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

«Мяне часта пытаюцца, што я думаю аб перспектывах аднаўлення эканомікі Беларусі і будучага дабрабыту. Я адказваю, што я настроены аптымістычна і поўны энтузіязму. Людзі кажуць: «Але ж Беларусь цалкам знаходзіцца ў залежнасці па нафце і газу». Дык жа ў такім становішчы і Польшча, аднак у Польшчы кожны можа мець колькі заўгодна нафты і газу. Чаму? Таму што Польшча ўвяла сапраўдную валюту, здзейсніла фундаментальныя рэформы, здолела збалансаваць попыт з пастаўкай праз механізм цэн. Людзі таксама гавораць: «Але ж Беларусь не мае ніякіх прыродных рэсурсаў».

Па-першае, гэта не так. А па-другое, абмежаваныя прыродныя рэсурсы не сталі перашкодай для росквіту шэрагу краін. Швейцарыя яўляе сабою яскравы таму прыклад.

Акрамя таго, Беларусь мае сапраўды неацэннае багацце: гэта цудоўнае адукаванае грамадства, вялікая колькасць вышэйшых навучальных устаноў і даследчых інстытутаў, працалюбівы народ, шматабяцаючае маладое пакаленне і, што самае галоўнае, чыстую старонку ў гісторыі для стварэння такога грамадства, якога жадаюць самі беларусы — свабоднае ад вонкавага ўмяшання і залежнасці».

/Дэвід Суорц, да апошняга часу Надзвычайны і Паўнамоцны амбасадар ЗША ў Беларусі/.

ЮБІЛЕЙ ТЫДНЯ

26 студзеня ў сядзібе БНФ адбылася ўрачыстая імпрэза ў гонар 430-й гадавіны перамогі аддзела войска Вялікага княства Літоўскага на Чашніцкім полі ля ракі Ула над збройнымі часцямі баярына маскоўскага Васіля Шуйскага ў бітве 26 студзеня 1564 года. Чатырохтысячны аддзел Рыгора Хадкевіча разбіў дазвання маскоўскі экспедыцыйны корпус у 25 тысяч чалавек.

З нагоды

МЭТА ДАСЯГНУТА?..

Калі я распачынаў гэтыя нататкі, палітычнай падзеяй нумар адзін было пазбаўленне пасад старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі і міністра ўнутраных спраў. Аднак у рангу сенсацыі навіна трымалася толькі адзін дзень. Ужо назаўтра пацвердзілася прадбачанне апазіцыі, што генеральскія фуражкі Шыркоўскага і Ягорава патрэбны наменклатурнай большасці Вярхоўнага Савета толькі ў якасці прыстрэлкі па больш важнай мішэні — па Старшыні Вярхоўнага Савета. Лёс жа генералаў быў вырашаны ўжо ў той момант, калі яны асмеліліся выпусціць у абарону сваіх ведамстваў ад валюнтарысцкіх наскокаў «дзяржсакратара» Данілава. Я не стану перабольшваць дэмакратызм і беларускі патрыятызм памянёных генералаў. Каб дасягнуць сваіх пасад, яны павінны былі падняцца па высокай службовай лесвіцы, дзе на кожнай прыступцы даводзілася здаваць іспыт на «савецкасць». Так што генералы яшчэ тыя... Але ў канфлікце з дзяржсакратарыятам Э. Шыркоўскі і У. Ягораў выступалі як прафесійнікі, якія не жадалі падпарадкоўвацца самаўпэўненым дылетантам, ды яшчэ потым несці адказнасць за іхнія ўчынкі. У дадзеным выпадку прафесійныя і чалавечыя амбіцыі генералаў аб'ектыўна супадалі з інтарэсамі дзяржавы. Іх прынцыповая пазіцыя не давала ператварыць КДБ і МУС у асабістую гвардыю прэм'ер-міністра. Такое, паўтаруся, не даруецца.

І каб не было інцыдэнту з затрыманнем у Мінску і перадачы уладам Жамойці двух яе грамадзян, што пасля крывавых падзей у Вільні ў студзені 1991 года знаходзіліся «в бегах» /затрыманне і перадача затрыманых былі здзейснены ў адпаведнасці з законамі Беларусі і беларуска-жамойцкімі пагадненнямі/, дык знайшлася б іншая зачэпка. Натхняльнікі авантуры са звальненнем Э. Шыркоўскага і У. Ягорава не да канца ўяўлялі, да чаго яна можа прывесці. Яны і ад генералаў чакалі ці не ўзброенага супраціўлення. Бо інакш незразумела, дзеля чаго 20 студзеня без ведама міністра ўнутраных спраў былі прыведзены ў стан баявой гатоўнасці ўнутраныя войскі, а адзін батальён нават выведзены на вуліцу ў раёне Дома ўрада.

Абвінавачванні Э. Шыркоўскага і У. Ягорава выглядаюць яшчэ больш абсурднымі пасля таго, як прэзідэнт Жамойці афіцыйна падзякаваў Беларусі за дапамогу ў затрыманні злачынцаў, а старшыня сейма і прэм'ер-міністр выказалі здзіўленне з таго вэрхалу, які ў нас узняўся вакол «інцыдэнта». Яны мяркуюць, што ён проста скарыстаны як падстава для кадравых перастановак у нашым МУС і КДБ.

Зразумела, узрадаваліся нашы камуністы /здымак пікета, што на мінулым тыдні бальшавікі ладзілі ля будынка МУС-КДБ, вы бачыце/. Яны сёння перажываюць прыемнае пачуццё здзейсненай помсты. Але арганізатары палітычнай авантуры яшчэ не ўяўляюць, якія маральныя страты ўжо панесла ўлада, які самазабойчы ўдар нанесены і па прэстыжы Саўміна і па Вярхоўным Савеце /чатыры дні мусоліць штучны «інцыдэнт», калі стаяць заводы і невядома, як пройдзе сяўба/.

Пасля генералаў наменклатура ўзялася за Шушкевіча. Магчымасць такога абароту спікер дапускаў, але не думаў, што гэта будзе сур'ёзна. Лукашэнка, чый рэйтынг сярод мясцовага люмпена расце з хуткасцю, якая ўжо пачынае насцярожваць, зноў абвінаваціў Старшыню Вярхоўнага Савета ў злоўжыванні службовым становішчам. Зноў называліся нейкія лічбы /«четыре объекта», «тринадцать заказов», «пятнадцать заказов».../, зноў скланяліся на ўсе лады нейкія асаблівыя стасункі Шушкевіча з рамонтна-будаўнічым упраўленнем Саўміна. І ўсё гэта — з лямантам, размахваннем рукамі, патэтычнымі зваротамі да народа, які павінен ведаць праўду, і прапановамі Шушкевічу добраахвотна пайсці ў адстаўку або... застрэліцца.

У адрэдагаваным выглядзе абвінавачванне Шушкевіча выглядала так: адазваць з пасады за тое, што не змагаўся з карупцыяй і ўвогуле быў нясціплым. Як у «Пінскай шляхце»: адных каралі за тое, што біліся, другіх — за тое, што бачылі і не разнімалі, а трэціх — што не бачылі і не разнімалі.

Дакумент з падобнай фармулёўкай быў прыняты і ў адносінах да Кебіча. Потым і таму і другому далі «апошняе слова» перад галасаваннем.

С. Шушкевіч у сваёй прамове арыентаваўся на камуністычную большасць у ВС. Ведаў, дэмакраты хоць яго і не любяць за беспрынцыпную «згоду», але прагаласуюць за яго. Каб не даць лішніх шанцаў сваім апанентам. Быў у прамове цікавы момант, калі Шушкевіч даказваў, што ён не русафоб. Ён, маўляў, разумее, што Іван Грозны, Пётр І ды іншыя «расійскія кіраўнікі» праводзілі ў адносінах да беларусаў палітыку генацыду /тут ён з Пазняком згодны/, але сваіх, расейцаў, яны знішчалі мо яшчэ болей. «А гэта нас збліжае».

Дзіўная логіка! Гаварыў Шушкевіч і пра шырокі расійскі рынак, пра тое, што Старшыня ВС не можа несці адказнасці за гаротны стан краіны, бо не мае рэальнай улады, яшчэ пра нешта, а скончыў — «пра згоду».

Потым гаварыў В. Кебіч. «Я, — кажа, — ни в коррупции, ни в других неблаговидных действиях не замечен». Відавочна, хацеў сказаць «не замешан»... І яшчэ: «Я каждый месяц вызывал к себе начальника КГБ и спрашивал: «Есть ли у вас дела по коррупции?» А он отвечал: «Нет, уважаемый Председатель Совета Министров». А тут вдруг взялись какие-то дела!»

Святая прастата!

Напрыканцы прэм'ер-міністр паскардзіўся, што не мае асабістага жыцця і даўно не бачыў сям'і.

Потым было галасаванне, вынікі якога вядомыя. Шушкевіч цяпер — проста дэпутат, а Кебіч застаўся на сваім месцы /і было б дзіўна, каб вынік быў іншы/.

Прычына паражэння Станіслава Шушкевіча бачыцца мне зусім не ў падкопах Лукашэнкі, не ў раскладзе сіл у авальнай зале Дома ўрада, а ў нежыццяздольнасці самой ідэі, на якую рабіў Шушкевіч стаўку. Наўрад ці можа быць згода паміж тымі, хто дзяржаву здае, і тымі, хто дзяржаву бароніць.

Да пэўнага часу камуністы яго цярпелі, бо ён са сваёй прафесарскай знешнасцю, беларускай мовай і «згодай» быў жывым увасабленнем тэзіса «дэмакраты прыйшлі да ўлады». А калі дэмакраты пры ўладзе, дык чаго ж мець прэтэнзіі да камуністаў?

Цяпер жа мясцовыя бальшавікі ўзялі курс на рэстаўрацыю мінулага і «дэмакратычны» антураж ім болей непатрэбны. Шушкевіч на сваёй пасадзе меў магчымасці абараніць парасткі дэмакратыі /нават пры досыць абмежаваных паўнамоцтвах спікера/. Не абараніў, на жаль. Колькі разоў, чытаючы ягоныя інтэрв'ю альбо слухаючы публічныя прамовы напярэдадні чарговай сесіі, многія меркавалі: «Ну вось, будзе сесія — Шушкевіч пакажа, на што ён здольны!» А на сесіі зноў — «згода»...

«Незалежны» дэпутат Лукашэнка на гэтай сесіі выканаў сацыяльны заказ наменклатуры. Ён выглядаў імяніннікам, больш таго — рымскім трыумфатарам. Шмат пра што гаворыць ягоны радасны крык пасля абвяшчэння вынікаў галасавання /калі стала вядома, што ён «зваліў» Шушкевіча/: «Спадары дэпутаты! Віншую вас з заканчэннем палітычных гульняў з боку апазіцыі!» З рабочасялянскай прасталінейнасцю ён выдаў стратэгічную мэту. «Свавольныя» генералы, нават Шушкевіч — толькі прамежкавая мэта, галоўная — пазбавіцца ад апазіцыі.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

ДАВАЙЦЕ ПАРАІМСЯ

АД ДЗЯРЖАЎНАЙ КАМІСІІ ПА ЎДАКЛАДНЕННІ ПРАВАПІСУ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Камісія завяршыла першы этап работы і выносіць на разгляд грамадскасці свае прапановы па зменах у правапісе. Як і трэба было чакаць, найбольш спрэчак і разыходжанняў сярод членаў Камісіі выклікала пытанне аб правапісе мяккага знака: выпрацаваны аж чатыры варыянты яго пашырэння ў пісьме. Паколькі пытанне асабліва важнае, Камісія і прапануе ўсе чатыры ўвазе тых, хто мае намер прыняць удзел у абмеркаванні правапісу. Усе астатнія прапановы аб зменах у правапісе былі прыняты на пасяджэннях Камісіі аднагалосна ці амаль аднагалосна.

Адрасуючыся да грамадскасці, хацелася б нагадаць, што само пытанне аб удакладненні правапісу нашай літаратурнай мовы не надуманае і не кімсьці навязанае, як гэта здаецца, мяркуючы па лістах у Камісію, некаторым шаноўным грамадзянам. Яно ўзнікла таму, што нельга далей пакідаць па-за ўвагай той разнабой у мове друку, радыё і тэлебачання, які выразна абазначыўся і набывае ўсё большыя маштабы. У грамадскай моўнай практыцы ўсталёўваецца свавольства і хаос, што вельмі згубна адбіваецца на агульным узроўні пісьменнасці ў краіне, не кажучы пра тое, што гэта не робіць нам, грамадству і дзяржаве, гонару. Не можа не выклікаць шкадавання, што рэакцыя на палітычную тэндэнцыйнасць рэформы правапісу 1933 года штурхае некаторых грамадзян у другую крайнасць, калі таксама выяўляецца відочная тэндэнцыйнасць, толькі з процілеглым знакам. А трэба ў гэтай справе кіравацца прынцыпамі навуковасці, эстэтычнасці /мілагучнасці/, павагі да традыцый, натуральнасці маўлення, даступнасці авалодання і зручнасці карыстання літаратурнай мовай. Іменна гэтым кіравацца ў размове аб правапісе і заклікае Камісія.

Заўвагі і водгукі просім выказаць у друку, а таксама прысылаць у Камісію на адрас: 220016, г. Мінск, вул. К. Маркса, 38, Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Камісія па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны. Тэрмін — да 1 красавіка 1994 г.

ВЫНІКОВЫ ДАКУМЕНТ ДЗЯРЖАЎНАЙ КАМІСІІ ПА ЎДАКЛАДНЕННІ ПРАВАПІСУ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

На абмеркаванне грамадскасці выносяцца наступныя варыянты правапісу змякчальнага мяккага знака.

1а. Пашырыць напісанне змякчальнага мяккага знака і даць наступную фармуліроўку п. 2б §87 «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» /Мн., 1959/:

«Мяккі знак пішацца перад суфіксам *-ск-* у прыметніках і ўласных імёнах, утвораных ад назоўнікаў, якія канчаюцца мяккім *н*: *студзеньскі, чэрвеньскі, ліпеньскі, восеньскі, коньскі, Смаргоньскі* /раён/, *Быценьскі, Блоньскі, Чэрвеньскі, Любаньскі, «Радуньскі»* /калгас/».

Мяккі знак пісаць таксама пасля прыставак, якія канчаюцца на *з*, перад *е, ё, ю, я* і націскным *і*: *зьезд, зьёрзаць, разьюшаны, зьяўляць, зьнець*.

1б. Пашырыць напісанне змякчальнага мяккага знака і даць наступную фармуліроўку п. 2б /87/ «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»:

«Мяккі знак пішацца перад суфіксам *-ск-* у прыметніках і ўлас-

Віншуем!

ЛІМАЎСКІЯ ЛАЎРЭАТЫ 1993 ГОДА

У другі раз «ЛіМ» вызначыў аўтараў сваіх лепшых публікацый. Аб'ектыўным /тайным/ галасаваннем калектыў рэдакцыі назваў лаўрэатамі лімаўскіх прэмій /сродкі сфундавала славутая «Дайнова» / нашых даўніх і актыўных аўтараў:

Васіль ВІТКА — за паэму «Каін» /12 лютага/ і нізку вершаў з кнігі «Апошні аўтограф чорнага дзятла» /6 жніўня/;

Валянцін АКУДОВІЧ — за артыкулы «Літаратура ў краіне Сакрэту» /1 студзеня/ і «Дыялогі з Богам» /6 жніўня/;

Аляксандр СТАНЮТА — за нататкі «Па прыступках «Чорнай лесвіцы» /12 лютага/ і эсэ «Трафейнае кіно» /14 мая/;

Уладзімір СЦЯПАН — за апавяданні «Маёр» /22 студзеня/ і «Лёшка-ліліпут» /26 лістапада/;

Алесь ЧОБАТ — за «Мае сустрэчы з пані Сухоцкай і панам Пазнаньскім /сумнае крэсавяцкае апавяданне/» /18 чэрвеня/ і артыкул «І ўціск, і прымус» /22 кастрычніка/.

ЯШЧЭ ЖЫВЫЯ СВЕДКІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ...

Тая акалічнасць, што ўсе падзеі, як-кольвечы звязаныя з Арміяй Краёвай /АК/, маюць апошнім часам шырокую рэкламу ў сродках масавай інфармацыі Беларусі /напрыклад, з'езд акаўцаў у Гародні альбо тварэнне адпаведнай камісіі пры Саўміне/, выклікае занепакоенасць патрыётаў. У прыватнасці, Беларускага згуртавання вайскоўцаў.

У заяве Выканаўчай рады БЗВ адзначаецца, што Згуртаванне з пашанай ставіцца да тых, хто на тэрыторыі Польшчы змагаўся за вызваленне Польшчы ад фашыстаў, але мае зусім іншае стаўленне да тых «жолнераў АК», якія на тэрыторыі Беларусі змагаліся супраць беларусаў і беларушчыны.

«Уважаючы Беларусь за «крэсы всходне», акаўцы праводзілі адпаведную палітыку сілавымі сродкамі. Асабліва на Гарадзеншчыне іх дзейнасць характарызуецца выключна як генацыд супроць усяго свядомага беларускага. Іх галоўным ворагам быў любы свядомы беларус. Яшчэ жывыя сведкі іх злачынстваў і дзеці іх ахвяр.

Таму маўкліва-адабральнае, а часам і спрыяльнае стаўленне ўлад, а таксама агучванне «добрых» памкненняў акаўцаў сродкамі масавай інфармацыі з'яўляецца абразай для нашага народа, — апаганьваннем памяці ахвяр барацьбы за вызваленне Беларусі. У звязку з гэтым узнікае пытанне, як гэта стасуецца з будучым святкаваннем 50-годдзя вызвалення Рэспублікі».

Міжвольна ўзнікае думка, — канстатуецца далей, — што нехта ці не наўмысна спрабуе прышчапіць на нашай зямлі польскі, маскоўскі ці «яцьвяжскі» патрыятызм, — абы не беларускі!

Н.К.

ХРОСНЫ БАЦЬКА АНТОНА ЛУЦКЕВІЧА

Надыходзіць 110-годдзе з дня нараджэння Антона Луцкевіча. З увагі на вялікі юбілей аднаго з «нашаніўцаў» адважваюся часткова парушыць «няпісаны закон», якога прытрымліваецца рэдакцыйная калегія гісторыка-літаратурнага альманаха «Шляхам гадоў»: друкаваць на сваіх старонках матэрыялы арыгінальныя, невядомыя. Правам укладальніка чарговага, 4-га выпуска альманаха, дзе будзе апублікавана маё невялікае эсэ «Луцкевічы», я наважыўся пазнаёміць беларускага чытача з урыўкам, які лічу прынцыповым.

...Другім шлюбам Іван Баляслаў Луцкевіч пажыў таксама нядоўга, але і нямала — 15 гадкоў. За той час ён прыдбаў яшчэ трох сыноў і дачку. Першынца Яна Германа назвалі ці не ў гонар бацькі; нарадзіўся ён 28 мая 1881 года ў мястэчку Шаўлях (цяпер Шауляй у Летуве). За ім услед прыйшоў брат Антон, названы хіба ў гонар прадзеда, Антона Лычкоўскага. Таксама ў Шаўлях нарадзілася 3 лютага 1886 года дачка Эмілія. Апошні сын, Стафан, прыйшоў на свет ужо ў Лібаве, 30 жніўня 1889 года. Гэта ён, «урач Сцяпан Іванавіч Луцкевіч... першым прыбег на дапамогу акрываўленаму Купалу, калі той, даведзены да адчаю, у роспачы замахнуўся на ўласнае жыццё» (Каханоўскі Г. А сэрца ўсё імкне да бацькаўскага краю. Мн., 1991. С. 39).

Паколькі размова зараз пойдзе пра ўдакладненне адной даты, мушу прывесці «Метрическую выпись из крестоприводной книги Шавельского римско-католического приходского костела. №64». Вось яе тэкст амаль цалкам.

«1884 года февраля 19 дня в Шавельском приходском римско-католическом костеле настоятелем ксендзом Томкевичем окрещен младенец именем Антон со всеми обрядами таинства. Дворян: отставного капитана Ивана Болеслава и Софии урожденной Лычковска Луцкевичей законных супругов сын родившийся 1884 года января 17 дня в городе Шавли».

Фактычная недатыкальнасць і звязаная з ёю непажаданасць вывучаць біяграфію апосталаў нашаніўскага адраджэння прывяло да таго, што ў энцыклапедычных даведніках нельга разабраць, паводле якога стылю вызначаліся дні нараджэння братоў. Даследчык Анатоль Сідарэвіч відавочна пайшоў услед за айчыннымі энцыклапедыямі, падаючы ў сваім грунтоўным нарысе пра Антона Луцкевіча наступнае: «Здесь у него родились два сына: Иван (28 мая 1881 года) и Антон (30 января 1884 года)» (Сидоревич А. Антон Луцкевич: Главы из книги. «Неман». 1990. №7. С. 92).

Аднак даруйце: Ян Герман сапраўды нарадзіўся 28 мая, гэта значыць, паводле новага стылю, 9 чэрвеня. Дзень нараджэння Антона — 17+12=**29 студзеня.**

— Тыповая памылка многіх даследчыкаў, — канстатаваў Генадзь Кісялёў, да якога я звярнуўся па кансультацыю. — Забываюць, што «плюс 13 дзён» — лічба для вылічэння новага стылю ў XX стагоддзі. Для XIX стагоддзя розніца складае 12 дзён, для XVIII стагоддзя — адпаведна адзінаццаць.

Тэкст адшуканых у ЦДГА Беларусі метрык Яна і Антона паўнейшы за ўсе іншыя аналагічныя дакументы. У тым я пераканаўся, калі біёграф Антона Луцкевіча, згаданы ўжо Анатоль Сідарэвіч, не мог адказаць на запытанне: а хто быў за хроснага бацьку ў Антона? Мінскія дакументы сведчаць: пры нараджэнні другога сына ў Івана і Эміліі Луцкевічаў «восприемниками были дворяне: Вацлав Лычковский с Виргиниею Сковзгирд, девицею». (арк.7).

Такім чынам, у багдановічазнаўстве з'явілася цікавая дэталь: улетку 1911 года Антон Луцкевіч вёз з Вільні Максіма Багдановіча на вёску не проста да дзядзькі-бабыля, а да свайго хроснага бацькі.

Язэп ЯНУШКЕВІЧ

ных імёнах, утвораных ад назоўнікаў, якія канчаюцца мяккім *н*: *студзеньскі, чэрвеньскі, ліпеньскі, восеньскі, коньскі, астраханьскі, Смаргоньскі, Быценьскі, Блоньскі, Чэрвеньскі, Любаньскі, «Радуньскі»* /калгас/».

П. 3. §86 даць у наступнай фармуліроўцы:

«Мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных *з, с, ц, дз* перад наступным мяккім зычным: *сьнег, сьнедаць, прозьвішча, барацьбіт, зьвінець, радасьць, сьціхаць, лазьня, зьмена, зьлезьці, цьвік, цьвісьці, цьмяны, дзьверы, дзьве, будзьце, шэсьць, штосьці, ледзьве, пісьменьнік, васьмі, усьміхацца, паўзьверх, паўзьмены, зьява, зьёрзаць, разьезд.*

Аднак мяккі знак не пішацца:

пасля зычных перад мяккімі *к, г, х*: *скінуць, скіраваць, скірда, маскіроўка, раскідаць, раскілзаць, згіб, разгінаць, разгерметызаваць, схіліць, схіліцца, расхінуць*, а таксама ў словах перад *г, к, х* — пасля цвёрдых зычных: *брызгі, польскі*;

у канцы прыназоўнікаў, якія канчаюцца на *з*, перад мяккімі зычнымі: *без мяне, без людзей, паўз лес, паўз лінію, з некім, з лесу, з ёй /юй/, з імі /імі/*;

паміж літарамі, якімі перадаецца падаўжэнне зычных, а таксама паміж прыставачнымі і карэннымі *с, з*: *насенне, заданне, ралля, галлё, палоззе, калоссе, ліццё, суддзя; ссекчы, ссінець, ссесьціся, рассяліць, бяссільны, бяссмерце, бяссьледны, бяссьнежны, ззелянець, беззямельны, беззьмястоўны, бяззьменны*; не пішацца мяккі знак пасля *з* у словах *ззяць, ззянне*.

1в. Абазначаць у межах слова памякчэнне зычных з, *с, дз, ц* мяккім знакам перад мяккімі зычнымі /акрамя *г, к, х*/ і ётавымі галоснымі: *зьвер, лазьня, прозьвішча, сьнег, сьпяваць, у масьле, радасьць, дзьверы, цьвік, зьехаць, зьява, разьюшыцца, зьёрзаць.*

Мяккі знак пісаць таксама пры абазначэнні мяккіх падоўжаных /падвойных/ зычных: *ральля, пытаньне, палозьзе, Палесьсе, свацьця*. Падоўжанае /падвойнае/ *дз* перадаваць праз *ддз: суддзя, разводдзе, аддзел.*

1г. Увесці наступнае правіла:

Пісаць мяккі знак для абазначэння мяккіх зычных *з, с, ц, дз* перад наступным мяккім: *сьнег, прозьвішча, радасьць, лазьня, цьвік, дзьверы, будзьце, шэсьцьдзесят, штосьці, ледзьве, пісьменнік, васьмю, авоські, паўзьверх, паўзьмены, бязьмежны, зьверху, бесьперапынна, расьпісацца, бесьперсьпектыўнасьць, бязьзьменнасьць;*

пісаць мяккі знак перад суфіксам *-ск-* у прыметніках, утвораных ад назоўнікаў, якія заканчваюцца мяккім *н*: *коньскі, восеньскі, астраханьскі, Любаньскі* /раён/, *чэрвеньскі, ліпеньскі, жніўеньскі, сьнежаньскі, студзеньскі;*

мяккі знак пісаць таксама пасля прыставак, якія канчаюцца на *з*, перад *е, ё, ю, я* і націскным *і*: *зьезд, зьёрзаць, разьюшаны, зьялчэць, зьнець.*

Мяккі знак не пішацца:

перад мяккімі *г, к, х*: *скінуць, згінуць, схіліцца;*

пасля прыназоўнікаў, якія канчаюцца на *з*: *цераз пень, паўз лес, без мяне, з яго, праз сьнег;*

паміж падоўжанымі зычнымі: *зелле, насенне, куцця, ралля, калоссе, разводдзе.*

2. Падпарадкаваць агульнаму правілу правапісу *е, я* ў першым складзе перад націскам напісанне слоў *дзевяты, дзесяты, семнаццаць, васемнаццаць* і аднакарэнных з імі і пісаць *дзявяты, дзявятка, дзявяцера, дзясяты, дзясятнік, дзясяцера, сямнаццаць, васямнаццаць, васямнаццаты* і т. д.

Згодна з гэтым правілам пісаць злучальны галосны *е* або *я* ў складаных словах: *вогняўстойлівы, земляўласнік, заходнярускі, зерняўлоўнік, зернясховішча, зернесушылка, своеасаблівы.*

3. Канцавыя спалучэнні асновы *-эр, -эл* /*ь*/ іншамоўных слоў перадаваць у ненаціскным становішчы праз *-ар, -ал* /*ь*/: *ваўчар, ордар, містар, камп'ютар, карцар, світар, шніцаль, шпіндаль, міталь, шпаталь, форталь, Картар, Геншар, Гендаль, Карал.*

4. Напісанне пачатковага ненаціскнога *у* ў запазычаных словах падпарадкаваць агульнаму правілу правапісу *у, ў*: *студэнтам нашага ўніверсітэта, правесці ўніфікацыю, вучнеўская ўніформа, належаў да ўніяцкага веравызнання.*

5. На канцы запазычаных слоў пісаць *іё, ые*, а не *ю, ыа*: *трыё, радыё, рацыё, сальфеджыё, Антоніё, Сільвіё, Рыё-дэ-Жанейра.*

6. Кожную састаўную частку складанаскарочаных слоў пісаць так, як яна пішацца ў адпаведным поўным слове: *гарсавет, сельмаг, прафсаюз, сацпартыя.*

У апошняй частцы некаторых складанаскарочаных слоў можа аднаўляцца этымалагічнае *о*, і тады дапускаецца іх дваякае напісанне: *выканкам* і *выканком, селькар* і *селькор, спецкар* і *спецкор, аграпрам* і *аграпром.*

7. Дапускаецца перадача ўзмацняльнай часціцы і злучніка *і* літарай *й*, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *яна і пытаецца — яна й пытаецца; ды і дадому прыходзіць позна — ды й дадому прыходзіць позна; будзе свята і на нашай вуліцы — будзе свята й на нашай вуліцы; бацька і сын — бацька й сын.*

8. У прыметніках, утвораных ад назоўнікаў іншамоўнага паходжання, у злучэнні *ст* перад суфіксам *-н-* адпаведна літаратурнаму вымаўленню *т* на пісьме не перадаваць: *баласт — баласны, фарпост — фарпосны, аванпост — аванпосны, кампост — кампосны, кантраст — кантрасны.*

9. Ва ўсіх выпадках у прыметніках, у якіх канцавы зычны асновы *к* спалучаецца з суфіксальным *с*, спалучэнне *-кс-* перадаваць праз *ц*: *узбецкі, таджыцкі, каракалпацкі, калмыцкі, гіляцкі.*

10. Спалучэнне *сч*, якое паходзіць з *ск*, перадаваць праз *шч* у словах *пяшчаны, пяшчанік, пяшчанікавы, пяшчанка, пяшчынка, пяшчана, брушчатка, брушчатнік, брушчаты* згодна з літаратурным вымаўленнем.

11. Асабовыя ўласныя імёны пісаць згодна з нацыянальнай традыцыяй, улічваючы пажаданні бацькоў і носьбітаў.

Побач з напісаннямі *Ілля, Ілліч, Ілліноўка, Ульяна, Ульянаўскі, Кассян* дапускаецца напісанне *Ілья, Ільіч, Ільінаўка, Ульяна, Ульянаўскі, Касьян.*

Побач з напісаннямі *Жана, Сюзана* дапускаюцца напісанні *Жанна, Сюзанна*, але толькі *Тацяна.*

12. Правілы пераносу слоў сфармуляваць наступным чынам:

1. З аднаго радка ў другі часткі слоў пераносяцца па складах: *са-рока, га-ла-ва, стра-ва, тэ-атр.*

Але:

а/ адну літару, хоць яна і ўтварае склад, нельга ні пакідаць, ні пераносіць у новы радок: *аса-ка, ава-дзень.* Некаторыя словы нельга наогул разбіваць пераносам: *Азія, асот.*

б/ літары *ў, й, ь*, і *апостраф* нельга адрываць ад папярэдняй літары: *няй-да-ча, слаў-ны, праў-нук, се-наў-бор-ка, вай-ско-вы, няй-на-чай, най-гор-шы, вель-мі, ве-льмі, гуль-ня, гу-льня, кась-ба, ка-сьба, пад'-езд, па-д'езд.*

2. Пры збегу зычных у сярэдзіне слова падзел яго на часткі адвольны: *ся-стра, сяс-тра, сяст-ра; бу-льба, буль-ба; ра-зна-стай-ны, раз-нас-тай-ны; пад-крэ-сліць, па-дкрэс-ліць; спа-ды-спа-ду, спа-дыс-па-ду; мя-сцком, мяс-цком, мясц-ком.*

Нельга разбіваць спалучэнні літар *дж* і *дз*, калі яны абазначаюць адзін гук: *ура-джай, са-джу, ра-дзі-ма, за-дзі-ра.*

Камісія

І ЯК ГОДА ПАДАГУЛЬНЕННЕ...

Па традыцыі ў Доме кнігі ў Мінску працавала выстаўка кніг, сігнальныя экземпляры якіх на працягу снежня паступілі ў Нацыянальную кніжную палату. Адначасова яна стала і свайго роду падагульненнем выдавецкага года. Пра вынікі яго расказаў першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь С. Нічыпаровіч.

У гэты ж дзень адбыліся і дзве прэзентацыі новых кніг. Даследаванне М. Нікалаева «Палата кніжпісная», што пабачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура», прадставіў галоўны рэдактар гэтага выдавецтва М. Кусянкоў. А кандыдат філалагічных навук І. Івашкін пазнаёміў прысутных з першым томам «Лексічнага атласа народных гаворак», выпушчанага выдавецтвам «Навука і тэхніка».

Цікавасць выклікалі і такія кнігі, як «Усё чалавечае» У. Калесніка /«Мастацкая літаратура»/, «Зачараваныя смерцю» С. Алексіевіч /«Беларусь»/, «Жальба жытняга коласа» Я. Пархуты /«Полымя»/ і іншыя. І, безумоўна, многія з нецярпеннем пыталіся, калі ж нарэшце з'явіцца ў кнігарнях першы выпуск факсімільнага выдання «Нашай Нівы», які быў таксама прадстаўлены ў экспазіцыі.

ВАМ ХОЧАЦЦА...

усё ведаць пра самыя інтымныя чалавечыя ўзаемаадносіны? У такім разе паспяшайцеся набыць энцыклапедычны даведнік «Сексалогія», які выпусціла выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі. Гэта ўнікальнае выданне, аналагаў якому няма не толькі на Беларусі, але і ў краінах Садружнасці. Дарэчы, у якасці аўтараў і кансультантаў яго выступілі спецыялісты многіх вядучых навуковых цэнтраў колішняга Савецкага Саюза. Каля 600 артыкулаў, што ўвайшлі ў даведнік, дазволяць даведацца ўсе пра «гэта». Наклад «Сексалогіі» — 80 тысяч адпаведнікаў. Попыт? А каму не хочацца мець патрэбную кнігу, як кажуць, пад рукой?

...І НАРАДЗІЎСЯ ЦЫКЛ «ЭМІГРАНТЫ»

Вольга Іпатава была госцем чытачоў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Прысутныя мелі магчымасць нямала даведацца не толькі пра паэтычную і празаічную працу слыннай пісьменніцы, а і газету «Культура», галоўным рэдактарам якой з'яўляецца В. Іпатава, а таксама пра яе паездку ў Злучаныя Штаты Амерыкі, пасля якой разам з рэжысёрам тэлебачання Валерыяй Скварцовай была падрыхтавана серыя перадач, што паказваліся па Нацыянальным тэлебачанні. А яшчэ, як прызналася на сустрэчы Вольга Міхайлаўна, вынікамі паездкі стаў яе паэтычны цыкл «Эмігранты».

ЛЮТАЎСКАЯ АФІША ДОМА ЛІТАРАТАРА

1 лютага адзначаюцца 110-я ўгодкі з дня нараджэння А. Луцкевіча.

Юбілейны вечар Бялыніцкага народнага тэатра юнага гледача пройдзе 4 лютага. Будзе паказаны спектакль па п'есе А. Петрашкевіча «Дагарэла свечачка...» /рэжысёр-пастаноўшчык В. Ермаловіч/.

Валянціну Таўлаю было б 80... З гэтай нагоды прыхільнікі таленту паэта збяруцца 8 лютага на вечарыну «І ў вусны маладосць сваю пацалаваў на развітанне...»

На 16 лютага запланаваны вечар «За чужие грехи искупаю вину», прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння пісьменніка Р. Кобеца.

18 лютага А. Гарадзіцкі пазнаёміць з быліцамі і небыліцамі пра пісьменнікаў.

Прэм'ера кнігі паэзіі М. Башлыкова «Дні мае залатыя» адбудзецца 24 лютага.

Пачатак згаданых мерапрыемстваў у 18 гадзін 30 мінут. А вось тыя з іх, што пачнуцца а 15-й гадзіне: секцыя прозы збіраецца 10 лютага, паэзіі — 16 лютага, перакладу — 24 лютага.

НАШ КАЛЯНДАР

3 дня нараджэння Івана КУЗНЯЦОВА, заслужанага дзеяча мастацтваў рэспублікі, кампазітара, — 75 гадоў. Пісаў кантаты /найбольш вядомая — «Палі стэпавыя»/, п'есы для аркестра беларускіх народных інструментаў, камерныя і харавыя творы, займаўся апрацоўкамі народных мелодый. На грамадскіх асновах кіраваў калектывамі мастацкай самадзейнасці, кансультаваў кампазітараў-аматараў.

Адзначаецца 80-годдзе кампазітара Рыгора АНЧЫКАВА. Шмат гадоў яго творчая дзейнасць была звязана са службай ва Узброеных Сілах. Ім напісаны шэраг камерна-інструментальных, вакальных, харавых твораў.

Меркаванне

АДНОСНА РАСІІ — БЕЗ ІЛЮЗІЙ!

Распад імперый — з'ява абсалютна заканамерная; і сусветная гісторыя пераканаўча сцвярджае, што пагібеллю закончылі існаванне нават тыя з іх, якія сучаснікам здаваліся вечнымі і несакрушальнымі. Той жа сусветны вопыт сведчыць, што гэты працэс з'яўляецца і незваротным — не адзначана ніводнага прыкладу рэстаўрацыі прыгнятаючага дзяржавы. Абяскроўленыя працяглым ненатуральным напружаннем сіл для ўтрымання ў ярме скароных народаў былыя метраполіі на многія стагоддзі застываюць у бяссільным здранцвенні на задворках свету, які пайшоў наперад. За ўсё непазбежна трэба плаціць, а за такую пачварную асалоду, як асалода ад прыніжэння іншых народаў — тым болей.

Разам з тым з'яўляецца заканамерным і цяжкае, хваравітае расстанне плебса метраполіі з маніяй велічы. У сваім адчаі паранены звер сіліцца аднавіць статус-кво, прымяняючы пры гэтым ці то да жорсткай вайны, якая суправаджаецца генацыдам мірнага насельніцтва, як у Югаславіі; ці то да яшчэ больш бесчалавечнай вайны, звязанай да таго з незвычайным вераломствам і цынізмам, як у Грузіі; ці то да свядомага распальвання ўнутраных канфліктаў, як у Таджыкістане, і г. д. Або да эканамічнага рабавання, якое вядзе да поўнага абяскроўлівання краіны, як, напрыклад, у Беларусі.

Маштабы прыгаданага грабяжу такія, што яго не вытрымае ніякая краіна нават з самай развітой эканомікай або якая мае незлічоныя запасы рэзерваў, як краіны Персідскага заліва разам узятыя.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў забіралася 40 % грамадскага прадукту Беларусі, іншымі словамі, забіралася палова з таго, што магло быць назапашана на нашай зямлі, і ўдвая зніжаўся ўзровень спажывання. За кошт адабранага ў беларусаў будаваліся жыллёвы фонд і гарадская інфраструктура ў Маскве і Ленінградзе, заводы і чыгункі на Урале і ў Сібіры, касмадромы, ракеты, падводныя лодкі і атамныя бомбы, утрымліваўся велізарны дыпкорпус за мяжой і многае іншае — патрэбнае імперыі, але зусім непатрэбнае нам.

Пры раздзеле створанага сумеснай працай усіх народаў былога Саюза нацыянальнага багацця Расія пакінула сабе ўвесь патэнцыял каштоўных металаў і алмазнага фонду, незлічоную колькасць маёмасці за мяжой, гандлёвы і ваенны флот, непадзельную маёмасць агульнага карыстання.

І ў цяперашні час Беларусь застаецца крыніцай даходу для Расіі. Адзін толькі неэквівалентны абмен дае Расіі вялікую перавагу за кошт продажу энерганосьбітаў па сусветных цэнах і закупкі вырабаў беларускай прамысловасці проста па «бросовых». Вядома, што за адзін трактар, які прадаецца ў Расію, можна атрымаць 70 тон нафты, а за той жа трактар, куплены Кітаем, — 120 тон. За тону калійных угнаенняў на сусветным рынку можна купіць тры тоны нафты, Расія ж дае толькі тону. І гэта далёка не адзінкавыя прыклады. Тое ж можна сказаць і пра тэлевізары, халадзільнікі, газавыя пліты, матацыклы, аўтамабілі, абаронную прадукцыю і харчовыя прадукты.

У шэрагу выпадкаў Расія можа дазволіць сабе проста нічога не плаціць, як гэта было, напрыклад, у сярэдзіне мінулага года, калі яна адмовілася заплаціць 100 млрд. руб. за ўжо пастаўленую ў першай палове года прадукцыю. Тады гэта адпавядала прыкладна 300 млн. долараў. І што самае дзіўнае, уладамі Беларусі ўсё гэта было ўспрынята да самапрыніжэння пакорліва, і нават Багданкевіч публічна заявіў, што падымаць пытанне бэссэнсоўна — Расія нічога не будзе плаціць.

У такой сітуацыі эканамічна больш мэтазгодна закрываць вытворчасць, але пры гэтым плаціць рабочым заработную плату. І гэта будзе выгадней, чым закупляць вельмі дорага сыравіну і паліва, затрачваць намаганні людзей і амартызаваць абсталяванне, забруджваць навакольнае асяроддзе і загружаць інфраструктуру дзеля таго, каб за бясцэнак альбо бясплатна аддаць гатовую прадукцыю суседу.

Вядома, што Расія нічога не плаціць за вялізную плынь транзіту грузаў і людзей праз нашу тэрыторыю, што спрыяе зносу транспартных магістраляў і забруджванню знешняга асяроддзя. Ва ўсім цывілізаваным свеце гэта аплачваецца досыць дорага. У якасці апраўдання гаворыцца, што гэта ўраўнаважваецца транзітам праз Расію гандлю Беларусі з Сярэдняй Азіяй. Але ж гэта несур'ёзна, бо плыні гэтыя адрозніваюцца ў дзесяткі разоў.

Акрамя таго, усходні сусед не лічыць патрэбным плаціць за арэнду тэрыторыі пад мноствам размешчаных на Беларусі расійскіх ваенных баз. Больш таго, аказваецца, што Беларускі нацыянальны банк выдае зарплату гэтым вайскоўцам.

Расія карыстаецца паслугамі беларускіх прадпрыемстваў ваеннапрамысловага комплексу, што дае ёй магчымасць выйграць час і канверсаваць свае заводы, пакідаючы беларускі ВПК заложнікам сваіх інтарэсаў і капрызаў і асуджаючы яго на безнадзейную адсталасць у будучым. Да таго ж гэта дазваляе ёй пазбягаць велізарных дадатковых страт валюты і іншых сродкаў на папаўненне манапольнай камплектуючай прадукцыі нашай абароннай галіны.

Падводзячы рысу пад далёка няпоўнай карцінай, можна пэўна сцвярджаць, што менавіта Расіі будзе вельмі цяжка без Беларусі і іншых краін СНД, а не наадварот, як любяць паўтараць імперскія рэваншысты.

Зусім не вытрымлівае крытыкі вынайдзены нядаўна і, дарэчы, нічым не пацверджаны тэзіс аб тым, што Беларусь нібыта ў стане самастойна вырабіць толькі 4 % сваёй прадукцыі, у той час як Расія — 60 %, Казахстан — 27 % і г. д. Па-першае, гэта ёсць паказчык нічога іншага, як албанізацыі эканомікі, г. зн. поўнай самаізаляцыі, што з'яўляецца вынікам самых жорсткіх умоў і непрыязі з боку сусветнай супольнасці. Гэта прымальна для крэпасці ў аблозе, а не для эканомікі XX стагоддзя. Па-другое, калі прытрымлівацца логікі аўтараў гэтай ідэі, то давядзецца да ліку самых безнадзейна бедных краін аднесці Японію, Паўднёвую Карэю, Тайвань, Швейцарыю і амаль усю Еўропу, паколькі яны практычна ўсю сыравіну ўвозяць, у многіх з іх нават свайго пяску для будаўніцтва няма, і гэты самы паказчык у іх роўны нулю альбо каля таго. Па-трэцяе, самай развітой краіне Еўропы давядзецца лічыць Румынію, паколькі ў яе адной на кантыненце да нядаўняга часу былі нафта і вугаль і шмат чаго іншага. Зразумела, кім, дзе, для якой мэты і дзеля каго выдумана гэтая лухта. І прыкра, калі яе перад камерай з апломбам паўтарае сам Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Маскве. Бедная мая радзіма!..

Цікава даведацца, што план размяшчэння на тэрыторыі Беларусі выводзімых з замежжа рускіх войск выкананы на пачатак 1993 г. на 144 %, у той час як у самой Расіі — на 12 %. Больш за тое, адначасова з гэтым пагалоўна адорваўся беларускім грамадзянствам камсастаў з сем'ямі расійскай танкавай дывізіі з Дрэздэна ў той час, як безнадзейна чакаюць свайго вяртання на радзіму дзесяткі тысяч афіцэраў-беларусаў самых розных званняў і вайсковых спецыяльнасцей. Іх колькасці дастаткова, каб сфарміраваць армію, роўную бундэсверу, а ў беларускім войску ўдзельная вага камсаставу беларускага паходжання па-ранейшаму роўная 24 %.

Расія спяшаецца, вельмі спяшаецца загнаць назад у стойла свае былыя калоніі, бо час працуе супраць яе. Па-першае, літаральна праз некалькі гадоў ёй давядзецца самой імпартаваць нафту. І гэтага ж часу экс-калоніям хопіць, каб рэканструяваць уласную эканоміку і зрабіць яе больш устойлівай і рознабакова арыентаванай. Выключэнне фактару нафты робіць метраполію зусім бяссільнай, бо Расія ні гістарычна, ні нават генетычна не прыстасавана да жыцця ва ўмовах сучаснага спосабу вытворчасці. Структура яе грамадства заўсёды была адназначнай — паны і рабы, сярэдняга класа — сутнасці капіталізму — не было ніколі. Рабы здольныя пабудаваць піраміды, Беламорканал, здабываць золата на Калыме, валіць лес у Сібіры, але ніколі не створаць свабоднага і забяспечанага грамадства ўзору канца XX стагоддзя.

Прыклад Прыбалтыкі пераканаўча сведчыць, што эфектыўнай стабілізацыі эканомікі можна дамагчыся шляхам рашучага адмежавання ад Расіі і пазбаўлення яе такім чынам уплыву на народную гаспадарку і палітычнае жыццё краіны. Мы маем традыцыі еўрапейскага цывілізаванага стаўлення да працы, і калі здольна стабільна існаваць у сем разоў меншая Эстонія, у 4 разы — Латвія, у 3 разы — Жамойць /Летува/ пры значна большай долі ў структуры насельніцтва краіны дэстабілізуючых элементаў у выглядзе рускамоўнага насельніцтва /да паловы ў Латвіі і Эстоніі/, то Беларусі і сам Бог наканаваў быць самой сабой у гэтым свеце. Вядома, нельга дапускаць ілюзій у адносінах і да нашай пятай калоны, якая колькасна хоць і меншая, чым у дзяржавах Балтыі /прыкладна 15 % насельніцтва/, але больш агрэсіўная, самаўпэўненая і знаходзіцца непасрэдна ля стырна ўлады, выпусціць якое па сваёй волі ніяк не збіраецца, і ставіцца да беларусаў як да істотаў ніжэйшых за сябе, абарыгенаў. У адрозненне ад прыбалтаў, якія ўсё-такі прымусілі сябе паважаць.

Яўген ЦІШУК

г. Масква

Авохці мне!

ЧАРГОВАЯ ІРОНІЯ ЛЁСУ

Старажытны Полацк ужо колькі гадоў сяброўе з нямецкім горадам Фрыдрыхсхафенам. Аб шчодрасці нямецкіх дабрадзеяў, іх шматлікіх скрынях з шакаладам і іншай матэрыяльнай падтрымкай для палачан ужо ходзяць сапраўдныя легенды. Малодшы брат Полацка Наваполацк гэткіх добрых ды заможных сяброў не мае. Але мець хоча, аб чым почасту ўзнікаюць размовы гараджан з уладамі. Ды пакуль што фартуна не ўсміхнулася новапалачанам.

Работнікі культуры вырашылі праявіць ініцыятыву і пашукаць сяброў калі не ў далёкім, то хаця б у блізкім замежжы. Зразумела, што не з надзеяй на бясплатны шакалад, а проста — без ніякай карыслівасці. Ну, вядомая ж мудрасць: «Не май сто рублёў, а май сто сяброў». Тым больш, што сто рублёў цяпер анічагусенькі нявартыя. Пашукалі, пашукалі і — знайшлі. У Вялікіх Луках. Там нядаўна прайшлі Дні беларускай культуры. Тры дні аўтобусы вазілі з Наваполацка ў Вялікія Лукі ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, мастакоў, музыкантаў, літаратараў. Было тое якраз напярэдадні выбараў у Расіі, і некаторыя ўдзельнікі прывезлі з сабой у якасці сувеніраў плакаты з партрэтам Жырыноўскага на фоне Маскоўскага Крамля. Прыгожыя партрэты, каляровыя. Кажуць, Вялікія Лукі пераважнай большасцю падтрымалі Вольфавіча. Па іроніі лёсу атрымалася так, што беларусы наладзілі культурны адпачынак выбаршчыкам і прыхільнікам гэтага дзеяча. Зноў іронія лёсу?..

І. СТУДЗЕНЬСКАЯ

ВЫ ЧЫЕ, СТАРЫЯ І НЯМОГЛЫЯ?

У ВЁСЦЫ Знаменка, што на Лагойшчыне, ці не самае распаўсюджанае прозвішча — Жалабковіч, хоць сваякоў між тутэйшымі Жалабковічамі не так ужо і многа. Ва ўсякім разе, так мне распавяла мясцовая жыхарка Ганна Пятроўна Жалабковіч, па прафесіі медсястра, а па цяперашнім занятку — сацыяльны работнік раённага аддзела сацзабеспячэння.

Словаспалучэнне — «сацыяльны работнік» у адрозненне ад традыцыйных «медработнік», «педработнік» для вуха майго гучала не вельмі звычна, і за дзень да маёй камандзіроўкі ў Лагойск мяне доўга пасвячала ў тонкасці гэтай адносна новай у рэспубліцы прафесіі вельмі мілая жанчына — галоўны інспектар аддзела па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання пенсіянераў Міністэрства сацзабеспячэння Валянціна Пятроўна Нікалаенка. Паводле яе слоў, зараз на Беларусі 200 тысяч старых адзінокіх людзей. Лічба, якая адразу прымусіла мяне ўнутрана здрыгануцца, бо з усіх нябесных караў, відаць, самая страшная — чалавечае адзіноцтва. Ды яшчэ калі падышла старасць і сілы на выходзе. Да гэтай лічбы Валянціна Пятроўна дадала яшчэ адну, не менш сумную — з тых 200 тысяч адзінокіх 70 тысяч маюць патрэбу ў доглядзе, бо не могуць самі сябе абслужыць. Вось тут на дапамогу ім і павінен прыйсці сацыяльны работнік...

Але вярнуся да свайго нязмушана перапыненага аповяду.

Усю папярэднюю ноч ішоў снег, і калі ў Мінску ён пад адліжным ветрам адразу ператвараўся ў бруднае месіва, дык тут, у Знаменцы, ззяў пад сонцам /рэдкім госцем у сёлетнюю зіму/ першароднай чысцінёй. Ганна Пятроўна вяла нас да адной са сваіх дванаццаці падапечных. Нас — гэта, акрамя мяне, яшчэ кіраўніка сацыяльнай службы райаддзела сацзабеспячэння Р. Саковіч і згаданую прадстаўніцу Міністэрства сацзабеспячэння В. Нікалаенку. Па дарозе Раіса Міхайлаўна расказала, што ў яе працуе 35 сацыяльных работнікаў, якія абслугоўваюць 367 старых адзінокіх людзей, што не могуць абысціся без пабочнай дапамогі.

З вуліцы збочваем па заснежанай сцежцы да невялікай хаціны. Скрозь мутнае аконнае шкло бачу няпэўныя абрысы жаночага твару. Ганна Пятроўна, памахаўшы перад вакном рукой, дастае з-за шалёўкі ключ і ідзе адчыняць дзверы. «Вы замыкаеце яе? — не магу я стрымаць здзіўлення. — А калі, барані Божа, пажар, як яна пры зачыненых дзвярах?» Ганна Пятроўна, сумна ўсміхнуўшыся, тлумачыць: «Гаспадыня хаты, фактычна, без абедзвюх ног — адна ампутавана, другая амаль паралізавана, так што пры любым выпадку самастойна ўстаць з ложка не зможа. А дзе вісіць ключ, ведаюць усе суседзі...»

Праз невялічкія сенцы, дзе ляжала куча брыкету, зайшлі ў хату. На ложку, прысунутым да вакна, пад некалькімі коўдрамі ляжала старая жанчына са спакутаваным маршчыністым тварам. /Потым з некаторым здзіўленнем я даведаюся, што па гадах яна не такая ўжо і старая — крыху больш за шэсцьдзесят. Яе многія гарадскія аднагодкі яшчэ наводзяць марафет і думаюць пра кавалераў/. Агледзеўся. З усёй мэблі, акрамя ложка, у пакоі стаялі невялікі стол пад цыратай і пара лавак. Увагу маю прыцягнулі некалькі казённага выгляду паперчын, прымацаваных да сцяны. Як сведчыў тэкст адной з іх, свінарка калгаса «Сталінскі шлях» Жалабковіч Надзея Пятроўна з'яўлялася ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў 1958 годзе. Побач вісела віцвілая ад часу грамата, якой тая ж Жалабковіч Н. П. узнагароджвалася праўленнем калгаса «Сталінскі шлях» за ўдарную працу.

«Ды вы, Надзея Пятроўна, бачу, былі не апошняй працаўніцай у калгасе», — сказаў я і адчуў, што чырванею за свой штучна бадзёры голас, ды і за само пытанне, якое зараз, у гэтых сценах, гучала не проста недарэчна — кашчунна. Праўда, твар кабеты ледзь прыкметна ажывіўся, і яна расцяла вусны: «Ведаеце, і ў Маскву мяне пасылалі, і ў Мінск... Праўда, даўно гэта было. Ужо і не памятаю, што я там бачыла...» — «Як вы сябе сёння пачуваеце?» — пытаемся мы. «Як я магу сябе пачуваць, — адказвае жанчына, — калі ўжо шосты год не падымаюся з ложка? Ног няма... І адкуль узяцца таму здароўю, калі я трыццаць гадоў адпрацавала ў свінарніку? Ды як цяжка працавала! Вядома, пры свінях — і накармі, і прыбяры. Тады ж ніякай механізацыі не было — усё рукамі, усё на ўласным гарбе. Возьмеш — кош бульбы, як падняць, і пайшла на раздачу... Увечары ўсё цела ные, быццам адлупцавалі цябе, месца жывога няма. Вось там, відаць, і ногі свае я застудзіла. Ведама ж, зімой і летам у гумавых ботах, па калена ў гразі і гнаі. А працавалі ж за нішто...»

З сумнага гэтага аповяду дазналіся мы яшчэ, што вучыцца ёй не давялося, адхадзіла толькі адзін клас — сям'я была шматдзетная, яна старэйшая, так што трэба было зарабляць на хлеб. За той працай у свінарніку не заўважыла, як сплылі гады, як засталася векавухай. Як я зразумеў, частка радні яе паўмірала, частка некуды з'ехала, а яна, Надзея Пятроўна Жалабковіч, былая ўдарніца калгаса з назваю «Сталінскі шлях», дабрыла па тым шляху да гэтага вузенькага акенца, якое адно звязвае яе зараз з навакольным светам. /Хоць той «навакольны свет», які жанчына бачыць прачынаючыся і адыходзячы да сну, усяго толькі лапік агарода ды суседскі плот/.

Я спытаў у яе, колькі яна зарабіла пенсіі, і пачуўшы, што недзе каля сарака тысяч рублёў, успомніў дэбаты ў Вярхоўным Савеце вакол унесенага ўрадам пытання аб устанаўленні персанальных пенсій /у два-тры разы большых за цяперашнія максімальныя/ асобам, якія маюць «асаблівыя» заслугі перад дзяржавай. Сярод іх — народныя дэпутаты, адказныя работнікі міністэрстваў і ведамстваў, артысты і спартсмены, якія маюць ганаровыя званні, розныя лаўрэаты і чэмпіёны і да т.п. Такіх, як Надзея Паўлаўна Жалабковіч, у тым спісе не будзе. Бо і праўда: якая ў яе магла быць заслуга перад дзяржавай, акрамя той, што яна на яе, дзяржаву, усё жыццё, як катаржанка, укалвала, не зарабіўшы нават на ўласныя хаўтуры, што яе, між іншым, вельмі засмучае, як і 93-гадовую Сцепаніду Данілаўну Жалабковіч, у доме якой мы таксама пабылі. «Гэта ж не сёння-заўтра памру, — казала яна, — і не будзе за што пахаваць. З-за нашай беднасці, паверыце, у хаце няма нават бутэлькі гарэлкі. А ў нас жа звычай — чалавеку, які абмые нябожчыка, абавязкова ставяць бутэльку. Каб выпіў за супакой душы...».

Вось і ўсе мары, што засталіся ў кабет на сконе жыцця.

І ўсё ж я б у нечым салгаў, каб скончыў аповяд пра адзінокіх старых людзей у Знаменцы на такой мінорнай ноце. Свет усё-такі не без добрых людзей. Для мяне прымаўка гэтая знайшла прадметнае ўвасабленне ў асобе той самай Ганны Пятроўны Жалабковіч — мясцовага сацыяльнага работніка /доўга, відаць, мудрагелілі ў Міністэрстве сацзабеспячэння, пакуль «вынайшлі» гэтае няўцямнае словаспалучэнне, хоць, мне здаецца, нічога не трэба было выдумляць, яно ляжыць на паверхні, старое, выпрабаванае паняцце — «сястра міласэрнасці», якое дакладна акрэслівае такой сэнс і напрамак дзейнасці/, якая мае 12 падапечных і паспявае паклапаціцца пра кожнага з іх /дадамо, за чыста сімвалічную аплату, бо 50-60 тысяч сёння — не грошы/, што ў вёсцы зрабіць ой як няпроста. І вады са студні прынясі, і ў печы прапалі, і згатуй, і перасцяліабмый, і ў краму збегай, і да старшыні калгаса схадзі-пакланіся, каб выпісаў бедакам малака, бульбы ці якіх круп.

Вось і тым днём, калі былі мы ў Надзеі Пятроўны, печ у яе хаце была з раніцы напалена, падлога падмецена, посуд вымыты. І што звярнула на сябе ўвагу — не было ў хаце непрыемнага паху /хай не крывіцца каторы гідлівы чытач ад гэтага натуралізму/, уласцівага для памяшкання, дзе жыве прыкаваны да ложка чалавек.

Зараз стала модным ганіць перабудовачныя гады, звязаныя з імем М. Гарбачова: маўляў, адтуль пайшлі ўсе нашыя беды. Не месца тут спрачацца з такімі меркаваннямі, зазначу толькі, што трансфармацыя старога таталітарнага грамадства ў грамадства з чалавечым тварам пачалася менавіта тады. Прыкметам такім, як кажуць, «несть числа». З гэтага рада, думаю, і стварэнне ў рэспубліцы ў другой палове васьмідзесятых службы сацыяльнай дапамогі старым адзінокім і нямоглым людзям.

Сёння на Беларусі дзейнічае 625 аддзяленняў гэтай службы з 4,5 тысячы работнікаў, якія абслугоўваюць больш за 60 тысяч чалавек.

Лічбы гэтыя ўражваюць, але ўсё ж не даюць адказу на пытанне: ці ўсе маючыя патрэбу ў такой дапамозе яе атрымліваюць? Адразу скажам — не, далёка не ўсе. Напрыклад, толькі з пастаўленых на ўлік пенсіянераў і інвалідаў, якія не ў стане самі сябе даглядзець, каля 10 тысяч чалавек /па афіцыйных дадзеных/ пакуль што застаюцца адзін на адзін са сваёю бядою /ёсць у мяне падставы меркаваць, што на самай справе такіх грамадзян значна больш/.

Намеснік міністра сацзабеспячэння Пётр Паўлавіч Сікорскі, з якім мы гутарылі на гэтую тэму, растлумачыў, што асноўная колькасць неахопленых сацыяльнай дапамогай старых людзей прыпадае на сельскую мясцовасць, дзе вельмі цяжка падабраць кадры сацыяльных работнікаў. Па-першае, нізкая зарплата, па-другое, — вясковая спецыфіка. Гэта ў горадзе сеў на транспарт і пад'ехаў да свайго падапечнага. У сельскай мясцовасці да іх, бывае, трэба дабірацца пехатой за некалькі кіламетраў, жывуць старыя па розных вёсках, не ў кожнай ёсць крама.

Усё гэта, як сказаў намеснік міністра, аб'ектыўныя цяжкасці.

Што ж, усе нашы цяжкасці традыцыйна падзяляюцца на аб'ектыўныя і суб'ектыўныя. Лічыцца, што за першыя з іх ніхто адказнасці не нясе. Але стала на душы жахліва ад адной думкі, што нехта, падобны на прыкаваную да ложка Надзею Жалабковіч, жыве /калі гэта можна назваць жыццём/ у поўнай адзіноце, без усякай дапамогі, калі няма каму падаць нават шклянку вады.

ДЫК ХТО ён, сацыяльны работнік? Ідуць на гэтую працу пераважна хатнія гаспадыні, якіх спакушае магчымасць распараджацца сваім часам: не зайшоў, скажам, да свайго падапечнага раніцой — можаш зрабіць гэта ў іншы час. Галоўная ўмова, якая ставіцца перад сацыяльным работнікам, — адведваць «сваіх» старых не радзей двух разоў на тыдзень і выканаць іх даручэнні — прынесці з магазіна прадукты /усе, хто стаіць на сацыяльным абслугоўванні, прымацаваны да сталоў заказаў/, схадзіць, калі трэба, у аптэку, у ашчадны банк /заплаціць за кватэру/, у бібліятэку /памяняць книжку/ і да т.п. У той жа час у яго абавязкі не ўваходзіць, напрыклад, уборка кватэры ці быць сядзелкай пры хворым.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Адна з падапечных работніка сацыяльнай службы Першамайскага раёна сталіцы Т. Кулакоўскай — М. Краскова, васьмідзесяцігадовая інтэлігентная жанчына /былы ўрач/, да якой мы разам завіталі, расказвала, што была пазваніла ў фірму бытавых паслуг «Радуга», каб прыслалі ёй чалавека памыць падлогу, дык яе адразу папярэдзілі, што гэта будзе каштаваць 10 тысяч рублёў /кватэра ў яе — маленечкая аднапакаёўка/. «Хіба я, пенсіянерка, магу сабе дазволіць такія выдаткі?» — абуралася жанчына. І мела рацыю. Заўважу, што гаварыла яна гэта не ў папрок Т. Кулакоўскай, якая прысутнічала пры нашай размове і якой гаспадыня кватэры, па яе словах, вельмі задаволена. Але мыццё падлогі не ўваходзіць у яе абавязкі.

Дарэчы, як расказала кіраўнік сацыяльнай службы Першамайскага раёна г. Мінска В. Шыцько, некаторыя яе работнікі робяць для сваіх падапечных куды больш, чым гэта прадугледжана інструкцыяй.

Васьмідзесяцідвухгадовая пенсіянерка А. Соснер, да якой я прыйшоў разам з яе «апякункай» — маладой сімпатычнай жанчынай А. Блахіной, называла апошнюю не інакш, як дачушка і дарагая Алачка, і па ўсім было відаць, што ў адзінокай пенсіянеркі няма чалавека бліжэй за яе.

І ўсё-такі дазволю сабе заўважыць, што такія Алы /дарэчы, педработнік па адукацыі/ — хутчэй выключэнне з правіла. Часцей чуеш крыўды і скаргі пенсіянераў на няўвагу да сябе, просьбы прысылаць іншага «апекуна». Я далёкі ад думкі вінаваціць у такіх выпадках сацыяльных работнікаў. «Кантынгент», з якім ім даводзіцца мець справу, складаецца з людзей розных па выхаванні, культуры, духоўным складзе і г. д. Але, тым не менш, калі ўспомніш, што людзі гэтыя — старыя і нямоглыя, да таго ж часта трагічнага лёсу, пачынаеш па-іншаму на іх глядзець. У рэшце рэшт, паводле хрысціянскіх запаветаў міласэрнасці нельга пазбаўляць нікога — грэшны ён ці бязгрэшны.

Дарэчы, у нетрах Міністэрства сацыяльнага забеспячэння распрацаваны праект «Прыкладнага палажэння аб раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання». У цэнтрах, якія будуць аказваць састарэлым грамадзянам, інвалідам розныя віды сацыяльных паслуг, прадугледжана мець і дзённыя стацыянары, дзе пенсіянеры змогуць і харчавацца, і лячыцца, і адпачываць. Праўда, як прызнаўся П. Сікорскі, пакуль што гэта — толькі добрыя намеры. Патрэбна на гэтую справу дадатковае фінансаванне, а нашы фінансы пакуль што...

ЦІ ВЕДАЕЦЕ вы, што такое ў натуры дом-інтэрнат для пажылых адзінокіх людзей? Я, напрыклад, ніколі не пераступаў парога такой установы. Не, маню. Шмат гадоў назад, помню, рэдакцыя атрымала ліст ад аднаго з чытачоў, які пісаў, што ў рэспубліканскім інтэрнаце для ветэранаў партыі жыве герой паэмы Янкі Купалы «Над ракою Арэсай» кіраўнік камуны Модзін. Я паехаў у інтэрнат, што раскінуў свае ўладанні ў надзвычай маляўнічым месцы пад Мінскам, знайшоў там Модзіна, ужо цяжкахворага, гутарыў з ім, і расказ аб той сустрэчы быў надрукаваны ў «ЛіМе». Помню, аддаючы даніну ветлівасці, я спытаў майго субяседніка, як яму тут жывецца, і пачуў, што — амаль як пры камунізме. Ва ўсякім разе так ён сабе ўяўляў камунізм, за прыход якога змагаўся, ствараючы камуну на палескіх балотах на пачатку трыццатых. Па ягоных словах, ён тады марыў, што некалі такое жыццё настане для ўсяго працоўнага народа. Пра тое, што яно насталэ не для ўсяго народа, а толькі для кучкі абраных, загартаваны камуніст Модзін прамаўчаў.

Ведаеце, чым мне асабліва запомніўся той інтэрнат для ветэранаў партыі? Вывешанай на сцяне абвесткай аб маючым адбыцца партыйным сходзе, на якім павінны былі слухацца аж дзве персанальныя справы. І тады я зразумеў, што ідэі камунізму непераможныя!

Так, але ж гэта быў элітны дом-інтэрнат з саноўнымі насельнікамі, у якіх на абедзенных сталах не пераводзілася чорная і чырвоная ікра і іншыя дарагія прысмакі. Я ж цяпер збіраўся ехаць у Лагойскі дом-інтэрнат агульнага тыпу для адзінокіх пенсіянераў. Чаму, менавіта, Лагойскі? Ды проста так. От, падумаў, пагляджу перыферыйную багадзельню. Праўда, калі я вымавіў гэтае слова ў прысутнасці В. Нікалаенкі, яна не на жарт на мяне пакрыўдзілася, заўважыўшы, што ў іх сістэме ніякіх багадзельняў няма, а ёсць дамы-інтэрнаты для адзінокіх пенсіянераў. Я змушаны быў апраўдвацца, даводзячы, што нічога благога ў слове багадзельня няма, што багадзельня — гэта месца, дзе ад імя бога робяцца добрыя справы.

Заўсёды цяжка вырвацца з пут стэрэатыпаў і, адпраўляючыся ў камандзіроўку, я жыва маляваў карціны, знаёмыя па геніяльных «Дванаццаці крэслах» І. Ільфа і Я. Пятрова. Помніце старгарадскі сабесаўскі дом для бабулек, што ўразіў Астапа Бендэра сваёй мебліроўкай, якая складалася выключна з садовых лавак, і паўгалодным жыццём яго насельніц?

Мяне чакала прыемнае расчараванне. Нічога блізкага на апісанае сатырыкамі-класікамі ў Лагойскім доме-інтэрнаце я не пабачыў. Без жартаў, ён мне нагадаў добры санаторый. Не было і следу казённасці ў светлых і чыстых, з вазонамі калідорах, у па-сучаснаму мебліраваных холах з тэлевізарамі, ну, а пакоі, дзе па адным і па двое /не болей!/ жылі пансіянеры і пансіянеркі, вабілі выключнай утульнасцю і чысцінёй.

Надзея Іванаўна Сямашка, якая дырэктарствуе тут ужо восем гадоў /як расказваў мне загадчык райсабеса Пётр Мікалаевіч Лукшыц, да яе прыходу дом-інтэрнат ледзь ліпеў/, без стомы вадзіла мяне па сваіх уладаннях, паказаўшы ўрачэбны і зубапратэзны кабінеты, залу, дзе ва ўрачыстай абстаноўцы адзначаюцца дні нараджэння насельнікаў інтэрната і розныя іншыя ўрачыстасці і святы, швейную майстэрню, дзе шыюць інтэрнатаўкам абновы /«Абавязкова па фігуры», — сказала Надзея Іванаўна/. Паказала і жалобную залу, дзе вымаўляюць апошняе «бывай» тым, хто развітаўся з зямной юдоллю і накіраваўся прамой дарогаю на нябёсы. Мяркуючы па тым, што мясцовы кантынгент складаецца пераважна з сельскіх працаўнікоў, якія многа пагаравалі на сваім вяку, усім ім забяспечана месца ў раі.

Соромна прызнацца, але, бадай, першае, пра што я спытаў у дырэктаркі, дык гэта — як харчуюцца яе падапечныя. Заўсёды са скрухай наглядаю ў прадуктовых магазінах, як топчуцца ля прылаўкаў старэнькія дзядулі і бабулі, амаль нічога не купляючы, бо дорага.

Надзея Іванаўна завяла мяне ў час абеду ў абедзенную залу, і я на свае вочы пабачыў, што харчаванне тут на вышыні. Былі ў меню і салат з гародніны, і наварысты суп, і смажананыя сялянскія каўбаскі з гарнірам, і кампот. Дырэктар выдала свой «сакрэт» — пры доме-інтэрнаце ёсць вялікая падсобная гаспадарка з садам, агародам і нават са свінарнікам на сто з нечым галоў.

(Працяг на стар. 12)

З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры адзначыў 90-годдзе з дня нараджэння Піліпа Пестрака. На літаратурную сустрэчу былі запрошаны вучні сярэдніх школ N 6 і 40 г. Мінска, студэнты гуманітарнага універсітэта. Даследчык жыцця і творчасці Піліпа Сямёнавіча К. Хромчанка расказаў пра яго, падарыў музею рукапіс пісьменніка «Аўтабіяграфія Піліпа Пестрака». Была наладжана выстаўка «Жыццё і творчы шлях Піліпа Пестрака».

З. КУЧАР

«БЕЛАРУСКІ ПРАВАСЛАЎНЫ КАЛЯНДАР» НА 1994 ГОД

Напярэдадні Народзін Хрыстовых упершыню ў гісторыі айчыннага кнігавыдавецтва па-беларуску быў выдадзены «Беларускі праваслаўны каляндар на 1994 год». Выданне падрыхтавана Беларускім праваслаўным брацтвам трох віленскіх мучанікаў і разлічана на самы шырокі ўжытак. Найперш, безумоўна, «Каляндар» незамяняльны для людзей царкоўных як шляхаводнік у гадавым літургічным коле. Апрача таго, «Каляндар» здольны зарыентаваць і людзей, якія яшчэ толькі імкнуцца ладзіць сваё жыццё паводле праваслаўнай традыцыі. Менавіта з гэтай мэтаю ў каляндарнай частцы выдання змешчаны шматлікія тлумачэнні да найбольш значных свят і дзён памяці асобных святых. Усё выданне складаецца з трох частак. Першая — непасрэдна праваслаўны каляндар. Другая — праваслаўны катэхізіс. Трэцяя — апісанне беларускіх праваслаўных святыняў. Выданне мае асветніцкую мэту, яно дапаможа чытачам атрымаць асноўныя пачатковыя веды аб праваслаўным веравучэнні, пазнаёміць з жыццяпісамі святых зямлі беларускай, з апісаннямі асобных цудатворных іконаў на Беларусі. З гэтага пункту «Каляндар» будзе вельмі карысным для настаўнікаў, выкладчыкаў, прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі. Паколькі выданне падрыхтавана цалкам па-беларуску, то яно ўяўляе цікавасць з пункту моўна-лексічнага, з пункту распрацоўкі і развіцця беларускай рэлігійнай тэрміналогіі. «Каляндар» аздоблены каляровымі ўклейкамі з выявамі беларускіх святых, а таксама унікальнымі гістарычнымі фотаздымкамі.

ЧАРГОВЫ, ДЗЕВЯТЫ НУМАР

часопіса «Полацак» пазначаны яшчэ мінулым годам. На вокладцы яго — партрэт Н. Арсенневай. 90-годдзю яе прысвечаны і верш М. Кавыля «Паэтэса». У раздзеле «Наша гісторыя» — артыкулы А. Грыцкевіча «Узнікненне феадальных дзяржаў у беларусаў у працэсе ўтварэння дзяржаў у славян», Л. Дучыц — «Варагі ў Беларусі», М. Белемука — «Тапаграфія знаходак манет і аздобаў», Л. Калядзінскага — «Кароль са Слуцку». Увазе чытача прапануюцца «Успаміны Яўгена Ціхановіча» і развагі пра яго творчасць В. Шматава «Ганаровы грамадзянін Дунайвараша», працяг рамана М. Кавыля «З агню ды ў полымя», роздум С. Белай пра творчасць С. Палуяна /«Ты быў, як месяц адзінокі...»/, матэрыялы пра А. Смоліча, іншыя публікацыі. Часопіс смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю С. Карніловіча.

«ПРАЛЕСКА», N 11

У адзінаццатым нумары часопіса /на жаль, запазняецца/ — развагі галоўнага рэдактара А. Сачанкі «У беспрацоўя — жаночы твар», чарговыя старонкі апавяданняў па гісторыі Беларусі «Адкуль наш род» У. Арлова, нарыс А. Марціновіча «Першыя ружы асабліва прыгожыя...» /пра Л. Чарняўскую/, апавяданні В. Зуёнак для дзетак «Боцман» /з іх лёгка зрабіць кніжку «Бібліятэчкі «Пралескі»/, творы Э. Агняцвет, Г. Багданавай, М. Самусенкава /падборка «Вясёлы вулей»/, іншыя матэрыялы.

ЯШЧЭ РАЗ ПРА КОЛАСА

Кніга М. Жыгоцкага «Сэрца пакідаю вам», выпушчаная выдавецтвам «Полымя», дае магчымасць наведаць мясціны, у якіх у свой час бываў народны пясняр Якуб Колас. А ў яго біяграфіі, як вядома, прапісаліся Палессе і Магілёўшчына, Слуцк, у якім ён чытаў лекцыі на настаўніцкіх курсах у пачатку дваццатых гадоў... У гады ж вайны Я. Колас жыў у Ташкенце, наведваўся ў Маскву і Казань. І, вядома ж, ніколі не забываў любую яго сэрцу Мікалаеўшчыну.

Краязнаўчыя нарысы М. Жыгоцкага даюць магчымасць перагарнуць асобныя старонкі жыццяпісу незабыўнага Кастуся Міхайлавіча.

ЁН БЫЎ ПЕСНЯРОМ ПАЛЕСКАЙ ДУШЫ

Адной з негатыўных праяў былога таталітарнага мыслення дасталася нам у спадчыну гэткая юбілейнасць асэнсавання значнасці пісьменніка. І па сённяшні дзень крытыка моцна павязана, як кажуць, па руках і нагах, храналагічным прынцыпам у асвятленні літаратурнага працэсу. Надыходзіць юбілей пісьменніка — яму прысвячаюцца навуковыя артыкулы, часам і цэлыя канферэнцыі. Але праходзяць святы — гасне і тая жывая зацікаўленасць крытыкі да былога суб'екта вывучэння, бо наперадзе, вядома ж, — новыя юбілеі, новыя кнігі. У лепшым выпадку шанцуе тым паэтам, празаікам, драматургам, творчасць якіх уяўляе цікавасць у плане актуальнасці пэўных грамадскіх ці літаратуразнаўчых праблем. Такім чынам паранейшаму застаецца недастаткова запатрабаваным вялікі духоўны патэнцыял, напрацаваны нашай літаратурай за стагоддзі, дзе першасным з'яўляецца шматспектральнае праяўленне беларускай душы ў розных палітычна-сацыяльных сферах зямнога быцця чалавека і сакраментальна-ізатэрычнае, макракасмічнае яе выяўленне. А гэта — надзённае патрабаванне сучаснасці, новага гістарычнага пералому ў лёсе народа, калі інтэлігенцыяй выпрацоўваецца новая, нацыянальная канцэпцыя духоўнага развіцця грамадства.

Іван Мележ якраз і належыць да тых творцаў, хто здолеў у нашай літаратуры найбольш глыбока спасцігнуць духоўную сутнасць народа. Успамінаецца нядаўні папрок крытыка У. Гніламёдава ў «ЛіМе» І. Мележу за яго акрэсленае марксісцка-ленінскае раскрыццё жыцця палешукоў. Варта згадзіцца з тым, што сапраўды мележаўскі Апейка, гэты камуніст з чалавечым тварам, уяўляе сабою ілюзорнае бачанне пісьменнікам вызначальнай ролі камуністаў у нацыянальным пераўтварэнні Палесся. Аднак ілюзія гэта выразна развейваецца ў «Подыху навальніцы» і «Завеі, снежні». Я буду салідарнай з тымі крытыкамі, хто выкажацца за поўны перагляд творчасці І. Мележа. Бясспрэчна адно: Мележ быў, ёсць і яшчэ доўга будзе заставацца лепшым песняром палескай душы. Ні адыёзнасць вобразаў тыпу Башлыкова, ні перавага сацыяльна-палітычных калізій у «Подыху навальніцы» і «Завеі, снежні» усё ж не засланілі «Людзей на балоце». І. Мележ стварыў і непераўзыдзены гімн вечнасці палескай душы, якая — і ў людзях, і ў прыродзе, і ў той непарыўнай лучнасці жывой чалавечай душы з боскім яе праяўленнем у свеце народнага мастацтва, арэоле абраднасці, звычаяў, этнаграфіі і фальклору.

Нарэшце, мележаўская «Палеская хроніка» сваёй выразнай беларускай ментальнасцю заўсёды дасць адпор усякім «шэляговічам» ды ўсім іншым, хто намагаецца прышчапіць Палессе да Украіны ці Расеі.

Мэта гэтай маёй публікацыі — не спроба перагляду творчасці І. Мележа /ён, спадзяюся, наперадзе/, а завастрыць увагу творчай інтэлігенцыі на праблеме ўшанавання імёнаў нашых славутых землякоў. І хоць доўга яшчэ чакаць чарговага юбілею І. Мележа, але яго

Сярод кніг

ДВА ШЭДЭЎРЫ

Трыяда: народная культура — антычнасць — хрысціянства ёсць ядром усяе еўрапейскае цывілізацыі і сарцавінаю кожнае асобнае еўрапейскае культуры. Таму замах на гэтае трыадзінства, зроблены бальшавікамі, адгукнуўся самым непасрэдным чынам і на беларускай культуры: разам са змаганнем супроць народнай культуры, фізічным знішчэннем храмаў і святароў выкаранялася таксама і класічная школа /з выкладаннем грэцкай і лацінскай моў/, рэпрэсаваліся прафесары гімназій і спецыялісты ў галіне антыказнаўства, перакладчыкі.

Пустка, якая запанавала ў галіне мастацкага перакладу са старажытных моў, толькі апошнім часам пакрысе пачала менець. Асабліва радасна, што сярод першых «антычных эдабыткаў» перакладчыкаў — грэцкая трагедыя, найдасканалейшы твор духу вялікіх элінаў, які спарадзіў мноства пазнейшых наследаванняў у літаратуры і мастацтве Новай Еўропы, выклікаў з'яўленне шэрагу філасофскіх і літаратуразнаўчых прац. У кнігу, якая выйшла зусім нядаўна ў выдавецтве Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра /серыя «Школьная бібліятэка»/, уключаны два шэдэўры грэцкае драматургіі: «Прыкуты Праметэй» Эсхіла і «Антыгона» Сафокла. Першы твор увасоблены па-беларуску Лявонам Баршчэўскім, перакладчыкам, які ўжо вядомы нашаму чытачу цудоўнымі перакладамі з нямецкай, французскай, лацінскай ды іншых моў. «Прыкуты Праметэй» — гэта першы пасля 1926 г. пераклад трагедыі на беларускую мову. Звяртае на сябе ўвагу мілагучная і суладная мова, вытрыманасць рытмічнай будовы, адэкватнасць перадачы вобразнай структуры, метафорыкі твора. Пэўная непаслядоўнасць у транслітэрацыі грэцкіх уласных імён тлумачыцца нявыпрацаванасцю дагэтуль прынцыпаў іх перадачы на беларускую мову.

Другая трагедыя — «Антыгона» — гэта перадрук у новай рэдакцыі таго ж Лявона Баршчэўскага перакладу, зробленага знаўцам антычных моў і літаратуры Юльянам Дрэйзіным і надрукаванага ў 1926 г. у Менску. Юльян

ЛЕКСІЧНЫ АТЛАС БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ГАВОРАК

Важнейшым кірункам навукова-даследчай работы ў галіне моў і дыялектаў з'яўляецца ў цяперашні час лінгвістычная геаграфія. У выніку фундаментальных лінгвагеаграфічных работ у розных краінах, асабліва ў Еўропе, створаны і працягваюць ствараццa разнастайныя лінгвістычныя атласы асобных моў, групаў моў і моў цэлых кантынентаў.

У пасляваенныя гады ў Беларусі таксама былі разгорнуты лінгвагеаграфічныя даследаванні.

У пачатку 70-х гадоў была распрацавана праграма па лінгвагеаграфічным вывучэнні лексікі беларускіх гаворак. На аснове 20-гадовых даследаванняў падрыхтавана фундаментальная лінгвагеаграфічная праца — «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» у 5 тамах. Гэта даследаванне разам з «Дыялекталагічным атласам беларускай мовы», які быў выдадзены ў 1963 г., складае комплекс буйнейшых лінгвагеаграфічных прац па беларускіх гаворках і дыялектах.

«Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» змяшчае каля 2000 лінгвістычных картаў, на якіх раскрываецца ўзаемнае распаўсюджанне ў межах Беларусі больш 200 тысяч слоў, якія ўласцівы беларускім народным гаворкам. Матэрыялам для выдання з'явіліся каля 4000 найменняў прадметаў, прыкмет, працэсаў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Усяго абследавана каля 150 населеных пунктаў, з іх 29 пунктаў знаходзяцца ў зоне, якая пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Лінгвістычныя карты сістэматызаваны ў тамы тэматычна. Першы том —раслінны і жывёльны свет, другі — сельская гаспадарка, трэці — чалавек, чацвёрты — побыт, пяты том — семантыка, словаўтварэнне і націск.

Разам з лінгвістычнымі картамі ў кожным томе пададзены матэрыял, на аснове якога складзены карты, а таксама каментарыі да іх. Матэрыял, які ўключаны ў атлас, раней не картаграфаваўся /за рэдкімі выключэннямі/.

Створаны атлас з'яўляецца унікальным навуковым адлюстраваннем лексікі беларускіх гаворак у яе прасторавым размеркаванні ў 70-я гады цяперашняга стагоддзя. Паўтарэнне падобнай працы немагчыма перш за ўсё ў сувязі з перасяленнем жыхароў са значнай часткі тэрыторыі Беларусі, якое выклікана аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.

«Лексічны атлас беларускіх народных гаворак» — не толькі фундаментальная лінгвістычная навуковая праца, якая мае значэнне для рашэння пытанняў беларускай мовы і славянскага мовазнаўства, гісторыі, этнаграфіі, але і каштоўнейшы скарб беларускай куль-

КРЫК ЗБАЛЕЛАЙ ДУШЫ

Між пажоўклых ад часу лістоў
і даўно прызабытага болю,
праз гады,
у шуфлядзе пустой
я знайшоў свае вершы з няволі.

Гэтым вершам /«Праз гады»/, напісаным у 1987 годзе, адкрываецца кніга паэзіі Васіля Супруна «Крык», нядаўна выпушчаная выдавецтвам «Мастацкая літаратура». Правільней, твор гэты — своеасаблівы эпіграф да кнігі, а далей ідуць тры раздзелы — «Боль», «Надзеі», «Доля». Зрэшты, не зусім так: раздзелы пазначаны сціплей: «З нізкі «Боль», «З нізкі «Надзеі» і «З нізкі «Доля».

Хто ж такі Васіль Супрун? Лімаўскі чытач, бадай, гэта ведае. Штотыднёвік неаднаразова змяшчаў творы гэтага пакутніка, у тым ліку і яго паэтычную перапіску з Ларысай Геніюш. Тым не менш, варта ўсё ж прачытаць прадмову Алега Лойкі «Васілёк за калючым дротам» — пра жыццёвы шлях В. Супруна. Алег Антонавіч, аказваецца, меў асабістыя стасункі з аўтарам кнігі, прытым ажно пяцьдзесят гадоў назад. А. Лойка свой першы верш апублікаваў у адзін і той жа дзень, у адной і той жа Баранавіцкай газеце разам з В. Супруном. Было гэта яшчэ ў 1943 годзе: «Вершы ў рэдакцыю даслаў Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн, тады дырэктар Слонімскага музея, які збіраў вакол сябе цікаўных да паэзіі хлапцоў».

На той час В. Супрун вучыўся ў Слонімскай настаўніцкай семінарыі, быў старэйшым за А. Лойку /нарадзіўся 10 сакавіка 1926 года ў вёсцы Глоўсевічы на Слонімшчыне/. Ды, на жаль, далейшыя яго пуцявіны пайшлі не ў паэтычным кірунку. Закончыўшы пасля вайны Ганцавіцкае педагагічнае вучылішча, В. Супрун нядоўга настаўнічаў, і вышэйшай адукацыі /завочна/ не паспеў атрымаць. У чэрвені 1947 года В. Супруна арыштавалі. Пачаліся допыты, катаванні, розныя турмы, а пасля прыгавор: дваццаць пяць гадоў зняволення і пяць гадоў высылкі. І толькі ў снежні 1956 года В. Супруну ўдалося вярнуцца на Бацькаўшчыну...

У рэшце рэшт, пра гэта можна прачытаць і ў вершах. Нездарма Васіль Рыгоравіч прызнаецца: «Паэзія была крыкам маёй душы, маім болем і пачуццём». Гэты крык збалелай душы адчуваеш і цяпер, праз гады, калі раны пачалі зарубцоўвацца і ў дачыненні да яго вярнулася справядлівасць:

Кожны верш — гэта боль,
гэта крык і благанне,
гэта вера ў сябе,
падмацоўванне сіл,
можа, нават адчай
ад той восені раняй,
што прывідам брыдзе
па краёчку магіл.

Напісана гэта ў Інцінскім лагеры N 2 у 1954 годзе. На той час ужо адбылося /годам раней/ завочнае знаёмства В. Супруна з Л. Геніюш і душа яго займела ўжо духоўнае апірышча, пачалася мік імі перапіска вершамі. Як тут не пагадзіцца з А. Лойкам: «... паэтычны дыялог 50-х гадоў — Ларыса Геніюш — Васіль Супрун — гэта унікальная старонка не толькі беларускай паэзіі. Гэта лірыка не толькі высокага грамадзянскага гучання, але і пранікліва-шчымлівая інтымная лірыка».

Застаецца толькі дадаць, што вартасці гэтых твораў, іх душэўную напоўненасць, прасветленасць і адначасова пакутлівы боль можна адчуць, калі чытаць па чарзе вершы В. Супруна і Л. Геніюш. Зварот — адказ, душэўны пасыл — рэагаванне на яго. Дарэчы, у 1989 годзе ў «ЛіМе» яны, гэтыя вершы, так і былі апублікаваны. Цяпер жа ёсць магчымасць браць у рукі адначасова згаданы зборнік В. Супруна «Крык» і томік лірыкі Л. Геніюш «Белы сон».

Згаданыя творы — толькі частка напісанага В. Супруном у турэмных, лагерных умовах. Яны сваімі матывамі блізкія, скажам, да лагернай лірыкі М. Сяднёва, С. Новіка-Пеюна, С. Пярловіча /яго кніжка мае намер выйсці ў «Мастацкай літаратуры»/ і, вядома ж, Л. Геніюш. У адным з вершаў, пасланых ёй, В. Супрун прызнаваўся: «Сапраўды, у кожным вершы тваім адчуваю знаёмага многа. Пэўна, йсці давялося дваім амаль тою ж жыццёвай дарогай».

Многім давялося ісці «амаль тою ж жыццёвай дарогай», калі не забывалі, што яны беларусы. І многія б маглі падпісацца пад гэтымі радкамі В. Супруна:

можна наблізіць ужо сёння. У 1994 годзе Мазырскі дзяржаўны педінстытут адзначае сваё 50-годдзе. Было б гістарычна справядліва, каб урад прысвоіў нашаму інстытуту імя Івана Мележа. З такой прапановай я ўжо выступала на рэспубліканскай літаратурнай канферэнцыі ў лютым 1993 года, і канферэнцыя абгрунтавала мэтазгоднасць прысваення гэтага імя інстытуту.

Горача адстойвае імя свайго земляка і кафедра беларускай літаратуры. Але пракамуністычныя сілы дамагаюцца прысваення інстытуту імя К. Тураўскага. Значнасць для беларускай культуры К. Тураўскага «златоуста, паче всех воссиявших нам на Руси», ніхто не збіраецца прыніжаць. Аднак мэты ініцыятараў чыста палітычныя: скарыстаць імя выдатнага асветніка для пашырэння маскоўскага праваслаўя, узнаўлення чырвонай імперыі — СССР. Гэта чыстае палітыканства!

Спадзяёмся на маральную падтрымку творчай інтэлігенцыі Беларусі — у тым, каб Мазырскі дзяржаўны педінстытут насіў імя Івана Мележа.

Ніна АКСЁНЧЫК,
кандыдат філалагічных навук,
ст. выкладчык Мазырскага педінстытута

Дрэйзін /1879—1942/ быў вядомы ў літаратуры 20—30-х гадоў таксама як перакладчык «Эдыпа-цара» Сафокла, «Бакханак» Эўрыпіда, частак «Іліяды» і «Адысеі». Усе гэтыя пераклады, апроч «Антыгоны» і ўрыўкаў з 6-й песні «Іліяды», не захаваліся.

Упэўнены, што вяртанне да беларускага чытача неперавзыдзенай высакароднай «Антыгоны» і знаёмства з новай версіяй «Праметэя прыкутага» стане адметнай з'явай у нашым культурным жыцці. Магчыма, гэтыя пераклады зацікавяць і беларускіх тэатральных пастаноўшчыкаў, бо новае прачытанне і сцэнічнае ўвасабленне старагрэцкай трагедыі апошнім часам набывае ўсё большую прыцягальнасць для маладой генерацыі рэжысёраў.

А. Ж.

туры найвялікшай нацыянальнай значнасці.

Выйшаў з друку першы том «Раслінны і жывёльны свет», які складаецца з 368 картаў лексічных і 19 картаў гісторыка-этнаграфічных. Аб'ём — 74,0 умоўна-друкаваных аркушаў. Фармат атласа 48 х 34,5 см. Тыраж — 1550 экземпляраў. Кошт аднаго экземпляра першага тома — 10 тысяч беларускіх рублёў. Згодна рэкламе для замежжа кошт аднаго экземпляра 50 долараў, а для арганізацый — 100 долараў. Атлас можна купіць на наяўныя грошы ў Фондзе фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь, У Прэзідыуме Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь па адрасе 220072, г. Мінск, праспект Францішка Скарыны, 66, пакой 406. За безнаяўны разлік Атлас можна набыць згодна рахунку «Фонд фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь N 700514 /Лексічны атлас/ у камерцыйным банку «Беларусь» г. Мінска, МФО 153001795, код 795. Запрашаем купіць Атлас. Сродкі неабходны, каб выдаць другі том, які ўжо знаходзіцца ў друку. Загадзя дзякуем.

І. ЯШКІН,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук Беларусі

Ці ж вінаваты я ў тым,
што радзіўся
сынам крывіцкай зямлі,
што перад гвалтам чужым не хіліўся,
ганьбу на край свой не ліў?

Безумоўна, не заўсёды В. Супруну ўдаецца выйсці за межы асабістага /аднак хіба можна папракнуць яго за гэта, калі радок нараджаўся за кратамі?/, пры жаданні лёгка знайсці і вобразную каструбаватасць, ды калі было шліфаваць напісанае? Дай Божа, каб хоць запомнілася яно, а, занатаванае на паперы, не трапіла на вока злому, хіжаму чалавеку...

Ёсць у зборніку і вершы, напісаныя пасля вызвалення аўтара, прытым і нядаўна, ужо ў канцы васьмідзесятых гадоў. Толькі лірычны герой паэта па-ранейшаму там, дзе прайшла яго маладосць: «Як бы ні рваўся я сэрцам з былога, з тае праклятай Інты, памяць цяжкой, неадступнай аблогай раняць ГУЛАГаў краты». Але піша В. Супрун і пра харастро роднай прыроды, пра землякоў. Піша цёпла, лаканічна, не шукаючы знешне кідкіх слоў, бо перакананы: не словы вызначаюць чалавека, а ўчынкі. Бо добра ведае: набалелае, перажытае лепей перадаваць проста і заглыблена.

Пра гэта і сведчыць кніжка «Крык», якая адкрыла беларусам яшчэ аднаго цікавага паэта, пра якога, на жаль, мы доўга не ведалі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Часопісы ў снежні

ЯК ПОЗВЫ МІНУЛАГА ГОДА

Толькі парадавацца застаецца вялікай творчай актыўнасці А. Асіпенкі апошняга часу. Не паспелі, як кажуць, улегчыся ўражанні ад яго рамана «Лабірынты страху»; здавалася б, толькі што перагортвалі аматары роднай літаратуры ў «Маладосці» старонкі новай аповесці пісьменніка «Цыркачка і маёр»; а цяпер, калі ласка, чарговы твор — аповесць «Клетка для берасцянак», што адкрывае дванаццаты нумар «Полымя». Тым самым атрымалася свайго роду трылогія пра той трывожны час, калі панавала камандна-адміністрацыйная сістэма, а з ёй уладарыла беззаконне. Што да трылогіі ў цэлым, дык, думаецца, крытыка яшчэ дасць ёй належную ацэнку. А пра «Клетку для берасцянак» можна сказаць адно: А. Асіпенку ўдалося праўдзіва адлюстраваць атмасферу ў грамадстве адразу пасля вайны.

Час, паказаны ў творы, прыпадае на другую палову саракавых—самы пачатак пяцідзесятых гадоў. Аўтар з першых жа старонак заінтрыгоўвае чытача, увядзяючы яго, як кажуць, у сутнасць справы. Між іншым, тыя, хто добра знаёмы з творчасцю А. Асіпенкі, даўно заўважылі за ім уменне «закруціць» сюжэт. Заўважым тут, дарэчы, што адна з бед нашай літаратуры і ад таго, што яна не надае часам належнай увагі сюжэту, інтрызе, праз якую, валодаючы адпаведнымі задаткамі, аўтар здатны і псіхалагічна-дакладна выпісаць характары.

А. Асіпенка гэта якраз і разумее. Вось самы, што ні ёсць пачатак яго новай аповесці:

« — Цярпілоўскі? — перапытаў я айца Уладзіміра, калі той назваў сваё прозвішча. — Даруйце, але ў Беларусі такое прозвішча насіў вельмі славуты і шляхетны род, апошні нашчадак якога загінуў недзе на самым пачатку пяцідзесятых гадоў. Сыноў у яго, як мне вядома, не было. Толькі дачка Алеся. У яе, што праўда, быў сын, названы ў гонар Сталіна і Леніна Сталенам, але ж ён, мяркую, насіў прозвішча бацькі.

— А я і ёсць той самы Стален Хіжняк. Бацька выракся мяне, калі я вырашыў замольваць яго грахі. Я ўзяў прозвішча дзеда Канстанціна Вячаслававіча Цярпілоўскага, а па прадзеду, які таксама служыў Богу, імя Уладзімір.

— У бязбожных бацькоў вырас свяшчэннік?..

— Дарогі божыя нявызнаныя...»

Кажаце, аўтар выяўляе жаданне ўхапіцца за модную тэму? Маўляў, не прамінае выпадку, каб звярнуцца да Бога /усё ж агульнапрынята Бог пісаць з вялікай літары!/, а тым самым паразважаць аб агульначалавечых каштоўнасцях, якія пры той жа камандна-адміністрацыйнай сістэме былі адрынуты як перажыткі мінулага. Што да саміх каштоўнасцей, вартасць якіх не змяняецца /прынамсі, не павінна мяняцца/ са зменай грамадскага ладу, то за Алесем Харытонавічам і на самай справе ёсць падобны «грэх». А вось наконт вяртання да Бога, дык у далейшым у аповесці пра таго ж самага Сталена Хіжняка, а калі па-цяперашняму — айца Уладзіміра, не будзе сказана больш ні слова. Хіба што не праз адзін дзесятак старонак даведаемся, што з'явілася на свет немаўля, якога вельмі ж ужо «ідэйны» бацька назваў дзіўным імем Стален.

Не пра айца Уладзіміра «Клетка для берасцянак», а пра Карпа Хіжняка, пра аднаго з «прывадных рамянёў» камандна-адміністрацыйнай сістэмы. Ды і, зразумела, гаворка пра тое, да чаго можа прыйсці грамадства, калі падобныя людзі пачынаюць адчуваць сябе «на кані». Карп Хіжняк — адзін з многіх, хто аказаўся на паверхні, дзякуючы вайне. Менавіта ў гэты час ён даслужыўся да маёра, хоць меў усяго «шэсць класаў школы калгаснай моладзі». Што-што, а ваяваць Хіжняк умеў. «Спаганяючы накопленую за вайну ярасць і злосць, Карп Хіжняк са сваім батальёнам бязлітасна прасаваў гусеніцамі варожыя акопы, калоны салдат, што ўзнікалі перад ягонымі танкамі, агнявыя кропкі і наогул усё, што прадаўжала супраціўляцца або падавала адзнаку жыцця».

Калі лепей разабрацца, гэта не пісьменнік гаворыць, а сам... Карп Хіжняк. За гэтымі, наўмысна казённымі словамі, радкамі — «святая нянавісць» чалавека з перадавой, які, канечне ж, ворага не баяўся, перад ім ніколі не спыняўся, але які, з-за сваёй недалёкасці, далей нянавісці не ішоў. Не да асэнсавання падзей яму было. Усё вырашалася проста: «Вядома ж, і ягоныя машыны траплялі ў пераплёт, але гэта толькі падгравала танкістаў: сволачы, фашысты, іхняе камандаванне яшчэ дзевятага мая падпісала капітуляцыю, а яны тут не здаюцца. А калі вораг не здаецца, дык яго знішчаюць. І знішчалі...»

Цяпер, пасля Перамогі, Хіжняк мусіць задумацца, а як жа далей жыць? Тое, што, як даведаўся, бацькі загінулі, таксама ў нечым выбіла яго з каляіны. Хаця зусім не да эмоцый было: «У застоліцы афіцэры найбольш гаварылі пра магчыма хуткую дэмабілізацыю і ў першую чаргу так званых вылучэнцаў вайны. Карп Хіжняк і належаў да такіх вылучэнцаў. За чатыры гады вайны вырас ад сяржанта да маёра, камандзіра танкавага батальёна». Да ўсяго яму прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. Можна было б і ў арміі застацца, каб не няўвязка з той самай адукацыяй. А тут, здавалася б, крыж над лёсам пастаўлены: «хадайніцтва аб прысваенні яму чарговага звання падпалкоўніка» нічога не дало, «перад самым канцом вайны стала вядома, што ў званні яму адмоўлена». Магчыма б, з такой, як ён лічыў, несправядлівасцю і змірыўся б, калі б на дапамогу не прыйшоў палітрук батальёна Нямоглых: «Запомні, камбат, мы — члены камуністычнай партыі, а гэта адзіная сям'я. Таму трымайся яе моцна, і калі выйдзе нявыкрутка ў жыцці, смела ідзі ў райком ці ў цэка, і таварышы па партыі табе дапамогуць. Заслугі ў цябе вялікія».

Пісьменнік і прасочвае ўжыванне Карпа Хіжняка ў новыя для яго абставіны. Пачалося з таго, што Карп Раманавіч, «не забыўшыся на параду палітрука Нямоглых», перад самай дэмабілізацыяй паслаў у ЦК ліст, у якім выказаў жаданне «актыўна дапамагаць партыі аднаўляць разбураную ворагам народную гаспадарку». Нарэшце, чаканая гаворка ў рэспубліканскім партыйным штабе. Тут Хіжняк і «праявіў» сябе. На пытанне інструктара: «І на якую ж працу вы, таварыш Хіжняк, прэтэндуеце?» адрэзаў: «Мне б такую працу, дзе паменш пісаніны, а паболей неабходнасці камандаваць».

Слова — не верабей, вылецела — не зловіш. Але справа ўся ў тым, што за гэтым «камандаваць» — цэлая жыццёвая філасофія хіжнякоў-партыйцаў. Няхай далёка не ўсё ў іх атрымліваецца належным чынам, але пастаўленай мэты яны абавязкова дамогуцца. І Карп Раманавіч тут — акурат пацвярджэнне гэтага правіла.

Крок за крокам узнаўляючы мірнае жыццё свайго героя, А. Асіпенка выкрывае хіжнякоўства як сацыяльную з'яву. Справа ў тым, што вакол Хіжняка нямала тых, хто патурае ягонай нахрапістасці. Часам з-за звычайнай павагі перад удзельнікам вайны — як-ніяк, а Герой Савецкага Саюза, калі-нікалі — з-за душэўнай дабрыні і шчодрасці, іншаму ж проста... не да Хіжняка, самому б утрымацца на вышыні! Хіжняку гэта толькі і трэба. Без уступных экзаменаў паступае на гістарычны факультэт, пачынае займацца актыўнай грамадскай работай, а пасля ... Для дэмагога Хіжняка ў краіне, аказваецца, вельмі спрыяльныя ўмовы. Часцей гавары /дакладней, крычы пра адданасць камуністычнай ідэі/ і будзеш непатапляльны.

Трываласць Хіжняка яшчэ і з тае прычыны, што само грамадства не здатна супрацьстаяць яго нахрапістасці. Хто проста запалоханы, а хто з-за сваёй залішняй інтэлігентнасці не ўяўляе небяспекі, якую нясуць хіжнякі. Гэта ў нелюбой ступені тычыцца і Юрыя Далейкі, колішняга лейтэнанта ў батальёне Хіжняка, а цяпер выдатнага маладога спецыяліста, навукоўца, на якога звярнулі ўвагу і за мяжой. Юрый доўгі час не ўспрымаў Хіжняка ўсур'ёз, па душэўнай дабрыні прапанаваў яшчэ паступіць на гістарычны факультэт. А ў выніку — і застаўся ні з чым /Карп Раманавіч жаніўся на дзяўчыне, якую Далейка кахаў/, і, як ні страшна ў гэтым прызнацца, падштурхнуў Хіжняка на злачынства. Аказаўшыся ў сям'і Цярпілоўскіх, разышоўшыся з Канстанцінам Вячаслававічам у поглядах, той дамогся, што гаспадар трапіў за краты, не перажыў несправядлівасці і скончыў жыццё самагубствам.

Шкада, але Далейка многага так і не зразумеў. Да апошняга моманту ён гатовы жыць думкай, што ва ўзаемаадносінах з любай дзяўчынай у яго ўсё ў рэшце рэшт уладзіцца. Гэтай упэўненасцю прасякнуты і ліст Юрыя да Алесі: «Словы выстройваліся ў радкі, ад якіх зыходзіла туга і пяшчота, але і ўпэўненасць у лепшыя часы, калі яны зноў стануць хадзіць у оперны тэатр, хоць на час збаўляючыся ад праклятага быту, што пажірае маладосць, красу, бестурботнасць, што засаджвае людзей, як берасцянак, у клеткі, няхай і залатыя, але такія, што не даюць развінуць крылы».

Паўтараю, аповесць А. Асіпенкі пастаянна трымае ў напружанні, сюжэт аўтарам закручаны па-майстэрску. Хоць, думаецца, у канцы твора адчувальная нацяжка. Немагчыма паверыць у тое, каб сам Цанава выклікаў на дачу нейкага Хіжняка, вырашаючы яго далейшы лёс. Галоўны кат рэспублікі, думаецца, да такой драбязы не «апускаўся»...

Калі «Клетка для берасцянак» надоўга прыкоўвае чытацкую ўвагу, дык з апавяданнем А. Кудраўца «Летні сон па дарозе дамоў» можна пазнаёміцца, як кажуць, у адзін прысест. Праўда, да твора захочацца вярнуцца зноў і зноў — настолькі кранае лёс галоўнага героя. Ды і, відаць, відочна дакументальная аснова твора: нездарма ёсць аўтарскае прысвячэнне: «Памяці Вовы Пархімовіча».

І старонкі, я б сказаў, «аповесці лёсу» Б. Сачанкі «Пад сузор'ем сярпа і молата» /сам аўтар жанр не называе, а апублікаваны твор у часопісе «Маладосць»/ для чытання менавіта ўдумлівага, неабыякавага. «Светлай памяці маці — Веры Міхайлаўны Сачанка» значыцца ў прысвячэнні. Лёс, здавалася б, звычайны і разам з тым неардынарны, бо хіба могуць быць у жыцці цалкам падобныя людзі. І адначасова праз лёс жанчыны, маці паўстае і лёс яе сям'і, вялікай і дружнай, а ў пэўнай ступені — і лёс Палесся, адным з самых слынных песняроў якога на сённяшні дзень і з'яўляецца Б. Сачанка.

Трапнасцю назіранняў вылучаюцца дакументальна-мастацкія навелы А. Капусціна /«Беларусь»/.

Багата ў снежаньскіх нумарах паэзіі: творы В. Ракава і К. Камейшы — у «Полымі»; маладых аўтараў, К. Кірэенкі, З. Марозава — у «Маладосці», Я. Пфляўмбаўм, Г. Булыкі, З. Марозава — у «Беларусі».

З публіцыстыкі хочацца вылучыць развагі У. Мехава «Варшавай ускалыхнутае» /«Полымя»/. Адштурхоўваючыся ад чатырох дзён, праведзеных у сталіцы Польшчы, калі «ўшаноўвалі памяць герояў-паўстанцаў варшаўскага гета», аўтар як бы прасочвае і лёс усяго яўрэйства, запыняючы ўвагу на найбольш вядомых /хаця ў дадзеным выпадку больш падыходзіць трагічных/ яго прастаўніках. А калі шырэй — дык гэта гаворка і пра ўсіх нас, пра тое, што паменшала на зямлі дабрыні, а без яе, дабрыні, нам аніяк не ўратавацца на буравейных паўстанках часу. Без дабрыні і без згоды. Усеагульнай, нягледзячы на тое, да якіх народаў кожны з нас адносіцца.

На гэтым і сама час паставіць кропку ў агляндзе снежаньскіх нумароў нашых часопісаў. Сёння яны ўспрымаюцца ўжо як свайго роду позвы года мінулага, а значыць, у нечым сталі і набыткам гісторыі.

М. АНДРЭЕНКА

ГЭТА ЎСЁ ДАЎНІНА

Кніжка нарысаў Станіслава Цярохіна «Перунова цяпельца» /сам аўтар вызначыў жанр яе як «Эсэ, ці Некалькі згадак з гісторыі нашага народа»/, выпушчаная выдавецтвам «Юнацтва», — з тых, якім, як кажуць, рэклама непатрэбная. Тым не менш, хочацца сказаць пра яе некалькі слоў, бо цяпер, калі мы нарэшце зноў пачынаем па-сапраўднаму паважліва і аб'ектыўна ставіцца да багатай нацыянальнай гісторыі, якраз і патрэбны творы, што даюць адказы на пытанні: хто мы, адкуль мы? С. Цярохін і прыбліжае чытачоў /найперш школьнікаў, каму кніжка адрасавана/ да ўсведамлення, што без дасканалага ведання ўчарашняга, не можа быць сённяшняга, што чалавек без памяці — чалавек без каранёў.

У нарысе, які даў назву зборніку, прасочваецца доўгі шлях, які прайшоў чалавек /беларусы ў тым ліку/ да авалодвання агнём, расказваецца пра пакланенне яму, пра традыцыі і звычаі, што ўзніклі ў сувязі з гэтым. «Шахматы далёкіх продкаў» — вяртанне да вытокаў цывілізаванага свету, жаданне паказаць, як людзі на самым парозе свайго развіцця былі кемнымі, мелі разумовыя задаткі. Нарыс «Хто адкрые таямніцу аўтарства «Слова» — мажлівасць яшчэ раз перагарнуць старонкі неўміручага «Слова пра паход Ігаравы», у першую чаргу тыя, што маюць дачыненне да Беларусі.

Усхвалявана піша С. Цярохін пра аўтара шматлікіх навуковых прац па фальклоры, гісторыі, этнаграфіі літоўскага і беларускага народаў Людвіка Юцэвіча /«Лепельскі выгнаннік»/, перагортвае старонкі лёсу Іяхіма Літавора Храптовіча /«Энцыклапедыст са Шчорсаў»/, у асобе якога, як вядома, «на рэдкасць суладна спалучаліся дзяржаўны і грамадскі дзеяч, філосаф і асветнік, публіцыст і паэт, гуманіст і прыродазнаўца».

Яшчэ два нарысы ўзнаўляюць далёка неардынарныя падзеі. Назва аднаго з іх — «Мядовы бунт» — гаворыць сама за сябе. Аказваецца, і такое выступленне сялян было ажно ў 1700 годзе, калі жыхары Слонімшчыны адмовіліся аддаваць палову мёду, як таго запатрабавала Ганна Сапега. І нарыс «Кішанёвая рэспубліка» таксама ўзнаўляе падзею унікальную. Была такая рэспубліка, а калі дакладней — Паўлаўская, створаная 10 сакавіка 1767 года непадалёк ад Ашмян уладальнікам маёнтка Мерач Паўлам Ксаверы Бжастоўскім, яна праіснавала да 1824 года.

Толькі некалькі штрыхоў з гісторыі Бацькаўшчыны, і ўсё гэта — наша беларуская даўніна. Дарэчы, апошнім часам выдавецтва «Юнацтва» павялічвае выпуск кніг, прысвечаных мінуўшчыне.

А. М.

ЯК СЕЗАМ, АДЧЫНЯЕЦЦА ДАЎНІНА

Адразу дзвюма цікавымі кнігамі парадавалі аматараў даўніны беларускія гісторыкі. Першая з іх — "Культавае дойлідства Беларусі XII—XVI стст." — напісана Алесем Кушнярэвічам. Аўтар уводзіць у навуковы ўжытак і раней невядомыя помнікі, на канкрэтных прыкладах паказвае /у кнізе — звыш ста ілюстрацый/, што архітэктурны ўзровень шмат якіх беларускіх культавых пабудоў ставіць іх "у адзін шэраг з агульнавядомымі помнікамі заходнееўрапейскай архітэктуры". А вось у кнігі "Стары замак у Гродне XV—XVIII стст." — тры аўтары. Гэта — Алег Трусаў, Валянцін Собаль і Ніна Здановіч. Як вядома, архітэктурна-археалагічная экспедыцыя Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута ў 1977—1981 і 1985—1988 гадах правяла на тэрыторыі Старога замка ў Гродне раскопкі, якія ставілі за мэту вывучэнне рэшткаў даўніх забудоў, а таксама стану захавання культурнага пласта, што застаўся. На падставе вынікаў гэтых экспедыцый аўтары і аналізуюць матэрыяльную культуру старажытнага горада. Тут таксама багата ілюстрацыйнага матэрыялу. Застаецца дадаць, што абедзве кнігі выпусціла выдавецтва "Навука і тэхніка".

ПРАЦЯГ ЖЫЦЦЯПІСАЎ СЛАВУТЫХ ЗЕМЛЯКОЎ

Вы не ведаеце, хто такі Іван Яркоўскі? Нічога дзіўнага. Доўгі час стараючы выпадковых ідалаў, мы забываліся пра тых, хто сваім жыццём і самаадданай дзейнасцю заслужыў усеагульную пашану. І. Яркоўскі акурат і належыць да такіх людзей. Менавіта ён /родам з Асвеі, што на Віцебшчыне/ выказваў у сваіх працах арыгінальныя думкі, што тычацца эвалюцыі зорак, вулканічнай дзейнасці. Калі ўважліва паставіцца да яго разваг, дык можна заўважыць, што І. Яркоўскі пісаў пра радыеактыўны распад, прадугадваў існаванне нейтрыны.

Шмат чаго яшчэ зрабіў гэты таленавіты чалавек. А падрабязна пра жыццёвы і навуковы шлях І. Яркоўскага можна даведацца з кнігі Вольгі Гапоненкі "У пошуках гармоніі сусвету", якую выдавецтва "Навука і тэхніка" выпусціла ў серыі "Нашы славутыя землякі".

На падыходзе ў гэтай бібліятэчцы — навуковыя жыццяпісы Адама Міцкевіча, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Данькі Гарадзенскага, Вацлава Ластоўскага і іншых знакамітых беларусаў.

АМАТАРАМ БЕЛАРУШЧЫНЫ

прыйдзецца даспадобы дванаццаты нумар часопіса "Роднае слова" за мінулы год. У раздзеле "Філалогія" — артыкулы С. Андраюка "Талент неспакойны, чулы" /літаратурны партрэт А. Кулакоўскага/, У. Мархеля — "Дзеля асэнсавання ўласнага шляху" /чытаючы Адама Міцкевіча/, А. Бельскага — "Пуцявінамі абнаўлення" /маладая беларуская драматургія/. Упрыгожанне нумара — каляровыя ілюстрацыі /прадстаўлены творы І. Ахрэмчыка, Ф. Янушкевіча, В. Янушкевіча, іншыя матэрыялы/. Як дапаўненне да іх — публікацыі раздзела "Культура Беларусі". З іншых матэрыялаў — заканчэнне артыкула П. Навойчыка "Дзве плыні ў "нашаніўскім" руху", артыкулы Я. Янушкевіча "Радаводнае дрэва Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, або Працяг — будзе!", слова М. Скоблы пра А. Вялюгіна, працяг "Календара юбілейных дат і памятных дзён на 1994 год", складзенага Я. Саламевічам...

ПРА МІНУЛАЕ — У "БЕЛАРУСКАЙ МІНУЎШЧЫНЕ"

Часопіс "Беларуская мінуўшчына" свой першы год заваршыў здвоеным пятымшостым нумарам. Прыцягваюць увагу матэрыялы пра Другі Усебеларускі Кангрэс, артыкулы М. Біча "Дзяржаўнасць Беларусі: станаўленне, барацьба за аднаўленне", А. Андруховіча "Безабаронны народ мілітарызаванай дзяржавы", нарыс М. Дзелянкоўскага "Край паэтаў", згадкі С. Грахоўскага пра М. Забэйду-Суміцкага "Вярнуўся песняй на радзіму", працяг цыкла У. Арлова і Г. Сагановіча "Гісторыя Беларусі: год за годам", вершы У. Паўлава. Змешчана таксама разнастайная інфармацыя, што тычыцца розных аспектаў нашай багатай гісторыі.

Паэзія

ПРАДМОВА

Боль за сябе і за народ
Параніў і маю душу,
Таму вось гэтак з году ў год
Крывёю ўласнаю пішу,

І не злуюся, і не лгу,
Але іначай не магу.

ПАРАЎНАННЕ

Адзін гаруе дзень пры дні,
І моліць літасці у неба:
Няма ў кішэні — ані-ні,
Сям'я жадна кавалку хлеба.

Другі — урвіцель барыша,
Мастак на хітрыя рашэнні.
Пустая у яго душа,
Затое поўныя кішэні.

Каб не студзіў студзёны студзень
І не палохаў зграяй зграй,

Каб верылі мае нашчадкі,
Што некалі усё міне,
І будуць жыць заўсёды згадкі
Аб нашай горкай Старане,

Стаптанай, змучанай, прыгожай,
Што гаравала век сама
На рубяжах і раздарожжах,
А за яе радней няма,

І не было, і век не будзе.
Час непрыкметна прабяжыць...
Мы знікнем, але будуць людзі
І Беларусь заўсёды жыць.

29/XI—93

НА ДЗЯДЫ Ў БАЛЬНІЦЫ

З тае пары крывінкі на панелі,—
Жывыя сведкі здзеку і бяды,

Зірніце: з торбамі спяшаюцца усе,
Шнуруюць ад ларка да гастранома,
Але ніхто нічога не нясе,
Бо пуста ў крамах, кашальках і дома.

"Рэформам" кожны быў спачатку рад,
Мы ўсе рублі на чорны дзень збіралі,
А чорны дзень даўно стварыў урад,
І ўсіх, як лішку, злыдні абадралі.

Яны з трыбун крычаць: "Мы за народ!
За ваша шчасце. Нашым планам верце!"
Аж захлынаюцца і крывяць рот,
А я малю: "Ад шчасця б не памерці".

Не бачаць злыдні нашае бяды,
За ўладу грызучыся ў цытадэлі.
Яны ад балбатні і ад нуды,
Відаць, былых парадкаў захацелі.

"Інтэлігенты" ў першым пакаленні,—
"Макрушнікі", "шасцёркі", "паханы",

Сяргей ГРАХОЎСКІ

ТРЫВОЖНЫЯ ЭЛЕГІІ

•

Мой голас на высокай ноце
Звініць бывае і не ў час,
Хоць блізка дзень, што ў адзіноце
Ён прагучыць апошні раз.

25/XI—7/XII—93

ЗДАНІ

Здаецца, што з кашмарных сноў
Вяртаюцца былыя здані,
Нам на пагібель зноў і зноў
Страшней за цвёрдае заданне.

Галеча, голад, смерць і кроў,
Разбой, рабункі і пажары,
І сцюжа дыхае з муроў
У чорныя ад гора твары.

Пагібель крочыць след у след...
Даўно без жаднае надзеі
Гібеем я, і мой сусед,
А раскашуюцца зладзеі,

Дзялкі, хапугі, гандляры,
Фарцоўшчыкі і прайдзісветы
Дапялі да свае пары,
Дабіліся жаданай мэты.

Для нас пагібель, ім — жыццё,
Памножанае на мільёны,
А нас галеча, як асцё,
Даводзіць кожнага да скону.

Як занядбаны чалавек
Маўчу, цярплю, ды не змірусь,
Што кінуты даўно на здзек,
Што Беларусь — без Беларусі.

23/XI—93

ПАСЕРАБРЫЛА СІВІЗНА

А я ж лічыў жыццё бясконцым,
Што буду вечна малады,
Што на рыфмованай старонцы
Пакінуць след мае гады.

Зірну ў люстэрка, — не змяніўся,
Зіма мінула і вясна,
Але, відаць, што памыліўся,—
Пасерабрыла сівізна

І скроні, і густыя бровы,
Ну, а душа? Душа гарыць:
Да слова слова кіжа слова,
Каб не маўчаць, а гаварыць,

І гавару, што набалела,
Што радуе, і што баліць,
Каб толькі не маўчаць, а смела
Хлусню і хітрыкі зваліць.

Па радыё і з тэлестудый
Кажу, каб чулі з краю ў край,

Гараць і пад асфальтам, як гарэлі,
І свечкамі мільгаюць на Дзяды.

Ні дождж, ні снегапад не зацярушыць
Сляды, і слёзы, і пякельны жах,
І забыццё не закасуе душы,
Што ў Курапаты пратанталі шлях.

Яны у кронах пачарнелых соснаў
Жылі, жывуць і будуць вечна жыць,
Каб углядацца у зеніт дзівосны,
Дзе зорка кожная дрыжала і дрыжыць.

1/XI—93. Палата N 602

ПЕРШАЕ ЧЫСЛО

Як рыку ашалелага асла,
Палохаюся першага чысла.

Снуюць чыноўнікі ў шыкоўных кабінетах,
Пільнуюць іх вярзілы у берэтах.

Тут не адзін укормлены узвод
Тых сцеражэ, хто "дбае пра народ",

Народ, што любіць "мудры" лад —
Парламент і непераможны чрад,

Што на рабоце аж кіпіць да пены,
Каб першага чысла патроіць цэны,

Каб кожнаму набіць найбольш гузоў
І кошт узняць у тысячу разоў,

А жабраку на гузік і на лату
Пабольшыць мінімальную зарплату.

Чыноўнікі стараюцца да поту
Гуляць за плату ў марную работу,—

Нас абдзіраць з усіх бакоў
І торбы адбіраць у жабракоў,

А прыхапкамі пасля працы
За лета збудаваць сабе палацы.

Што так яны гаруюць, кожны "рад"
Карміць такі Парламент і Урад.

Забралі ў нас апошняга масла.
Што ж адбяруць зноў першага чысла?

Увішна ўвесь чыноўны род
Святкуе тыдзень Новы год,

Сабе на радасць, нам на зло...
О, Божачка! Зноў першае чысло.

3/XII—93

ПАКУТНІКАМ ЗА НАРОД

Зрабіце ласку, — не хварэйце за народ,
Ён сам ад ласкі вашае хварэе,
І з дня на дзень, і з году ў год
чсё скарачаецца і з голаду хірэе.

Каб толькі нас паставіць на калені,
Перастралялі сотні без віны.

О, дзікі свет! Скажы, каму паверыць?
З якімі прайдзісветамі ісці?
Якою меркаю іх душы мераць,
Каго маліць, каго клясці?

Хто колькі варты, што з іх кожны значыў,
Як ні стараўся, зразумець не змог.
Відаць, пакутнікамі кіраваць прызначыў
Люцыфер, а не мудры Бог.

Мы зведалі хлусню, кашчунства, здраду
На сотнях акрываўленых дарог.
Угневаны на змагароў за ўладу
Расплюшчы вочы, ўсемагутны Бог,

На Беларусь-пакутніцу зірні,
Сумленне з розумам уладарам вярні.

12/X—93

•

Калі пралезуць пешкі у фярзі,
Нікога ім не выцягнуць з гразі.

29/XII—93

СЦЮДЗЁНАЯ НОЧ

Глянь іншы раз на яе, — у растанні.
М. БАГДАНОВІЧ

Туманны вечар.
І карункі снегу
На вербах і на чырвані рабін
Мне нагадалі даўнюю кунегу
І шчасце першых радасных гадзін,

Як на марозе палымнелі губы,
Твая гарэла у маёй рука,
І мне вярзлося — нехта шэпча "любы"
На беразе застылага стаўка.

Такая цішыня у цэлым свеце,
Іскрацца срэбрам чыстыя снягі,
На вербах долу пазвісала вешце
Ад шэрані і лёгкае тугі.

Пасля твае таемныя іскрынкі
У цёплым змроку мне былі відны,
Гадзіны праляталі, як хвілінкі
І без твае, і без мае віны,

А досвітак прарочыў развітанне,
Снег зараўняў вячэрнія сляды,
Мы не маглі паверыць, што расстанне
Нас развядзе са шчасцем назаўжды.

Дзе ты цяпер?
Зірні ў сівыя высі,
Каб зорку недзе нашую знайсці.
Не знойдзем, хоць апоўначы прысніся
Апошні раз у блытаным жыцці.

4/XII—93

ПРЫСВЯЧЭННІ

НЕЗАБЫЎНЫ

Памяці Фёдара ЯНКОЎСКАГА

Не дагукацца, не дазвацца
Ні ў гуле вуліц, ні ў цішы.
Відаць, не кончылася праца
Тваёй нястомнае душы.

Яна да слова ніжа слова,
Каб сэрца сэрцу далучыць,
Каб ведалі, што наша мова
Жыве, гучацьме, як гучыць,

Каб кожны гук па-беларуску
Працяў чыноўніцкую глуш.
Твая душа жыве у Глуску,
На небе і ў мільёнах душ.

Я за яе і тут малюся,
І за гарою пакланюся.[1]

[1] *Назва кнігі Ф. Янкоўскага*

ЯШЧЭ НЕ ВОСЕНЬ

Заслужанай атрыстцы Алене Васільеўне РЫНКОВІЧ

Лепш не лічыць жаночыя гады.
Заўжды жанчына маладая,
Празрыстая, як кропелька вады,
Душой і сэрцам уладае,
І свеціць, і чаруе, як вясна,
І грэе поглядам, і ласкаю у сцюжу,
І непаўторная і шчырая яна
Усмешкаю і шчокі і душу асмужыць.
Загоіць боль з Купалаўскае сцэны
Артыстка непраходнае красы
У трапяткім вяночку Мельпамены
Усцешыць і ў трывожныя часы.
Ляцяць лісты у апусцелым парку,
А Вам вечназялёная сасна
Шапоча, што Купала б выпіў чарку,
Бо ў Вас яшчэ не восень, а вясна.

27/IX—93

І РАМАНІСТ І ЛІРЫК...

Алесю АСІПЕНКУ

Лірычная і чулая душа
Цяпер не варта ні граша,
Нікому лірыка не трэба,
Калі няма ні бульбы і ні хлеба,
Калі ў кватэрах хоць ваўкоў ганяй,
І тысячы "зайцоў" на долар памяняй.
Трашчаць ад мяса і кілбасаў рынкі.
Любуйся і глытай ад смагі слінкі.
Кіраўнікоў прамовы слухай,
Патыліцу і лысіну пачухай,
Калі зацятыя змаганцы
Грызуцца за выгоды на "трасянцы",
Упартыя, як тое пагалоўе,
чсё за дзяржаўнае двухмоўе,
Бо выракліся мовы роднай
І добра не валодаюць ніводнай.
Не трэба ім тэатры і культура,
Адна б жыла наменклатура,
Бо ўеўся ім да самых нырак
І раманіст, і чулы лірык.
У іх — мільёны дзеля ўласнай касты,
А раманісту — цюбічак зубное пасты.

Вось і не ведаю, чыя душа
Цяпер не варта ні граша.

4/XII—93

ІНФАРКТ ДУШЫ

Інфаркты сэрца добра мне знаёмы:
Уколы, кропельніцы і трызня,
Вішу на павуцінцы цяжкай стомы, —
Ні вуснаў, ні павекаў не разняць,

Не бачу — ў снезе ці ў лістоце вещце,
Ці на Зямлі, ці па дарозе на той Свет,
Уверсе Сірыус, ці недзе ўнізе свеціць,
Ці кардыёграф мой закрэсліў след.

Лячу і падаю то ў прорву, то ў пакуты,
Спрабую ўратавацца кожны раз,
Вярнуць сябе туды, дзе горш атруты
Таемны позірк і забойчы сказ.

Шкада расстацца з светам і сябрамі,
Яшчэ парадаваца б, нават саграшыць,
Сустрэцца б з дарагімі дактарамі,
Што не заўважылі інфаркт маёй душы.

Пра боль яе і пра рубцы маўчым мы,
Бо іх нічым загоіць немагчыма.

25/XII—93

ПАЛІГЛОТУ

Ледзь-ледзь заружавее ўсход,
Усё глытае запар паліглот:
Ляжаць умовы і падрады
На пераклады з перакладу —
Нікому невядомы тэкст
Пра сто забойстваў і пра секс,
І не пытай, і не прасі,
Перакладзе з іўрыта і фарсі,
З японскае, кітайскай і нямецкай,
Чукоцкай, грэчаскай і шведскай,
З латыні, польскай і этрускай,
З карэйскай, нават з беларускай,
З бенгальскае і зможа з "фені",
Абы набіць хутчэй кішэні.
На службе строчыць, на хаду і дома, —
А што ў арыгінале, — невядома.

25/XI—93

НЕЗАБЫТЫ СНЕЖАНЬ

Хоць і снежань, а снегу і знаку няма.
Зноў слата, туманы і макрэча.
Ты тады прызначала спатканне сама,
Я ж чакаў і трызніў пра сустрэчу.

Што ж з гадзіннікам? Стрэлка спыніла хаду.
Апрануся, то зноў распрануся.
Як цябе у стракатым натоўпе знайду,
Не пазнаю, прайду, размінуся.

Я ж сустрэўся калісьці з табой на катку:
На крутым віражы падхапіў, каб не ўпала.
Даганяў цябе потым на кожным вітку,
Але бачыць здалёк — вельмі ж мала.

Ты магла спатыкнуцца. Я рукі развёў.
Лёд звінеў, мітусіліся зоры ў паветры,
І хапіла усмешкі і некалькі слоў,
Каб атрэсці твае заінелыя гетры.

Мы ішлі. За плячыма звінелі канькі,
Ты смяялася, мабыць, з мае асцярогі,
Што баяўся крануцца ласкавай рукі,
Паглядзець на высокія статныя ногі.

Ты, напэўна, за дурня лічыла мяне,
А здавалася німфаю, зоркай, багіняй.
Я баяўся, як толькі зімы праміне,
Без катка і сяброўства загіне.

...Праляцела паўвека. Расталі снягі,
Снежань буйнымі кроплямі плача.
Я адзін. А збавення няма ад тугі,
Бо на памяці — толькі няўдачы.

Маладыя ідуць, маладыя ідуць,
Невядома — дадому ці з дому.
Хто каго, і куды, і навошта вядуць.
Я дзіўлюся, што ўсё ім вядома.

А я і ссівелы бядую
І сваёй маладосці шкадую.

7/XII—93

●

Куды мне дзецца ад тугі
І у каго знайсці спагаду?
Як вузел развязаць тугі,
Што збылтаў і любоў, і здраду?

Я ўсё жыццё ў сябе ў даўгах,
Чужой абылтаны маною.
Любоў, і здрада, і туга
Адыдуць назаўжды са мною.

4/XI—93

МАЕ РАДКІ

Мае гады прайшлі імкліва,
Без компаса, без маяка.
Калі б я быў заўжды шчаслівы,
Не напісаў бы ні радка.

У першы дзень, такі далёкі,
І у наступныя гады
На целе і душы апёкі
Свае пакінулі сляды.

Даверлівы, спагадлівы, наіўны,
У першы і ў апошні час,
Я не знайшоў ніводнай грыўні,
А траціў тысячы не раз.

І ўсё ж не падаў на калені
ч пачатку і ў канцы дарог.
Як ні цярпеў, але сумленне
Усё ж да кропелькі збярог.

Прылівы зведаў і адлівы,
Ад стомы падала рука.
Калі б заўсёды быў шчаслівы,
Не напісаў бы ні радка.

6/XII—93

Проза

Янка БРЫЛЬ

ЧЫТАЮ, СЛУХАЮ, ГЛЯДЖУ

БЛАКНОТНАЕ

У зборніку "Шляхам гадоў" — добрая публікацыя Людмілы Мазанік пра Язэпа Пушчу, з пісьмамі да яго, — адно ад рэабілітаванага Дубоўкі, а то ўсё Бабарэкавы. Калі абодва яны былі ў ссылцы.

Дзве Адамавы дачушкі сумавалі па дзвюх дачушках Язэпавых, што паўтаралася ў пісьмах крытыка да паэта. І гэта сказала мне штосьці новае: пакуты ссылкі і праз успрыманне іх дзецьмі. Як ажыўляе, ацяпляе тыя пісьмы Бабарэкі адно толькі слова — **бацік**! Так да яго звярталіся дочкі, "у краіне голаду і холаду" быўшы ў разлуцы з бацькам. Праца, служба бацькоў, бухгалтара і настаўніцы, раздзяляла сям'ю, жыць у адным горадзе не маглі, дзеці заставаліся пры маме, а "бацік" піша сябру:

"Знудзіліся былі без мяне. А яны вельмі ж ужо **ўбіваюцца па мне**".

Ажно падкрэслілася — так добра гэта ў яго па-беларуску!..

Мы скардзімся на свае цяжкасці патрыётаў, а іхняе, тое, што перажывалі нашы пакутнікі, бачыцца нам здалёк, гістарычна. А гэта ж у іх рэчаіснасць была, штодзённічына з усёй паслядоўнасцю пранікнення дзяржаўнага здзеку ў побыт сям'і, у душы паасобных людзей, дарослых і малечы. А што чакала іх усіх — пра гэта думалася і днём, і ноччу, з трывогай і страхам за сябе, за сваіх, за Беларусь. Сюды і ссылка, сюды і турма, і лагер, і "вышкі" — жахлівы канец тых, з кім распраўляліся ў трыццатых і пазней... А тое, што яны думалі, адчувалі ў перадсмяротнай самотнасці?..

●

Максім Гарэцкі — зноў.

І ў нядаўнія юбілейныя дні думаў пра гэта, і сёння над яго старонкамі яно паўтарылася. У жаху здзейсненага ў невядомай мне Вязьме намагаўся жыва ўявіць тую нікчэмна-страшную істоту, стрэлам якое не проста ў галаву, а ў **такую душу** было забрана ў народа **такое жыццё**!..

...Адразу, каб не забыцца:

Танк — пра "Скарбы жыцця", якія ён таксама прачытаў у "Полымі". Яны яму нагадалі "Ангэллі" Славацкага. І я адразу ўспомніў з тэксту Максіма Іванавіча тое, што адзначыў на полі, чытаючы:

"Выехалі — сінь, гладзь, да Кіпарысаў... Санеты. Свяціла. "Смутно мі, Божэ!"

Пасля гутаркі па тэлефоне ўзяў першы том пана Юліюша і зноў перачытаў даўно знаёмае — магутны, велічны "Гімн" дваццацісямігадовага генія з тым рэфрэнам: "Smutno mi, Boze!" пасля кожнай з васьмі несмяротных строф.

У паляка пад вершам паметка: "Пісаў на захадзе сонца на моры перад Александрыяй". Мора — Міжземнае. А ў беларуса — Чорнае, перад "Кіпарысамі" — Ялтай. А мне яшчэ і рускі прыгадаўся, з-над мора трэцяга — "Воспоминание" Пушкіна...

Пераклічка высокіх пачуццяў, повязь вялікага.

●

Факсімільнае выданне "Другога чытання для дзяцей беларусаў".

Недасканаласць... не, лепш — нераспрацаванасць нашай тагачаснай літаратурнай мовы нават расчульвае, як непісьменная, прастацкая гутарка нашых старых бацькоў. Свежая назіральнасць, веданне прыроды, любоў да яе, веданне працы /які пажар лесу!/, пашана да тых, што цяжка працуюць — сапраўды народныя. Прабіваецца, чуваць падтэкстам "нравственность" семінарскага выхавання, начытанасць вялікай літаратурай.

Нават і памылкі друку, якіх мноства, гавораць пра хвалюючую беднасць роднага.

А ўсё ж і раздражняе месцамі тая мова, з якое пачыналася літаратурная, сучасная. Хоць і сёння часамі, і часта, сумна і прыкра бывае. Ды гэта ўжо ў паасобных выпадках, у таго ці іншага аўтара, дзе невуцтва ці недахоп таленавітасці.

●

Робэрт Кірштан, "Клан Камеронаў". Шатландскае на польскай мове, два томікі кішэннага фармату. Добрыя два дні і сённяшняя раніца ўдзячнага чытання.

Учора званіў Вітка і, між іншым, спытаўся, што я чытаю. І мы пагаварылі пра тое, як многа на свеце добрых пісьменнікаў і кніг, і як шкада /тут мы і засмяяліся/, што ўсіх іх не прачытаеш, і як добра так пашыраць сваё ненаежнае веданне сапраўднай літаратуры чалавецтва.

Паглядзеў на карце Шатландыю, радзіму тых шахцёраў, з іх нялёгкім, складаным жыццём на зямлі і пад зямлёй, і яшчэ, яшчэ раз прыемна стала ад бясконцага па часе і разнастайнага па геаграфіі папаўнення сваёй чытацкай касы. Ад чаго не проста абагачаешся, але і дапрацоўваеш самога сябе для належнай службы роднай справе.

●

У "Литературной газете" — пісьмо дачкі Караленкі да Н. К. Крупскай пра голад на Украіне. Уяўлення і сэрца не хапае ўжо на глыбейшае ўспрыманне тых жахаў...

І такое яшчэ ўражанне ад пісьма Соф'і Уладзіміраўны, — глыбокая ў прастаце і душэўная, без натугі розуму здольнасць пранікаць у галоўную сутнасць рэчаў, што ідзе ў яе, безумоўна, і ад высакароднага бацькі, і ад яго старэйшага сябра, Талстога, — ад тых глыбіняў чалавечнасці, якія так нялюдска, ганебна тапталіся крыважэрнымі хамамі...

●

Герман Гесэ, "Гульня шкляных перлаў".

Сапраўдны, а тут можна сказаць і вялікі, пісьменнік мала, а то і вельмі мала цікавіцца тым, цяжка ён чытаецца ці не цяжка, — піша сваё, як хоча, і застаецца самім сабою.

...Тое, што Сёмуха перакладае не з рускіх перакладаў, як многія "некаторыя", а заўсёды з мовы арыгінала, тут — з нямецкай, дапамагае яму не скочвацца да найлягчэйшага, а шукаць і знаходзіць чыста беларускія словы, звароты ды выверты, беручы з народнага і месцамі ўздымаючыся да плённай словатворчасці.

/А ўсё ж і паланізмаў трохі ёсць, і ўкраінізмаў, нібы па дружбе з Караткевічам, да моднага **байстручка аповяда** ўключна. Праўда, толькі ў двух ці ў трох выпадках, з чаго мы разам па тэлефоне пасмяяліся/.

...Яшчэ калі Ёзаф Кнэхт уздымаўся, я прадчуваў у яго далейшым лёсе падабенства да лёсу талстоўскага айца Сергія, да заканчэння той аповесці. Яшчэ жывей пра гэта нагадала цудоўнае апавяданне "Спавядальнік".

Сіла прастаты і мудрасці.

●

У цікавай, патрэбнай кнізе нястомнага Яраслава Пархуты "Зямля бацькоў нашых" мацней кранулі два моманты.

На палях Шуміліншчыны вельмі многа валуноў. Той, хто расказваў аўтару пра гэтую спрадвечную бяду, як уздыхнуў:

"**Магутанькі** не было з камянямі тымі".

Слова, упершыню пачутае, падкрэсліць захацелася. Успомніўшы адразу двух сяброў, што так аддана служылі нашай роднай мове. Адзін, здалося, сказаў бы з усмешкай

(Працяг на стар. 10-11)

ПРЭМІЮ ПАДЗЯЛІЛІ...

Фірма «Літвіны», якой кіруе С. Салохін, узяла плённы ўдзел у конкурсе Саюза кампазітараў Беларусі на лепшы камерны твор. Якім чынам? У якасці спонсара. Дзякуючы «Літвінам» пераможцы конкурсу атрымалі грашовае заахвочванне за лепшае сучаснае ўвасабленне народных традыцый у камернай музыцы. Пераможцамі названы маладыя кампазітары В. Кузняцоў /з творам «Гетэрафонія»/ ды С. Янковіч /з творам «Пастараль»/. Прэмія, прызначаная спонсарамі, была падзелена напалам, і С. Салохін уручыў кожнаму творцу па 100 тыс.

40 ГОД БРЫТАНСКАЙ СКУЛЬПТУРЫ



Генры Мур. Фігура, напалову ляжачая. 1939 г.



Лін Чэдвік. Звер XXII. 1959 г

Багаты стаў Мінск на выставы замежнага мастацтва, што асабліва датычыць Польшчы, Германіі, а цяпер і Вялікабрытаніі. Не так даўно даўжэзная «галерэя» Дзяржаўнага мастацкага музея стала падобнай і на адзін з ціхенькіх музейных зальчыкаў, дзе звыкла ходзіш ад работы да работы, знаёмячыся з дзівоснай феерыяй незнаёмай нам культуры — як брытанскай, так і агульнаеўрапейскай. Абцякальна-эратычныя лініі Генры Мура, экстравагантна-жорсткія формы Барбары Хэпвард ці Роберта Адамса, фантастычныя звяры Лін Чэдвік. Скульптуры, падмацаваныя абстрактнымі жывапіснымі работамі на сценах. Аніякай фальклорнасці, аніякіх адзнак краёвасці. Агульнаеўрапейскі шлях мастацтва, зварот да абстрактна-жорсткага ўвасаблення, да квінтэсенцыі канкрэтнай ідэі ва універсальнай форме, якую можна адшукаць як у прыгожых лініях жаночага цела, так і кінутым на сметніку кавалку жалеза. Адзнака цывілізацыі — эстэтычнасць у кожнай рэчы, самай парадаксальнай і самай звычайнай і незаўважнай.

Поспех выставы — вялізны. Бо кожнае знаёмства з замежным мастацтвам для нас застаецца адкрыццём.

ВОДГУЛЛЕ «САКРАСОНГА»

Так назвалі сваю канцэртную праграму госці камернай залы, што на Залатой Горцы, — артысты Мінскага абласнога камернага хору. Пра гэты калектыў з Маладзечна і яго мастацкага кіраўніка А. Шута «ЛіМ» распавядаў летась, калі зусім малады хор выйшаў у лаўрэаты і Міжнароднага фестывалю «Магутны Божа», пасля чаго атрымаў запрашэнне ў Кракаў на прэстыжны фестываль новай хрысціянскай музыкі «Сакрасонг». Своеасаблівай справаздачай перад сталічным слухачом і стаўся канцэрт маладзечанцаў «Водгулле «Сакрасонга». Уражвала ўсё: і сакавітая ёмістасць гучання брукнераўскай музыкі, і жывы подых размаітых вакальных ансамбляў у Моцартавай «Missa brevis», і мяккасць басовай групы, і віртуозныя поліфанічныя карункі ў сучасных духоўных творах /Нікадамовіч, А. Дзмітрыеў/, якія рыхтаваліся для выступленняў на «Сакрасонгу», а ў Мінску прагучалі як прэм'еры. Ну, і, канечне, салісты з маладымі й моцнымі опернымі галасамі: тэнар Г. Юрэвіч, барытоны С. Зубкевіч ды А. Важнік, сапрана Н. Селіверстава. А з якім захапляючым пачуццём імкнуў пад «неба» касцёла голас М. Васілевіч, з гэтым дзівосным срэбразвонным crescendo! Якой дзіўнай фарбай расквечваў ажыўшую харавую партытуру незвычайны, «альтовы» тэмбр І. Пацоўскай! Нарэшце, як далікатна перапляталася з галасамі фартэпіянная партыя, пераўвасобленая са складаных аркестравых партытур канцэртмайстрам хору С. Кудрыным.

С. БЕРАСЦЕНЬ

Музыка

ТРЫ «ІПАСТАСІ» УЛАДЗІМІРА КУР'ЯНА

КОЛЬКІ я яго ведаю, ён ніколі не папярэджваў выкананне свайго твора шматслоўнымі тлумачэннямі зместу ці ідэі, ніколі не распавядаў красамоўна пра выбітнасці й глыбіні. Выразнасць ягонай музыкі заўсёды кажа сама за сябе.

Ён ні раней, ні цяпер не вылузваўся са скуры, каб даказаць, што ўсё, што ён піша, сапраўды /і толькі ў яго!/ беларускае /такія памкненні сёння, на жаль, з сумам назіраю/. Яму не трэба было ні тады, ні цяпер быць палітыкам у мастацтве, каб хуценька ўзбегчы на грэбень хвалі. Бо ён — талент. Ён — мастак-беларус, і ў кожным творы яго, у асобнай музычнай фразе пазнаецца тое непадробнае, унікальнае — той спецыфічны стан душы, пра што раней сказалі б: нацыянальны дух /цяпер ужываюць іншае слова — ментальнасць/. Гэта не растлумачыш нават, але адчуеш, слухаючы ягоную музыку. А наогул, прыгадваючы, як многа зрабілі для беларускага мастацтва Мулявін, Тарасаў, Кармунін, ён лічыць, што для нацыянальнай культуры валоданне прафесіяй і талент даюць больш, чым самыя надзённыя дэкларацыі пасрэднасцяў.

Ён ніколі не рваў кашулю на грудзях /як, няма чаго хаваць, робяць тыя, хто тэхнічнымі вынаходніцтвамі маскіруе адсутнасць сапраўднай даравітасці/, каб даказаць... Што? Што ягоныя вынаходніцтвы ў музычнай мове самыя найноўшыя або што ён першы, хто ўжыў іх на беларускай глебе. Яго знаходкі арганічныя, неспадзяваныя, а музычная фантазія не перастае здзіўляць.

Ён ніколі не дакляраваў ступень сваёй блізкасці з прыродай /у адрозненне ад сучасных «дзяцей цывілізацыі»/, бо яго спалучэнне з ёю і — тонкае, менавіта сваё адчуванне яе вядомыя ўсім нам, ягоным знаёмцам. Не ўяўляю сабе, каб хто-небудзь, акрамя Валодзі, вельмі стомленага ў той спякотны дзень, вось так проста спыніў бы каля мяне сваю «трынаццатку», каб толькі паказаць, якія прыгажуны-грыбы вязе ён з лесу. І такі быў у яго ў тую хвіліну твар! Нездарма ж знайшоў ён сярод сваіх калег такіх жа, улюбёных у родную прыроду, і з'яднаў іх у «асацыяцыю незайздрослівых кампазітараў».

Ён самабытны ва ўсёй сукупнасці сваіх вартасцяў і недахопаў /якія, на жаль, не заўсёды — працяг нашых вартасцяў/. Стан яго творчай душы патаемны, непрадказальны і супярэчлівы. О, ён вельмі неадназначны. Накшталт скрыні з двайным, а можа, і з трайным дном. Мне здаецца, у ім спалучаецца душа музыкі-рамантыка і дзелавая хватка селяніна; спантанная, заўсёды непасрэдная, праява эмоцый і жорсткі матэматычны разлік вынаходніка. Магу назваць па меншай меры тры «іпастасі» Валодзі Кур'яна.

ПЕРШАЯ. Энергічны загадчык музычнай часткі Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. З прафесійнай жорсткасцю /здаецца, такая рыса — неад'емная частка гэтай пасады/ можа вырашыць самую складаную задачу, звязаную з музычным бокам спектакля /ведаю гэта на ўласным вопыце, калі мне дапамаглі Валодзевы прафесіяналізм і сабранасць/. Ён вырашае, ці спрабуе вырашыць, шматлікія праблемы, «выбівае» ў Мінкульце студыю гуказапісу, даводзячы /а хіба трэба гэта даводзіць?/ неабходнасць яе для тэатра, збірае высокапрафесійны ансамбль выканаўцаў, дзе кожны валодае некалькімі інструментамі і рэдкім у наш час дарам імправізацыі ды бязмежнай, здаецца, выканальніцкай мабільнасцю.

Як знайшоў іх? Па-рознаму. З Генам Вішняковым /скрыпка і іншыя, у тым ліку «экзатычныя» інструменты/ разам вучыўся ў кансерваторыі. З Юрам Хілаўцам /гітара і іншыя інструменты/ разам «вяселлі гралі» яшчэ ў вучылішчныя гады /у каго з кампазітараў не было такой «рамантычнай» старонкі ў біяграфіі?/. Віталя Аляшкевіча /сінтэзатар/ «пасватаў», пачуўшы ў іншым ансамблі, і таксама не памыліўся. Андрэй Сапоненка /ударныя/ — адзіны з ансамбля, хто звяртаецца да Валодзі, як да старэйшага, на «Вы», — нядаўні выпускнік ММВ. Ён спадабаўся Кур'яну за тыя ж якасці, якія ўласцівыя й іншым яго ансамблістам, перш за ўсё — за адданасць справе. Але ж, паводле слоў Кур'яна, «ёсць стралкі — няма патронаў», бо зноў і зноў паўстае пытанне аб студыі гуказапісу як асноўнай умове незалежнасці тэатра ад радыё і іншых устаноў.

Зразумела, ён не толькі загадчык музчасткі, але й галоўны кампазітар у купалаўцаў. Які спектакль для яго асабліва дарагі? «Гаральд і Мод» К. Хігінса і Ж.-К. Кар'ера, дзе было шмат магчымасцяў для напісання музыкі самага рознага плана. Незабыўны, вядома, і самы першы яго спектакль, які ён «аздабляў» яшчэ ў 1984 г., — «Там і тут» Д. Кавачэвіча: вельмі цікава было паспрабаваць уявіць сабе музыку, якая існуе не толькі па гэты, але і па той бок быцця. За музыку да «Тутэйшых» Купалы ён атрымаў Дзяржаўную прэмію...

Ягоная музыка арганічная ў стылістыцы любой п'есы: і ў змрочнай псіхалагічнай драме М. Норман «Дзе пісталет, мама?», і ў вадэвілі «Ажаніцца — не журыцца» Далецкіх ды Чарота, і ў іранічнай «Таполевай завеі» М. Задорнава. А самая новая работа — у «Ідыліі» В. Дуніна-Марцінкевіча. І хоць пра тэатральную музыку можна пачуць, што галоўная яе функцыя — прыкладная /нават добра, калі яна непрыкметная і не замінае драматычнаму дзеянню/, ды менавіта музыка здатная стварыць настрой, нешта нават «дагаварыць» у драматургіі п'есы ці «падказаць» нешта, што дапаможа спасцігнуць ідэі. Але гэтак трэба ўмець зрабіць. І ён робіць. І яго тэатральная музыка ў нейкай меры /у сэнсе вобразнасці, тэатральнасці/ «перацякае» ў іншую ягоную музыку, у якой пазнаеш другі бок яго музыканцкай асобы — мастака ўдумлівага, пакутуючага. Гэта — другая «іпастась» Валодзі Кур'яна.

УСІМ, хто Валодзю ведае даўно, памятны выпадак, калі ён, захапіўшыся тэмбрам беларускіх цымбалаў, выпрасіў у свайго сябра-цымбаліста на ўсю ноч інструмент і ўсю тую ноч над ім «варажыў», адкрываючы для сябе /і для нас/ такія дзіўныя адценні гуку, такія дзівосныя спосабы здабывання яго, што каб распавесці пра гэта падрабязна, трэба было б распачынаць яшчэ адзін артыкул. Ды лепш паслухаць яго «Перазвоны» ці непаўторны Канцэрт для цымбалаў.

Дарэчы, у Канцэрце як ніколі раней поўна і арганічна адбілася сутнасць творчай натуры Кур'яна — музыкі і прыдумшчыка: спалучэнне чыста музычнай вобразнасці і глыбіні з яркай тэатральнасцю, элементамі сцэнічнага «дзейства». Уявіце, спачатку струны інструмента спавітыя стужкай з беларускім арнаментам — накшталт слуцкага пояса /што выконвае і чыста санорную ролю — сурдзіны/. Потым, «па ходу дзеяння», выканаўца развязвае, «расчароўвае», вызваляе струны ад стужкі, — ці, можа, душу вызваляе ад скутасці, як вызваляюць з палону казачную птушку, што на самай справе — скаванае жаданне палёту...

Больш «лёгкая» ў сэнсе слоўнага тлумачэння «Жураўліная песня Палесся» — прыклад увасаблення ў творчасці балючай «злабадзённай» тэмы Чарнобыля, выказанай з такой паэтычнай сілай выразнасці і нейкага ціхага, амаль патаемнага душэўнага болю, на такой дасканалай ступені прафесіяналізму, што падчас слухання камяк стаяў у горле. Спачатку, здаецца, гучыць адна доўгая-доўгая шчымлівая нота: ці то вецер, што ніяк не сціхае, ці то

ЧЫТАЮ, СЛУХАЮ, ГЛЯДЖУ

(Пачатак на стар. 9)

стрыманасці: "Хораша", а другі і прыцмокнуў бы: "Сма-ка-та!" Янкоўскі і Скрыган.

І другое, з Хоцімшчыны.

У 1919 годзе ў вёсцы Ліпаўка была створана камуна. Не проста, а з удзелам мясцовага памешчыка Смагаржэўскага. Сяляне яго паважалі. Удзельнік рэвалюцыі пятага года, быў у ссылцы. Кабыла здохне ў кагосьці — дасць грошай на другую. І лесу не шкадаваў, не караў парубшчыкаў. Выбралі старшынёй рэвізійнай камісіі. Яшчэ і дзетак вучыў, ходзячы па хутарах. Замёрз у полі, снегам замяло яшчэ жывога, дзяцюк падняў, занёс на печ, каб адышоў, але пад раніцу ён памёр.

"Мы так жалелі яго, так жалелі. **Лапцейкі** новыя сплялі і ў лапцейках пахавалі на кладбішчах, дзе ўсіх камунараў хавалі".

Так расказваў Пархуце дзед Арцёменка, удзельнік грамадзянскай, фінскай і Вялікай Айчыннай войнаў, колішні камунар.

Лапцейкі захацелася падкрэсліць, з думкай пра чалавечны падтэкст.

●

Швед Вільгельм Мобэрт, "Эмігранты", зноў жа па-польску.

Палякі выдалі толькі першую кнігу гэтай тэтралогіі, тое, дзе шведская вёска мінулага стагоддзя і марское падарожжа сялян у Амерыку. Можа, пакуль што толькі першую, а можа, і так, як у іх атрымалася з Мележам: выдалі толькі "Людзей на балоце". Так думаю цяпер, пішучы, а чытаючы ўспамінаў Іванаву першую кнігу "Палескай хронікі", якая сваёй таленавітай грунтоўнасцю, душэўнай насычанасцю належна расказвае сусветнаму чытачу пра нашу часціну бязмежнага свету так, як і трэба гаварыць ад кожнага народа, ад кожнай краіны, робячы тое, што самае галоўнае — "садзейнічаць умацаванню чалавечай агульнасці, умацаванню міру і дружбы", як я днямі чуў, працытаванае з Талстога.

●

Другі том з трохтомніка Багдановіча, яго проза, пераважна руская. Успаміналася руская проза Шаўчэнкі. Тое самае, што і над старонкамі нашага першага Максіма, пытанне: а ці поўнасцю гэта ягоны, толькі ягоны голас?.. І ў нашым, і ва ўкраінскім выпадку пра рускамоўнае можна сказаць, што яно — толькі тое, што **пры галоўным**.

І не перастаеш здзіўляцца, які ён ранні ў сваёй таленавітасці і эрудыцыі.

Чытаючы ягонае пра Шаўчэнку, успамінаў Максіма Рыльскага, як ён, і ў сваім напісаным, і ў гутарцы са мною, высока ставіў гэтыя артыкулы. А там, дзе ён пра Валадзімера Самійленку, я ўспомніў свой салдацка-нявольніцкі блакнот з вершам і гэтага паэта, выпісаным ужо не прыпомню адкуль. Бо толькі пад упісанай у той патаемны блакнот /простым алоўкам/ цудоўнай малітвы палонных запарожцаў: "Ой, визволи, Боже, нас, бідних невольників" памечана: "Грушевский, "Ілюстрована Історія України". З Самійленкам памяць мяне падвяла: верш "Я не боюсь тюрми и каты" належыць не яму, а нейкаму О. Я. Верниволоду, якога ў маім украінскім энцыклапедычным слоўніку, на жаль, няма. А Самійленкава, згадаўшы далёка-першае светлае ўражанне, ажно выпісаць хочацца, хоць толькі першую і апошнюю строфы.

Бачив я усяки перли
і коштовні самоцвіти,
але есть одна перлина,
що з усіх найкраща в сьвіти.

. . . . . .

Відібрыть ії не зможе
ніяка злоба несита,
есть вона — сльоза сьвятая,
за нещасний люд пролита.

На колькі тут у мяне ўсё па-ўкраінску — не магу сказаць, перапісваю, як было калісьці выпісана аднекуль. І сапраўды **калісьці**, бо ў верасні 1940 года, перад адпраўкай са шталага на поўначы ў шталаг на поўдні "Вяліканямеччыны".

А пра шчасце выпадковасцей, пра шляхі і сустрэчы з агульным у сапраўдным

водгукі тужлівай, некалі ў дзяцінстве чутай песні, ці то проста гук бяды і развітання... Адзін раз, другі, трэці — як тры віткі спіралі, як тры подыхі нечага страшнага, чорнага, злога, пасля чаго застаецца толькі голая зямля і жудасная цішыня, якой, на думку аўтара, можна а г л у ш ы ц ь. І твор аглушае сваёй ціхай, непазбыўнай тугой. Трагедыя sotto voce. Для мяне гэты твор нібыта працяг аднаго з ранейшых кур'янаўскіх опусаў — вакальна-сімфанічнай паэмы «Памяці маці», толькі працяг на іншым, больш высокім, больш дасканалым узроўні прафесіяналізму ды душэўнага вопыту.

Яго шлях да прафесіі кампазітара нельга вызначыць як просты й гладкі. Хапала зігзагаў і прыгод. Вехі гэтага шляху: музычнае вучылішча па класе баяна. /Я памятаю Валодзю ў той час, ягоныя вочы: якія цудоўныя ў яго былі вочы — дапытлівыя, прамяністыя! Калі думка Эжэна Дэлакруа пра тое, што «пацалунак феі» /талент/ заўсёды прыкметны на твары абранніка, слушная, дык у Валодзі гэтая абранасць свяцілася праз вочы/. Пасля арміі — Мінскі педагагічны інстытут, дзе праз год ужо адбылася прэм'ера яго рок-оперы «Масфан» — і, зразумела, аншлаг! Як узнагарода аўтару за смеласць /бо акрамя «Ісуса Хрыста» Узбера ды «Арфея і Эўрыдыкі» Журбіна, здаецца, ніводнай рок-оперы мы не ведалі/. Пасля III курса — спроба паступіць у кансерваторыю, датэрміновае /III ды IV курсы за адзін год/ заканчэнне педінстытута і з цяжкасцю здабыты дазвол /праз ліст Артура Вольскага міністру асветы/ на працяг вучобы — ужо ў кансерваторыі. Ды яшчэ ледзь не драматычны правал на экзамене па навуковым камунізме, звязаны з пытаннем пра стаўленне Кур'яна да эміграцыі Максіма Шастаковіча /не сказаў, як трэба было: асуджаю!/.

Ды і ў кансерваторыі хапала розных неспадзяванак — але ўсё гэта не датычылася заняткаў па спецыяльнасці, бо і ў класе прафесара Д. Смольскага, і на кафедры наогул, Кур'янавы талент і поспехі ні ў кога не выклікалі сумневу. І ўжо ў сценах кансерваторыі /якая тады яшчэ не была акадэміяй/ з'явіліся яго выдатныя камерна-інструментальныя творы, і першыя буйныя опусы, і, нарэшце, опера «Фантазія» паводле Казьмы Пруткова — вясёлая, дасціпная, вынаходлівая. Наогул, у ягоным характары гумар, з такім, так бы сказаць, народным адценнем — вельмі трывалая рыса, ды і ў творах сустракаюцца розныя адценні гумару — прыгадаць хаця б фартэпіянны цыкл «Тыдзень» ці вакальны цыкл на вершы Роберта Бёрнса... Але гэта ўжо — трэцяя «іпастась».

ТРЭЦЯЯ «іпастась» Кур'яна — геданістычнае адчуванне жыцця, яго паўнаты і шматграннасці. Ён часта згадвае, нават цытуе Караткевіча, ды і ў самім Валодзю ёсць нешта ад Гервасія Вылівахі з Караткевічавай «Ладдзі роспачы» — тое ж адраджэнскае светаўспрыманне, свежае й непасрэднае. Але пра гэта раскажа хто-небудзь іншы, бо для мяне бліжэй за ўсё Кур'ян «Жураўлінай песні Палесся» і Цымбальнага канцэрта, дый увогуле тых твораў, дзе ён адкрывае тое, што наканавана адкрыць у мастацтве толькі яму. Тых твораў, дзе ён — як самотны пустэльнік, што блукае па сцежках сваёй душы.

Галіна ГАРЭЛАВА

Тэатр

ВЕЛЬМІ АСАБІСТАЕ

«АДЗІНАМУ СПАДКАЕМЦУ» Ж. Ф. РЭНЬЯРА Ў РУСКІМ ТЭАТРЫ БЕЛАРУСІ — ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ

Апярэдзіўшы на гады ўсе мае тэатральныя замілаванні, перастрэўшы хаўрус сталых ужо тэатральных прыхільнасцей, «Адзіны спадкаемца» стаўся ды застаўся маёю ўлюбёнасцю: год ягонага з'яўлення на Рускай сцэне Беларусі, 1974, прыпадае на мае трынаццаць...

...У трыццаць тры, раўнютка праз дваццаць гадоў, па-за вэлюмам школьных згадак, мне выпала-такі пераканацца, што пачуццё не знікла — услед за габеленавымі аздобамі спадчыннага жытла скнары Жаронта, ля якога па-ранейшаму круціцца-вадзіцца дзея; не пайшло ўпрочкі — за элеганцкім выглядам акцёрскіх складаў, і хоць сам адзіны спадкаемца Эраст, больш пэўна, ягоны выканаўца Андрэй Душачкін не здымае, самавыкрываючыся, парык у належным месцы паводле колішняга вырашэння самога мэтра Маланкіна, ён, Эраст-Андрэй, падпарадкуючыся ці не таму самаму рэжысёрскаму вырашэнню, гэтак жа іранічна ўзіраецца... У шэрагі магчымых закаханых? Гледачоў, чыім дваццацігадовым спадкаемным зацікаўленням, падобна, няма межаў? Валерый Бандарэнка і Зінаіда Асмолава /у іншым складзе — Вольга Клебановіч/ з колішнім імпэтам разыгрываюць разліковае каханне сваіх персанажаў, Крыспена ды Лізэты, часпочас даючы зразумець, як самы трывалы разлік ніякавее перад шчырасцю сімпатыі. Аляксандр Ткачонак гэтак жа бездакорна і беззаганна разумеецца са сваім дзядзькам Жаронтам, дакляруючы закаханасцям старасці... хоць бы водгулле спачування...

Улюбёнасць, апярэдзіўшы ўсе мае тэатральныя разлікі, вядзе рэй! Нават праз дваццаць гадоў! Нават не дужа прыдаўшыся самому «Адзінаму спадкаемцу»... Яна пагражае зрабіцца... каханнем!

Жана ЛАШКЕВІЧ



На здымку: Валерый Бандарэнка /Крыспен/, Аляксандр Ткачонак /Жаронт/, Андрэй Душачкін /Эраст/, Зінаіда Асмолава /Лізэта/.

Фота Галіны МАСКАЛЁВАЙ

Анонс

75 ГОД ВІЦЕБСКАЙ МАСТАЦКАЙ ШКОЛЕ

У гэтым годзе грамадства Беларусі адзначае юбілей Віцебскай мастацкай школы, з якой звязаны імёны выдатных мастакоў, архітэктараў, мастацтвазнаўцаў не толькі беларускіх, але і сусветных. Гэта Ю. Пэн, М. Шагал, К. Малевіч, В. Ермалаева, Л. Лісіцкі, З. Азгур, А. Ахола-Вало, А. Бразер, Д. Якерсон, Я. Мінін, І. Гаўрыс, В. Волкаў, П. і Х. Даркевічы, М. Міхалап, Ф. Фогт, І. Ахрэмчык, В. Дзежыц, А. Бембель, Я. Зайцаў, А. Паслядовіч, П. Масленікаў, М. Пашкевіч, Г. Дакальская і шэраг іншых, творы якіх можна выдаваць асобнымі кнігамі і альбомамі.

Падчас юбілейных дзён спецыяльнымі камітэтамі ў Мінску і Віцебску плануюцца мастацкія выставы, навукова-практычныя канферэнцыі, шагалаўскі пленэр. Мяркуецца зняць дакументальны фільм, надрукаваць брашуру, іншыя навуковыя матэрыялы. Да падрыхтоўкі падключыліся мастакі, даследчыкі, музейшчыкі, выпускнікі віцебскай школы з Беларусі, бліжняга і далёкага замежжа.

Самае галоўнае сёння — сабраць кіна- і фотаматэрыялы, малюнкі, запісы 20-30-х гадоў. Асноўную частку работы вядзе Віцебскі мастацкі музей /дырэктар І. Холадава/, Міністэрства культуры Беларусі, юбілейныя камітэты. Канферэнцыя мае адбыцца ў сакавіку-красавіку ў Віцебску. У ёй прымуць удзел беларускія даследчыкі, а таксама госці з Масквы, Санкт-Пецярбурга.

Аргкамітэт просіць адгукнуцца ўсіх, хто можа прадставіць дакументальныя матэрыялы аб Віцебскай мастацкай школе, а таксама хацеў бы паказаць свае мастацкія творы на выставах. За дадатковай інфармацыяй звяртайцеся ў мінскі Палац мастацтваў, а таксама ў мінскі і віцебскі камітэты па правядзенні канферэнцыі.

Л. НАЛІВАЙКА

слове, можа, сказана трохі ў падтэксце?..

●

"Полными страха глазами встречал шагающую к нему смерть зайчик — этот смиренный христианин лесов и полей".

Як хораша гэта ў Пятраса Цвіркі ў яго рамане "Франк Крук", у раздзеле "Охота".

І як часта ўспамінаю гэта — пры кожнай сустрэчы з гэтым хрысціянінам на прылясной дарозе. Здалёк яшчэ спрытна, гулліва ўцякае, то ў збожжа, то ў лес. Часцей за ўсё ўранні.

●

Артыкулы Бёля пра Салжаніцына.

З нагоды 60-годдзя рускага немец піша: "Шлю прывітанні ў Вермант — яму, яго жонцы Але, дзецям і цешчы". І гэтая ў яго, калі падумаць пра арыгінал, die Schwiegermutter нагадала мне верш Ружэвіча, здаровы, мужны дыфірамб tesciowej, на якія калісьці звярнуў увагу Юзіка Сяміжона, а ён той верш удала пераклаў.

І такі /мой/ удзел у літаратурным жыцці патрэбны, важны і прыемна ўспамінаецца.

●

Жывучасць, таемнасць смеху ў Гогаля!.. Уранні, на свежую галаву, як зусім, зусім новае прыгадалася, як унтэрфіцэрская ўдава "сама себя высекла", і ад такой геніяльнай недарэчнасці я молада зарагатаў у ванным пакоі, напалохаўшы гэтым сваіх.

●

Пра неваяўнічасць у Чорнага я ўжо даўнавата друкаваў. Не памятаю, ці запісаў дзе пра Кулакоўскага, афіцэра-франтавіка, які, як баталіст, неяк па-сялянску вяла-недалужны, што мне калісьці прыкра адчулася, як рэдактару яго рамана "Расстаемся ненадоўга".

А цяпер — даўно не ўпершыню — зноў успомнілася пацешна неваяўнічае ў дарагога дзядзькі Якуба:

Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!

Нібыта на зайцоў ісці склікае.

●

Учора, пагодлівым адвячоркам, асабліва прыемным пасля вятроў і макрэчы, даўгавата, у смак лынчыўся — адзін каля вогнішча паміж старымі ліпамі пры дарозе, так успамінаючы Міхася Ціхановіча, нарачанскага вогнепаклонніка, вясёлага, людскага чалавека...

●

Добра думалася, як шчыра і плённа працуе для нашай літаратуры рускі Генадзь Кісялёў, як працавалі татарын Сцяпан Александровіч, яўрэй Рыгор Бярозкін...

●

"**Кровинушка** моя — якое прыгожае слова!" — падумала беларуская маці ў самоце, узняўшы немаладыя вочы над кніжнай старонкай.

●

Даўно пачаўшы, думаеш пра штосьці вартае запісу, але ўсё адкладаеш, як быццам з ляноты. А потым і прыходзіць як найбольш дарэчная патрэба запісаць тое нешта па суседстве з нечым іншым, і тая **нібы лянота** робіцца зразумелай самому сабе: гэта было шуканне

●

У газетах цяпер такія вострыя матэрыялы, столькі крутых сюжэтаў, драм, трагедый, што і белетрыстыкі не трэба — цікавей, вастрэй не зробіш. Можна толькі глыбей. Хто зможа.

●

Па тэлефоне падзяліўся з Вялюгіным сумненнямі па адным маім запісе ў падборцы, рукапіс якое ён чытаў. А ён змахнуў тыя сумненні, сказаўшы, што гэта ў кожнага з нас за пазухай чырвоны рэдактарскі аловак.

Як запазушны камень — супраць належнай літаратуры?

●

Пасля XX з'езда партыі **зусім не проста** было пакідаць у перавыданнях імя Сталіна, калі хто нават і шчыра славіў яго. **Рэкамендавалася** замяняць тое, раней па сутнасці абавязковае, імя іншымі — Леніным ды Партыяй, і рэкамендацыі такія ішлі ад рэдактараў, за якімі грозна маячылі гранатрады цэнзараў без двукосся і з ім...

Уладзіслаў Бранеўскі друкаваў сваю паэму пра Сталіна, апраўдваючыся тым, што пісаў яе — нават і пасля сваёй Лубянкі — шчыра. Аднак гэта ж было не ў нас, а ў Польшчы, дзе павады і лейцы папускаліся вальней.

Тое **не зусім проста** сённяшнія крытыкі павінны былі б разумець і пры ўсёй сваёй бескампраміснасці ды суперпаслядоўнасці... у адносінах да іншых.

●

На рыначнай плошчы варшаўскага Старэго Мяста — кавярня з дасціпна-дакладнай назвай "Каменнэ сходкі", дзе хораша гаспадарыць пані Аленька, удава Станіслава Пентака, паэта і празаіка "вясковай арыентацыі", які закончыў самагубствам. Не па гадах маладжава-прыгожая, талкова-энергічная, яна сама і абслужыла нас, і пасядзела з намі, а развітваючыся, трохі воддаль ад Канановічаў, Мацея і Крыстыны, якія нас пазнаёмілі, цішком сказала мне:

— Пане Янку, ва ўсёй Польшчы ніхто вам не скажа пра яго нічога дрэннага!..

Гэта — пра Мацея, добрага друга майго, маіх сяброў-пісьменнікаў у Мінску, Гродне, Брэсце, актыўнага друга нашай літаратуры.

Пані Аленька дадала:

— І наогул я, проша пана, люблю мужчын пасля сарака гадоў. Прынамсі ў твары можна штосьці ўбачыць.

Ох, як даўно ўжо гэта было — улетку семдзесят пятага!..

●

Ян Павел Другі, выступаючы з Вільні па радыё, па-беларуску і асабліва па-руску гаварыў з выразна польскім акцэнтам. Бог тут не выручае, — папу, і літаратара ды навукоўца па сумяшчальніцтве, ратуе таленавітасць і праца над сабой, чаго яму, аднак, на ўсіх усюды не хапае.

У Польшчы чуў я ў восемдзесят сёмым: "Пан Буг **ест** ўшэндзе, а ойцец свенты **был** ўшэндзе". Толькі, на жаль, не ў нас.

Хай бы ж прыехаў, засведчыў павагу да братняй мовы — хоць і з акцэнтам! У прыклад меншым айцам.

●

У "Галасах" аргенцінца Антонія Порк'я, надрукаваных у "Литературной газете", найлепш спыніла ўвагу такое выказванне, такі, як аўтар кажа, "спяваючы голас думкі":

"Таго, што не стала ўспамінам, не было..."

ФОНД «ТРАСЦЯНЕЦ» ДЗЕЙНІЧАЕ

Гісторыка-мемарыяльны фонд «Трасцянец» выступіў з ініцыятывай аб абвяшчэнні 1994 года годам памяці ахвяр вайны і генацыду, годам грамадзянскага прымірэння і згоды ў краіне дзеля будучага Бацькаўшчыны, станаўлення дэмакратычнай, незалежнай і бяз'ядзернай дзяржавы.

«Адным з самых драматычных перыядаў у жыцці краіны, — гаворыцца ў Звароце фонду да грамадзян Беларусі, Вярхоўнага Савета, урада і грамадскіх арганізацый, — стаў перыяд Другой сусветнай вайны, які прынёс народу Беларусі гора і разбурэнне. Толькі ў лагеры смерці «Трасцянец» на працягу 1942—1944 гадоў было знішчана да паўмільёна чалавек.

Па невядомых прычынах звесткі аб гэтым буйнейшым у Еўропе месцы знішчэння мірных людзей не трапілі на стол Нюрнбергскага працэсу, на якім судзілі нацысцкіх злачынцаў. Дасюль дакументы і матэрыялы, якія б маглі прыадкрыць таямніцу Трасцянецкага лагера смерці, не вывучаны да канца і раскіданы па розных архівах і сховішчах многіх краін Еўропы».

У сваім звароце «Трасцянец» звярнуўся да гісторыкаў, юрыстаў, ветэранаў вайны, былых вязняў фашызму з просьбай дапамагчы ў зборы матэрыялаў і дакументаў, якія б маглі праліць дадатковае святло на тое, што адбывалася за калючым дротам лагера смерці ў ваколіцах Мінска.

Зварот падпісалі: народныя дэпутаты Рэспублікі Беларусь Я. Цумараў, Я. Новікаў, В. Аламніеў, А. Трусаў, М. Жукоўскі, М. Жураўлёў, Л. Дзейка, загадчык партызанскага сектара Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Р. Чарнаглазава, загадчык аддзела археалогіі Інстытута гісторыі АН Беларусі М. Чарняўскі, старшыня БЗВ М. Статкевіч і іншыя, усяго 23 подпісы.

СПАТРЭБІЛАСЯ НА СТАРАСЦІ ГАДОЎ

На вуліцы Ваўковіча, што ў абласным цэнтры гор. Гродна, жыве Мікалай Канстанцінавіч Герасімаў, якому нядаўна споўнілася 82 гады. Але ён, нягледзячы на такі паважаны ўзрост, не сядзіць склаўшы рукі ў чаканні, калі прынясуць пенсію, якой хопіць хіба толькі на хлеб і ваду. Часта можна сустрэць М. Герасімава на калгасным рынку. Тут ён прадае кошыкі, ды такія, што задзівуешся. А навучыўся ён плесці іх з лазы яшчэ ў дзяцінстве. Мікалай Канстанцінавіч пляце не толькі кошыкі, але і лапці, хоць яны асаблівым попытам пакуль што ў насельніцтва не карыстаюцца.

— Хто дапамагае вам нарыхтоўваць лазовыя пруткі? — цікаўлюся ў Мікалая Канстанцінавіча.

— Сам, — адказвае ён. — Жыццё — гэта рух, а з ім прыходзіць бадзёрасць і здароўе. Лазовыя пруткі дадому прыношу на сваіх плячах. Тавар мой, мабыць, падабаецца людзям не толькі сваёй дыхтоўнасцю, але і трываласцю.

Не стрымаўся і сфатаграфаў руплівага і ўмелага чалавека.

І. БАРЫСАЎ

ЯКІМ БЫЦЬ ПРАВАПІСУ?

Гэтае пытанне, бадай, хвалюе сёння кожнага свядомага беларуса. Часам сутыкаюцца зусім процілеглыя погляды.

Як кажуць, у спрэчках і нараджаецца ісціна. Але ці толькі ў спрэчках? Можа, варта прыслухацца і да гісторыі? Гэта і робіць у брашуры «Рэформа беларускага правапісу 1933 года. Ідэалагічны аспект» Л. Лыч, вяртаючыся ў тыя часы, калі і моўнае пытанне не абыходзілася без палітычнага ўціску.

Брашура выйшла ў выдавецтве «Навука і тэхніка» дзякуючы Таварыству беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Яна папоўніла новую серыю «Наш вечны зніч».

Пераклады

ЖЫВЕ Ў СЭРЦЫ РОДНАЯ ПЕСНЯ

Элена Андрэева нарадзілася ў 1949 годзе ў Сафіі. Мае вышэйшую эканамічную адукацыю. Разам з мужам шмат падарожнічала па свеце, жыла ў Кітаі, у Нігерыі, у ЗША. Пры ўсіх жыццёвых варунках заўсёды ў яе сэрцы жыла родная песня, клопат аб лёсе Балгарыі і яе народа. Божым дарам Элене стала паэтычнае слова. Яно ратавала і лучыла з родным краем, давала магчымасць выказаць свае думкі і любоў да жыцця. Паэтцы ўдаецца ў вершах глыбока перадаць тонкі пачуццёвы свет жаночай душы. Невыпадкова паэтычная кніга, якая ў сакавіку пабачыць свет, мае назву «Пачуццёвасць». Зараз Элена Андрэева жыве ў Мінску, працуе ў пасольстве Рэспублікі Балгарыя ў Беларусі. Сённяшняя публікацыя — першае знаёмства беларускіх чытачоў з паэзіяй Элены Андрэевай.

А. К.

Элена АНДРЭЕВА

СІТА ЖЫЦЦЯ

Адсее час
дабро ад зла,
адсее час
любоў ад мукі,
страсць ад пакуты —
зноў зямля,
як немаўлят,
іх возьме ў рукі.

На сіта часу,
як на суд,
нясу
зямное ўсё насенне:
зярняткі шчасця
і пакут,
зярняткі хлеба
і збавення.

Зямная плошчь
і чалавек
узросцяць
кветку, дрэўца, колас...
І толькі ў с э р ц а х
з веку ў век
прарастае
Гасподні Голас.

СТАРАЯ ХАТА

Хаты старое
нямашака болей,
дзіцячага смеху
тут больш не пачуюць.
Стаіць белы склеп
успамінаў і болю,
любоў і разлад
вечным тленам пануюць.

Адно толькі ў снах
мяне хтосьці вяртае
ў маленства
дзіцём басаногім,
якое бяжыць,
па-над лугам лунае,
дзе травамі, кветкамі
ўбраны дарогі.

Ды нечыя рукі
падхопяць у лёце,
і зноўку пачнецца
жыццёвая дзея...
Пры сонца заходзе,
на ясным усходзе
са мною любоў,
і нялад, і надзея.

ЦЕНЬ МАЦІ

Яна ідзе ўслед
і не пакідае мяне,
да веку прысутная
і захопленая,
найсамая блізкая,—
цень мой
з воблікам маці.

Калі б можна было
даць ёй цёплы,
утульны прытулак,
супакой,
вызваленне адной
ад адное, —
але ж моцна
нябачная нас пупавіна
трымае.

...Хутка стану таксама
я мамай —
верным ценем маіх дзяцей.

ПЛАНЕТА ЛЮБОВІ

Маёй дачушцы ЭЛІЧЦЫ

Кожны мае сваю
маленькую планету,
кожны мае сваю
маленькую мару.

На донейку сэрца яна,
жывая,
з пакорай, з надзеяй чакае
зорнага поклічу, Божае ласкі.
Наўкола плывуць і раяцца
жыцці людскія і лёсы.
Ведай, дачушка,
планеты тае дасягаюць
абраныя душы
пяцічотай, пакутай...

КАХАННЕ

Здолела
да Яго дакрануцца —
не паранілася.
Здолела
да Яго прыхінуцца —
не параілася.
Я змагла
зберагчы, шанаваць —
не знясілела.
Я змагла
быць каханай, кахаць.
...Засталося мне векаваць
птушкай сіняю.

ЗАЛЕЖНАСЦЬ

Як мне пазбыцца
вярыгаў цяжкіх?
Як адрачыся сябе?
Абручамі
я закавала свой голас і слых.
І паміраю начамі
ў чорным прадонні
думак і сноў.
Свет і жыццё,
і сама я ў палоне.
Прыцемкам дня
і на досвітным лоне
прагне мой дух
вызвалення з акоў.

КАБ Я МЕЛА СІЛУ

Каб мела я сілу
адолець
сцюдзёныя вятрыскі,
суняць і суцішыць
гарачы віхор ува мне, —
я не маліла б,
я не прасіла б
з ласкі чужой
цеплыні,
я не блукала б,
я не шукала б
зацішны прыстанак; —
жыла б сама...

Пераклаў
Ала КАНАПЕЛЬКА

ВЫ ЧЫЕ, СТАРЫЯ І НЯМОГЛЫЯ?

(Пачатак на стар. 5)

Каб больш не вяртацца да тэмы харчавання ў дамах-інтэрнатах, скажу адразу, што там, дзе мне давялося пабыць, кормяць добра. Намеснік дырэктара Мінскага гарадскога тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання пенсіянераў Валянціна Іванаўна Носач, якая ўразіла мяне фенаменальнай памяццю на імёны і прозвішчы сваіх падапечных, казала мне, што, нягледзячы на пастаяннае падаражэнне прадуктаў харчавання, на рацыёне гэта не адбіваецца — ён адпавядае ўсім медыцынскім нормам па каларыйнасці, утрыманні вітамінаў і іншых неабходных рэчываў.

Вакол былі людзі, і таму я, нахіліўшыся да яе вуха, ціха спытаў: «Крадуць?». Думаў, Валянціна Іванаўна замахае рукамі і ўсклікне: «Што вы, што вы, як можна!» Яна ж паглядзела мне ў вочы і сказала: «Яшчэ як крадуць! Толькі ў мінулым месяцы за крадзеж мы звольнілі з ліку персаналу трыццаць чатыры чалавекі».

Ну, і што ты будзеш рабіць? Крадуць і будуць красці. Па-першае, таму што вельмі нізкая зарплата. Наогул, я са здзіўленнем даведаўся, што работнікі сістэмы сацыяльнага забеспячэння сярод усіх прафесій — самыя сацыяльна безабаронныя. Гучыць як каламбур. Але факт застаецца фактам — па ўзроўні зарплаты яны на апошнім месцы ў рэспубліцы. У лістападзе мінулага года яна складала ў сярэднім 66395 рублёў. Для параўнання — 89 тысяч у культуры і 97 тысяч у галіне фізкультуры і спорту, якія таксама ў гэтай справе лічацца аўтсайдэрамі. Гэта, як я сказаў — па-першае. Па-другое — такая традыцыя. Каб пры цане масла больш як 12 тысяч рублёў за кілаграм паварыха ці раздатчыца не кінула сабе ў сумку трыста-чатырыста грамаў таго масла? Ды яна ж сябе перастане паважаць! Жартую? Так, але горкі атрымаўся жарт.

Цэнтр гэты нечым асацыіраваўся ў мяне з біблейскім Ноевым каўчэгам. Не ў сэнсе зручнасцей /уяўляю, як пакутаваў Ной у перанаселеным сваім караблі/, — наадварот, жывуць мясцовыя насельнікі нават яшчэ у лепшых умовах, чым іх «калегі» ў Лагойскім доме-інтэрнаце. Тут амаль у кожнага свой асобны пакой, дзе і тэлевізар, і халадзільнік, і дываны на сценах. А ў тым сэнсе, што жыве тут самы розны люд. Як зазначыла Валянціна Іванаўна — ад 18 да 100-гадовага ўзросту. З 320 насельнікаў Цэнтра больш за сто — так званыя «калясачнікі», пераважна інваліды дзяцінства, якія ў вялікім свеце аказаліся нікому непатрэбнымі і якім наканавана, відаць, да скону дзён /сярод іх нямала і маладых людзей/ калясіць на сваіх калясках па даўжэзных змрочных калідорах гэтага інтэрната /дарэчы, вельмі архітэктурна непрывабнага, узведзенага ў балоцістай нізіне, з-за чаго ўвесну тут, бывае, трэба адкачваць з падвалаў ваду/.

Больш за сотню жыхароў інтэрната не падымаюцца з ложкаў, тут іх і кормяць, і поюць, і абмываюць, і г. д.

Жыве ў «каўчэгу» і каля дзесятка былых зэкаў, якія, адбыўшы свае тэрміны, апынуліся на волі, часам, ужо ў сталых пенсійных гадах, не маючы ні жонкі, ні дзяцей, ні даху над галавой. Звычак сваіх турэмных яны не пазбавіліся і часта наганяюць страху на ціхіх мясцовых абарыгенаў.

Мы сядзелі з Валянцінай Іванаўнай у яе кабінеце, калі раптам без стуку туды ўваліўся высокі пажылы мужчына і, ледзь трымаючыся на нагах, пачаў брудна абражаць жанчыну. На працягу ўсяго ягонага п'янага маналогу В. Носач не вымавіла ні слова, сядзела збялелая, сціснуўшы зубы. Я шчыра спачуваў ёй. І толькі калі дэбашыр выйшаў, бразнуўшы дзвярыма, Валянціна Іванаўна, глыбока ўздыхнуўшы, растлумачыла, што гэта адзін з былых зэкаў, які не «прасыхае», вынес і прадаў на выпіўку ўсё, што было ў пакоі. Засталася адна дыванова дарожка, якую быў таксама намерыўся вынесці, ды яна загадала тую дарожку ў яго забраць. Вось ён і прыйшоў скандаліць.

Начальнік аддзела Міністэрства сацзабеспячэння А. Гардзееў, якому я расказаў пра гэты выпадак, пагадзіўся, што разам з усімі такую спецыфічную публіку сяліць, вядома, не трэба было б, але іншага выйсця няма. «Спадзяюся, гэта не надоўга, — казаў ён. — У Капылі будуецца дом-інтэрнат на 50 месц спецыяльна для асоб, якія вярнуліся з месцаў зняволення і па сваім сацыяльным статусе могуць быць туды змешчаны».

Ды — хопіць пра іх. Хачу, карыстаючыся выпадкам, пагаварыць пра іншае.

Зноў вяртаюся ў думках у дамок Надзеі Пятроўны Жалабковіч. Нехта з нас спытаў, чаму б ёй не пераехаць у Лагойскі дом-інтэрнат, каб не пакутаваць у адзіноце. На вочы жанчыны адразу нагарнуліся слёзы, і яна, паківаўшы галавой, ледзь чутна вымавіла: «Не паеду, тут мая хата, тут я і памру». Яе апякунка Г. Жалабковіч зрабіла нам знак рукой: маўляў, не заводзьце такіх размоў, старая разнервуецца.

Мне потым расказвалі работнікі сацыяльнай службы, што многія, нават зусім бездапаможныя дзядулі і бабулі, успрымаюць пераезд у дом-інтэрнат як асабістую трагедыю, крушэнне ўсіх надзей, якімі чалавек жыве да самага скону.

Успамінаю адну п'есу, па ходу дзеі якой сустракаюцца былыя суседзі па вялікай камунальнай кватэры і ўспамінаюць тое жыццё, як цудоўны сон. Было ва ўсім гэтым нешта фальшывае, бо адчувалася, што напісаны твор на патрэбу дня, менавіта для ўслаўлення духу калектывізму. А чалавек — істота сугуба індывідуалістычная. Са сваёй толькі яму ўласцівай псіхікай, сваім характарам, норавам, звычкамі, сімпатыямі і антыпатыямі. І вось надыходзіць момант, калі з-за жыццёвых абставін, я б сказаў, трагічных жыццёвых абставін, старога чалавека адрываюць ад усяго, што было яму міла і дорага, да чаго ён прывык, прыкіпеў сэрцам /а гэта можа быць нават ложак, на якім праспаў дзесяткі гадоў/, і перавозяць туды, дзе яму наканавана спаць, як спяваецца ў вядомай песні «Дом састарэлых», на казённых прасцінах, есці з казённага посуду. І хоць мо і сытна, але — далёка не кожнаму ў радасць.

Барані Божа, каб мяне западозрылі ў непрыязі да інстытута, як гаварылі да рэвалюцыі, «общественного призрения», а цяпер — сістэмы сацыяльнай дапамогі. Адно хацелася б, каб людзі, трапіўшыя ў іх улонне, не адчувалі сябе няшчаснымі, каб адаптацыя іх да новага жыцця праходзіла не так хваравіта. Бо памятаю расказы некаторых насельнікаў Мінскага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання пенсіянераў. Пачыналіся яны амаль аднолькава: «Трапіўшы сюды, першыя месяцы я дзень і ноч плакала, не хацелася есці, не хацелася ні з кім размаўляць». Асабліва пакутуюць старыя, якіх памясцілі ў інтэрнат уласныя дзеці /а такіх выпадкаў, заўважым, нямала/.

Праблема адаптацыі насельнікаў дамоў-інтэрнатаў існуе, я чытаў, ва ўсім свеце. Але ў той жа Швецыі, напрыклад, за кожным чалавекам у такім інтэрнаце замацавана асобная медсястра, яго рэгулярна наведвае псіхааналітык. Разумею, што ў адносінах да нас гэта гучыць нерэальна. І ўсё-такі мець у штаце дома-інтэрната псіхолага ці псіхатэрапеўта /як у спартыўнай камандзе/ неабходна. Нідзе няма такой патрэбы ў псіхалагічнай службе, як тут.

... Я ПРЫСВЯЦІЎ гэтыя нататкі людзям, якія, па трапным народным выразе, ужо кіруюцца з «кірмашу». Дэмаграфічная сітуацыя амаль ва ўсім свеце характэрная няспынным павелічэннем гэтай часткі грамадства. Але ў многіх цывілізаваных краінах яна ці не самая прывілеяваная, у нас жа — ці не самая абяздоленая. Пад заслону назаву яшчэ пару лічбаў. У снежні мінулага года сярэдняя пенсія па рэспубліцы склала 63 тысячы рублёў. Сярэдняя. Сотні тысяч грамадзян атрымліваюць менш. 57277 чалавек вымушаны жыць, не, дакладней існаваць, на так званую сацыяльную пенсію, якая складала палову існуючай у рэспубліцы мінімальнай зарплаты, г. зн. — 10 тысяч рублёў /з 1 студзеня гэтага года — 15 тысяч/.

Што можна да гэтага дадаць?

Міхась ЗАМСКІ,
які таксама ўжо кіруецца з «кірмашу».

УЧАРАШНЯЕ І СЁННЯШНЯЕ

Барыс САЧАНКА

•

Быццам і нямала напісана і сказана пра жахлівыя сталінскія часы, рэпрэсіі і гулагі, расстрэленых і недастрэленых. І ўсё ж напісана і сказана далёка не ўсё. Вось выйшла новае выданне анталогіі беларускай паэзіі. Першы том яе заканчваецца творамі Міхася Ганчарыка і Міхайлы Грамыкі, аўтарамі, якія былі, як паведамляецца ў адной з біяграфічных даведак, «беспадстаўна абвінавачаны ў т. зв. нацдэмаўшчыне» і высланы за межы БССР. Другі том адкрываецца Міхасём Чаротам, які быў у «1937 г. асуджаны». А там і пайшлі адзін за адным «расстрэленыя» і «недастрэленыя» — Макар Краўцоў, Уладзімір Жылка, Уладзімір Дубоўка, Нічыпар Чарнушэвіч, Язэп Пушча, Анатоль Вольны, Тодар Кляшторны, Наталля Арсеннева, Мікола Хведаровіч, Алесь Дудар, Уладзімір Хадыка, Алесь Вечар, Юрка Гаўрук, Янка Бобрык, Янка Туміловіч, Андрэй Александровіч... Усіх не пералічыш — можна называць і называць... Дык гэта ж імёны вядомых паэтаў! А колькі было знішчана маладых, тых, хто толькі-толькі пачынаў тварыць, надрукаваў ці не паспеў надрукаваць першыя свае вершы і, вядома ж, не трапіў у гэтую анталогію.

Такі самы сумны пералік «расстрэленых» і «недастрэленых» быў бы, калі б выдаваліся анталогіі прозы, крытыкі, драматургіі ды і любога іншага жанру літаратуры... І ў галаву міжвольна зноў і зноў прыходзяць бессмяротныя радкі з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка»:

Колькі талентаў звялося,
Колькі іх і дзе ляжыць
Невядомых, непрызнаных.
Неаплаканых нікім,
Толькі ў полі адспяваных
Ветру посвістам пустым!

А яшчэ ж і цяпер знаходзяцца такія, у каго паварочваецца язык гаварыць, нібыта самі беларусы адмовіліся ад сваёй мовы... Ды нас жа стагоддзямі адвучвалі ад яе, галовы адсякалі тым, хто не выракаўся ўсяго роднага, хацеў шчыра служыць Бацькаўшчыне, народу...

•

Старшыня Беларускага саюза савецкіх пісьменнікаў М. Клімковіч, выступаючы ў Маскве на Першым Усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў /жнівень, 1934 г./, гаварыў, што «нацыяналісты з «Узвышша», «создавая эту организацию, бахвалились, что «Узвышша» — это такой Парнас белорусской литературы, который «увидят века и народы». Парнас оказался настолько низким качественно и мизерным количественно, да к тому ж настолько покрыт был националистическими окопчиками, что скрыть его до основания после проведенного партией генерального обстрела всех позиций националистов большого труда не составляло. К чести левого крыла «узвышенцев» /Крапива, Чорный, Глебка/ надо сказать, что они помогли БелАПП проделать эту операцию».

«Аперацыя» праводзілася на працягу некалькіх гадоў паслядоўна, мэтанакіравана. І сляды яе /вядома, не ўсе/ знайшлі адлюстраванне на старонках друку тых часоў, у тым ліку і ў органе самога літаратурна-мастацкага згуртавання часопісе «Узвышша». Ужо ў першым нумары за 1930 год друкуецца артыкул «Пралетарскім шляхам» /ім пачынаецца часопіс/, у якім сцвярджаецца, што «гэты нумар з'яўляецца ў пэўнай меры пераломным нумарам, што азначае і пералом ў працы ўсяго згуртавання. Пералом гэты наспяваў паступова», «гэты пералом — з'ява зусім заканамерная» і абумоўлены ён гістарычным этапам, на якім знаходзілася ў той момант «пралетарская рэвалюцыя па шляху да сацыялізму» і «клясавай прыродай саміх сяброў згуртавання «Узвышша». Расказаўшы чытачам пра поспехі «пралетарскай рэвалюцыі па шляху да сацыялізму», «клясавае змаганне, якое ўпарта вядзецца ва ўсіх галінах грамадскага жыцця», неаднароднасць паходжання беларускіх пісьменнікаў /«большасць іх — выхадцы з бядняцкіх і серадняцкіх слаёў сялянства»/, асудзіўшы «нашаніўскія традыцыі» старэйшага пакалення пісьменнікаў з іх ідэаламі «самастойнай, незалежнай дзяржавы, з іх імкненнямі больш назад, як наперад, да часоў Вялікага княства Літоўскага, з іх ідэалізацыяй «залатога веку» ў развіцці беларускай культуры /часы Скарыны/, аўтары /ці аўтар?/ пераходзяць да крытыкі тэорыі і практыкі працы самога згуртавання, творчасці яго членаў. Як пэўны вынік перагляду «свайго шляху», выкрыцця «сваіх памылак і карэнняў», належных ацэнак «гэтых памылак і асуджэнні іх перад грамадствам», падаецца пастанова згуртавання, у якой прызнаецца, што «яно дапусціла шэраг палітычных памылак, публічна іх не крытыкавала, што аб'ектыўна адхіляла ад правільнай лініі» Якія ж канкрэтна былі зроблены «Узвышшам» памылкі? Яны прааналізаваны ў пастанове, і спыняцца на іх не варта, бо калі паглядзець на іх з пазіцый сённяшняга дня, дык гэта ніякія не памылкі, а хутчэй дасягненні ці выдаткі творчасці, росту маладых талентаў.

З гэтага нумара /І, 1930 г./ з часопіса знікаюць адзін за адным яго пастаянныя сталыя аўтары, многія з іх арыштоўваюцца і высылаюцца ў Сібір. З'яўляюцца на старонках «Узвышша» новыя імёны, што неслі ў сваіх творах «пралетарскі змест», а некаторыя з тых, хто раней радаваў чытачоў, станавіліся ў «шэрагі пралетарыяту» і «шляхам свае творчасці актыўна змагаліся з ворагамі пралетарыяту». Сярод апошніх былі Крапіва, Чорны і Глебка — тыя, што «помогли БелАПП проделать эту операцию», гэта значыць, ліквідаваць згуртаванне. Калі К. Чорны ўносіў «пралетарскі змест» у свае мастацкія творы і тым самым быццам нікому асабліва не шкодзіў, акрамя хіба самому сабе, дык, робячы тое самае, К. Крапіва і П. Глебка яшчэ ўзяліся і за напісанне крытычных артыкулаў, у якіх не толькі паспрабавалі абяліць сябе, але і адрачыся ад былых сваіх сяброў і паплечнікаў — У. Дубоўкі, Я. Пушчы, А. Бабарэкі, асудзіць, выкрыць як заклятых і закаранелых ворагаў. Так, у артыкуле «Узвышша» на новым шляху» /«Узвышша», N 1, 1931 г./ К. Крапіва пісаў: «Падзеі мінулага году паказалі, што і памылкі «Узвышша» не былі ў значнай сваёй частцы ўласна памылкамі, а свядомым правядзеннем нацыянал-дэмакратычнай часткай «Узвышша» пэўнай нацыянал-дэмакратычнай лініі... Раскрыццё органамі АДПУ контррэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай арганізацыі было моцным штуршком, дзякуючы якому згуртаванне «Узвышша» канчаткова вызвалілася з-пад уплыву ўзвышанскіх нацыянал-дэмакратаў, канчаткова адмежавалася і рашуча асудзіла контррэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм і нацыянал-дэмакратычную лінію, якую праводзіла правая частка «Узвышша». На гэтым К. Крапіва не спыніўся, ён пайшоў далей, выклаў цэлую праграму, як, на яго думку, павінна б было весціся наступленне на былое «Узвышша»: «Каб зрабіць рашучы крок па шляху да пралетарскай літаратуры, ачышчанаму ад контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, літаратурнаму згуртаванню «Узвышша» патрэбна грунтоўна разгледзець і ацаніць як тыя прынцыпы, якія былі паложаны ў аснову працы старога «Узвышша», так і тыя факты літаратурна-мастацкай публіцыстычнай творчасці, якія з'яўляюцца фактамі правядзення ў жыццё нацыянал-дэмакратычнай лініі». І сам даў прыклад, як гэта трэба рабіць, разабраўшы «нацыянал-дэмакратычную сутнасць «Тэзісаў», на грунце якіх утварылася «Узвышша» і якія «замянялі сабою палітычную і мастацка-творчую платформу, на грунце якое «Узвышша» развівала сваю чыннасць». К. Крапіва выказаў незадаволенасць пастановай, якая была надрукавана ва «Узвышшы» год назад, палічыў, што «факты шкоднай для пралетарыяту творчасці ахарактарызаваны і асуджаны ў пастанове нядосыць рашуча» і даў свае ацэнкі і асуджэнне творчасці У. Дубоўкі, Я. Пушчы, А. Бабарэкі... Падключыў ён і новыя творы і імёны, напрыклад, «Запіскі Самсона Самасуя» А. Мрыя, дзе «аўтар замест таго, каб накіроўваць гастрыё сатыры на тыя ненармальныя з'явы ў нашай сапраўднасці, якія перашкаджаюць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, высмейвае працу савецкіх устаноў і арганізацый цалкам і гэтым у пэўнай меры салідарызуецца з тымі паклёпамі, якія ўзводзяць на савецкую ўладу ворагі дыктатуры пралетарыяту». К. Крапіва жорстка крытыкуе і рэдакцыйны артыкул «Пралетарскім шляхам» /«Узвышша», N 1, 1930/, бо ў ім, на думку пісьменніка, «памылковым» з'яўляецца, па-першае, сцвярджэнне, што ўсе члены згуртавання «Узвышша» ў пачатку сваёй творчасці «сталі на рэвалюцыйны шлях», і яшчэ больш памылковым з'яўляецца сцвярджэнне, што члены згуртавання «Узвышша» «не сыходзілі з ранейшай рэвалюцыйнай пазіцыі. Гэтыя сцвярджэнні сведчаць аб нерашучасці рэдакцыі ў ацэнцы творчасці членаў «Узвышша», аб тым, што самакрытыка яшчэ не пастаўлена была на належную вышыню, аб імкненні ў той ці іншай меры стушаваць адмоўныя моманты ў працы згуртавання, прыкрыць тую дыферэнцыяцыю, якая ў той час адбывалася ва «Узвышшы».

Яшчэ больш рашуча выступіў супраць самога згуртавання «Узвышша» і ўсіх былых сваіх сяброў і паплечнікаў П. Глебка. У вялікім артыкуле «Нацдэмаўшчына, замаскаваная марксісцкай фразай /Пра літаратуразнаўчую працу Бабарэкі/», які быў змешчаны ў двух нумарах часопіса /«Узвышша, N 2 і N 3, 1931 г./, аўтар даў негатыўную ацэнку не толькі творчасці А. Бабарэкі, а фактычна зрабіў перагляд творчасці ўсіх беларускіх пісьменнікаў як паслярэвалюцыйных, так і дарэвалюцыйных, не пашкадаваўшы нікога, усім прыпісаў самыя розныя грахі і правіннасці — К. Тураўскаму, Ф. Скарыне, Дуніну-Марцінкевічу, Ф. Багушэвічу, М. Багдановічу, А. Гаруну, Ядвігіну Ш. і г. д. Асаблівая ўвага, вядома ж, удзелена была «узвышэнцам» — У. Дубоўку, Я. Пушчу, А. Бабарэку... Закончыў свой артыкул П. Глебка такім вывадам: «Нацыянал-дэмакратызму ва ўсіх галінах грамадскага жыцця, у тым ліку ў літаратуры нанесены моцны ўдар, але ж дарэшты нацыянал-дэмакратызм яшчэ не знішчаны, карэнні яго не выдраны. Адгэтуль задача — не паслабляць змагання з нацыянал-дэмакратызмам як у грамадскім жыцці, так і ў літаратуры. Канкрэтна перад марксісцкаю крытыкай стаіць задача — узяць пад бязлітасны агонь нацыянал-дэмакратычныя падручнікі па літаратуры, паасобныя працы і артыкулы, бо аж дагэтуль на гэты вучастак літаратурнага фронту найменш было накіравана агню пралетарскай крытыкі».

Такі агонь неўзабаве быў «накіраваны» — Бэндэ, А. Кучарам, М. Аляхновічам, А. Канакоціным і іншымі ім падобнымі. Не толькі на крытыку, а на ўсю беларускую літаратуру, культуру, навуку, мастацтва. Ён, гэты агонь, вёўся бязлітасна, шалёна да самых апошніх часоў. Ды і цяпер вядзецца некаторымі аўтарамі, а то і пэўнымі органамі друку...

•

Тыя, хто будзе даследаваць літаратурны працэс 20—30-х ды і пазнейшых гадоў, не павінны абысці маўчаннем можа быць і не надта прыкметны, але па-свойму цікавы факт — ліст Максіма Гарэцкага ў рэдакцыю газеты «Савецкая Беларусь» ад 4 красавіка 1928 г. Вось яго поўны тэкст:

«Паважаны т. рэдактар!

У N 5 «Літаратурнага дадатку» да «Савецкай Беларусі» /31 сакавіка 1928 г./ надрукавана ў хроніцы нататка аб артыкуле нейкага М. Г. у украінскай газеце «Діло». Нататка гэтая напісана так, што неасвядомленыя чытачы могуць падумаць, быццам у ліку беларускіх пісьменнікаў, якіх аўтар артыкула ставіць «на адну дошку з Янкам Купалам і Якубам Коласам», ёсць гэткія «мяшчане ў літаратуры», што даюць некаму весткі аб беларускай літаратуры, карысныя толькі дзеля іх персанальна, або нават у сваіх крытычных артыкулах самі сябе хваляць. Дык прашу надрукаваць у адным з бліжэйшых нумароў «Савецкай Беларусі», што ў жыцці паказаных пісьменнікаў і наогул у вядомай гісторыі беларускае літаратуры і крытыкі ніколі нічога падобнага не было, і я пэўны, што не будзе, а калі апошнім часам у беларускіх літаратурных спрэчках здараліся выпадкі несумленнага хавання пад псеўданімы ці нават ніколі даўней не чутага свядомага карыстання чужымі ініцыяламі, дык гэта былі толькі дробныя, сапраўды мяшчанскія выбрыкі, якіх, пры належнай увазе з боку рэдактараў, натэўна больш не будзе. Не чытаўшы артыкула М. Г., цяжка сказаць, ці ёсць тут правакацыя ў адносінах да майго імя, але мушу заявіць, што абсалютна нічога супольнага з гэтым М. Г. я, вядома, не маю.

Мімаходам, яшчэ адна папраўка. У N 78 «Савецкае Беларусі» /1 красавіка 1928 г./ напісана, што знойдзены дакументы, быццам паэма «Тарас на Парнасе» «з'яўляецца творам нейкага Арцёма Вярыгі-Дарэўскага». З кнігі акад. Е. Ф. Карскага «Белорусы» том III, частка III, і з маёй «Гісторыі беларускае літаратуры» відаць, што гэты «нейкі» ёсць вядомым беларускім пісьменнікам 19-га веку.

Прашу іншыя газеты і журналы перадрукаваць.

Максім Гарэцкі.

4.IV.1928 г.

Горкі».

На ліст Максіма Гарэцкага своеасабліва прарэагавала Аршанская філія «Маладняка». У выпісцы з пратакола яе агульнага сходу ад 10 красавіка 1928 г., што была змешчана ў часопісе «Аршанскі маладняк» /N 7/, гаварылася:

Слухалі: Аб літаратурным дадатку да «Савецкай Беларусі» N 5.

Пастанавілі: Перадрукаваць ліст Максіма Гарэцкага, змешчаны ў газеце «Сав. Беларусь» ад 7 красавіка 1928.

Лічыць неабходным рашуча звярнуць увагу пралетарскага грамадства на тыя злосніцкія ананімныя інсінуацыі, якія часам дапушчаюцца на старонках нашае прэсы.

Пара скончыць абзываць пісьменнікаў «мяшчанамі, борзапісцамі, контррэвалюцыянерамі» і т. д. з мэтаю ўтаптаць іх у гразь дзеля персанальнае альбо гурткавое выгады.

Трэба змагацца не лаянкай, а аб'ектыўнымі доказамі, адкрыўшы твар перад масай, а не лякліва схаваўшыся за чужую спіну альбо за псеўданім.

Аршанская філія «Маладняка».

•

Некалькі разоў звярталіся да мяне напісаць успаміны пра Уладзіміра Дубоўку. Хоць быццам і сустракаліся мы з ім часта, вялі самыя розныя шчырыя размовы і адзін на адзін і на людзях, а ўсё ж для ўспамінаў гэтага мала. Чуў я Уладзіміра Дубоўку на адным з абмеркаванняў у Саюзе пісьменнікаў, калі ён павучаў даследчыцу роднай літаратуры, якая яму, Дубоўку, прыпісала ў сваёй працы такія грахі, якіх і следчыя ГПУ яму не прад'яўлялі. Колькі з'едлівасці, падкусу было ў яго словах, якая пры гэтым была праяўлена выхаванасць, культура! Чытаў я і судовую справу гэтага аднаго з лепшых нашых паэтаў 20—30-х гадоў, яго пісьмовыя паказанні... Ні слова дрэннага пра сябе, сваю творчасць, ні слова нагавору ці абразы пра каго б там ні было са сваіх сяброў. Быццам не ў трыццаць першым годзе тое пісалася, а сёння, у нашыя посткамуністычныя часы. Ды калі б паводзілі сябе так усе беларускія пісьменнікі, супрацоўнікам ГПУ не было б чаго рабіць, не было б каго арыштоўваць і судзіць...

Шчыры, сумленны быў паэт і чалавек Уладзімір Дубоўка! І ані не цярпеў маны, пралаз, людзей ілжывых і хцівых, тых, хто на няшчасці іншых будаваў сваё шчасце, славу. Пра гэта сведчыць і верш, напісаны Уладзімірам Дубоўкам за паўгода да сваёй смерці і прысвечаны аднаму нашаму паэту:

Падобны з твару да машчэй,
А па душы даўно нябожчык,
Ты жыў яшчэ, стары кашчэй,
Усё мінаеш хату з дошчак.

Жывеш і сохнеш — мільянер!
Адхватчык прэміяў і лаўраў,
Абы накалупаўся верш,
Адразу ладзіш гром літаўраў.

Да славы рупны чалавек,
Гадуеш крытыкаў прысенак:

(Працяг на стар. 14-15)

АХ, БЕНЕФІС, БЕНЕФІС...

На пачатку года ў Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі прайшоў бенефісны спектакль, прымеркаваны да юбілею салісткі тэатра Ніны Равінскай. Напэўна, гэты вечар пакладзе пачатак адраджэнню старой тэатральнай традыцыі, калі ў гонар выдатных артыстаў наладжваліся іх бенефісы. З удзелам Н. Равінскай была паказана «Марыца» І. Кальмана, дзе ў артысткі — яркая, насычаная камізмам характарная роля.

Пасля заканчэння спектакля на сцэну падняліся прадстаўнікі кіраўніцтва тэатра, Міністэрства культуры, упраўлення культуры гарвыканкама і СТД, каб павіншаваць Н. Равінскую. Гэтая цырымонія магла адбыцца і без гледачоў, але тады не была б такой запамінальнай. Ды гледачам было вельмі цікава: ніхто, нягледзячы на даволі позні час, не пакінуў сваё месца.

Заслужаная артыстка Расіі Н. Равінская ў нашым тэатры музычнай камедыі — з дня яго заснавання. Атрымаўшы вакальную адукацыю ў Расіі, там спачатку й працавала, ужо ў 26-гадовым узросце атрымаўшы ганаровае званне. Будучы вядучай салісткай тэатра ў Валгаградзе, яна не вагаючыся прыехала ў Мінск, горад свайго дзяцінства /Ніна Антонаўна — дачка рэпрэсаванага ў 30-х роднага брата кампазітара М. Равенскага/. І разам з трупай падзяліла ўсе нягоды навастворанага тэатра, які доўгі час не меў свайго памяшкання.

На Беларусь яна прыехала ўжо сталым майстрам, і маладыя салісткі пераймалі ад яе багаты сцэнічны вопыт.

Зоя ЛЫСЕНКА

На здымках В. СТРАЛКОЎСКАГА — Н. РАВІНСКАЯ ў спектаклі «Марыца» і падчас віншавальнай цырымоніі.

ВЫЙГРАЮЦЬ — ДЗЕЦІ

На ўсе грошы ад дабрачыннага аўкцыёна, праведзенага Аб'яднаннем жонак дыпламатаў, акрэдытаваных у Мінску, мяркуецца закупіць лекі для Рэспубліканскага дзіцячага анкагематалагічнага цэнтра.

На аўкцыёне былі выстаўлены творы беларускіх мастакоў, адабраныя кіраўніком галерэі «Брама» мастацтвазнаўцам Ларысай Фількенштэйн. Падзея адбывалася ў памяшканні альтэрнатыўнага тэатра, які, сумесна з Мінскім клас-клубам, дапаможа вырашыць і некаторыя іншыя арганізацыйныя пытанні. Але асноўныя клопаты дасталіся самім жонкам дыпламатаў, якія задумалі такі аўкцыён — жонцы ізраільскага пасла Авіве Валк і жонцы турэцкага пасла Леміс Акандан. Аб'яднанне жонак дыпламатаў было створана каля года таму. Гэта не проста свецкая арганізацыя. Яе мэта — нефармальна спрыяць умацаванню сяброўскіх сувязей паміж Беларуссю і замежнымі дзяржавамі.

УЧАРАШНЯЕ І СЁННЯШНЯЕ

(Пачатак на стар. 13)

Кубло Пшырковых і Казек,
Рой Скрыганоў і Барысенак.

А шмат каго папрыбіраў,
Каб на шляху не заміналі,
І вышаў суха з мокрых спраў
Ды выстукаў яшчэ медалі.

Ты страціў бы і зрок і слых,
Калі б судзіць цябе з'явіцца
Маглі Сымон Баранавых,
Макар Шалай, Сымон Куніцкі.

Іх без віны і без пары
Бяда змяла ў апошні вырай.
Ці не дарма твае сябры
Былі з табой занадта шчыра.

За крыўды, зробленыя ўсім,
Хто не вярнуўся з бездарожжа,
Стаўляеш часам, хоць над кім,
Слупок з вянком на агароджы.

Наўзрыд над памяццю ахвяр
Равеш, як прыпадаюць даты,
І кажаш так: іх мёў пажар,
У тым ніхто не вінаваты.

Ты думаеш, згубіўся знак,
Забыты словы, сцёрты крокі,
І час мінуў, і сведак брак? —
А я, а бог, а свет шырокі?

Знаўця ў людзей не адбярэш,
Як ты ні ўпраўны на расправы,
Ды захлынешся ўрэшце рэшт
Сваёю славаю крывавай.

Правін не змесціш на гарбе,
На шыю зві сабе вяроўку.
Без прывітання да цябе,
З труны
Уладзімір Дубоўка.

П. С.

Чаму з труны? Апаскі менш,
Хачу крыху пажыць сягоння,
А то без часу ў жвір сапхнеш,
Як гэты верш цябе дагоніць.

Калі ж адвееш ты, як дым,
Мой запавет наконт вяроўкі,
Свет здзейсніць сам, свет мае чым...
Клянуся барадой Дубоўкі.

Жнівень, 1975.

●

У сярэдзіне шасцідзесятых гадоў з групай пісьменнікаў я наведаў удаву Касянкову — жонку пісьменніка Міхася Зарэцкага. Апавядаючы пра даваеннае жыццё, яна ўспомніла невядомае мне тады імя Міколу Цэлеша — ён, гэты чалавек, калі арыштавалі Міхася Зарэцкага, быццам прыехаў да іх на кватэру і праз вокны выкідваў усё, што было ў хаце — ачышчаў сабе жыллё, каб пасяліцца.

— А потым, у вайну, як прыйшлі немцы, прадаўся ім, — гаварыла жонка Міхася Зарэцкага, абураная тым, што ведала.

Мінула некалькі гадоў, і прозвішча Міколы Цэлеша я пачуў зноў, гэты раз ад Максіма Танка, галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», дзе я тады працаваў. Максім Танк, вярнуўшыся з Нью-Йорка, куды ездзіў на сесію Генеральнай Асамблеі ААН, зайшоў у аддзел прозы і перадаў мне цэлы стос надрукаваных на машынцы на тонкай — не нашай, савецкай — паперы апавяданняў.

— Калі ласка, прачытайце і выберце што-небудзь для друку, — сказаў ён. — З аўтарам гэтых твораў я сустракаўся там, за акіянам.

— Як яго прозвішча? — пацікавіўся я.

— Мікола Цэлеш, ён друкаваўся ў «Полымі». Да вайны. Цяпер жыве ў ЗША.

Я прачытаў апавяданні. Не скажу, каб яны мне надта спадабаліся. Але некалькі з іх — лепшых — я выбраў, падрыхтаваў да друку. Неўзабаве яны былі змешчаны ў адным з нумароў часопіса. Праўда, не пад сапраўдным прозвішчам аўтара, а пад псеўданімам. Здаецца, Пралескас.

Яшчэ праз нейкі час Максім Танк даў мне ліст, надрукаваны на той самай тонкай замежнай паперы.

— Гэта той самы Мікола Цэлеш прыслаў, — сказаў Яўген Іванавіч. — Прачытайце...

Я прачытаў. Мікола Цэлеш выкладаў умовы, паводле якіх ён згадзіўся б пераехаць жыць на Бацькаўшчыну, у Беларусь. Галоўнымі з іх былі змена таталітарнага рэжыму, наданне Беларусі сапраўднага суверэнітэту, незалежнасць ад Масквы...

— Ну як? — падміргнуў мне Яўген Іванавіч і, не чакаючы, што я яму адкажу, спытаў: — Дзе тыя апавяданні, што я вам даваў?

Апавяданні Міколы Цэлеша — цэлы стос — ляжалі ў мяне ў шуфлядзе стала.

— Прынясіце іх мне. Усе.

Я схадзіў у аддзел прозы, забраў апавяданні, аддаў іх галоўнаму рэдактару. І забыўся на Міколу Цэлеша. Прынамсі, пакуль не трапіла мне ў рукі кніжачка яго апавяданняў, што выйшла ў 1965 г. у Нью-Йорку. Называлася яна «Дзесяць апавяданняў». Асаблівага ўражання на мяне яна не зрабіла. Так, апавяданні былі напісаны прафесійна, з веданнем рэалій жыцця, праўдзіва. Але была ў іх нейкая як бы адчужанасць, халоднасць. Ды і думка была іншы раз_так схавана, што незразумела было, чаму аўтар браўся пісаць той ці іншы твор. Трапілася мне некалькі даваенных нумароў часопіса «Полымя рэвалюцыі» з аповесцямі і апавяданнямі Міколы Цэлеша і я прачытаў іх. Здалося мне: адна аповесць пра вучобу хлопчыка ў старой дарэвалюцыйнай вясковай школе нават цікавая.

У 1992 годзе Мінск упершыню наведаў рэдактар газеты «Беларус», што выдаецца ў ЗША, Янка Запруднік. У час нашай сустрэчы ён, расказваючы пра пісьменнікаў-эмігрантаў, успомніў і Міколу Цэлеша, яго загадкавую смерць — выйшаў аднойчы з дому і не вярнуўся. Знік, быццам яго і не было.

— Ніхто — ні жонка, ні мы не ведаем, дзе падзеўся чалавек. Быў — і няма, — расказваў Янка Запруднік. — Між іншым, гэтак знік і бацька Антона Адамовіча, слыннага крытыка-эмігранта...

Праз некаторы час пасля той размовы з Янкам Запруднікам пазваніў мне Максім Танк. Спытаў, ці помню я што-небудзь пра Міколу Цэлеша.

— Прыехала ў Мінск яго ўдава, — паведаміў Яўген Іванавіч. — Патэлефанавала мне. Я пераадрасаваў яе вам. Вы ж усю эміграцыю ведаеце як свае пяць пальцаў...

Прыгадалі мы з Яўгенам Іванавічам, як друкавалі апавяданні Міколы Цэлеша ў «Полымі»...

— Ага, дык калі вы сустрэнецеся з яго ўдавой, раскажыце пра ўсё, — папрасіў мяне Максім Танк.

Удава — Цэлешыха, як назвала яна сябе пры знаёмстве, — пазваніла мне ў той жа дзень, і мы сустрэліся. Парадавала яна мяне сваёй рухавасцю, свежасцю, бадзёрасцю. І выдатным веданнем беларускай мовы. Калі зайшла гаворка пра Міколу Цэлеша, яна спытала, ці можна ёй уключыць «касэтку».

— Вядома, калі ласка, — нават быў здзівіўся я.

Я расказаў усё, што ведаў пра Міколу Цэлеша.

— А вы не бачылі яго тут, у Менску? — падняла на мяне вочы былая жонка пісьменніка, паглядзела быццам з надзеяй.

— Да вайны я малы быў. Ды і не жыў тут...

— А пасля вайны?

— Таксама не мог бачыць. Самі ведаеце, дзе жыву я і дзе жыў Мікола Цэлеш...

— Але я маю звесткі, што Мікола пасля надрукавання ў «Полымі» апавяданняў пераехаў у Савецкі Саюз.

— Такога я не ведаю...

На тым мы расталіся, спадзеючыся на новую сустрэчу — Цэлешыха хацела бачыць разам са мною і Масея Сяднёва, які якраз прыехаў у Мінск і гасцяваў на Магілёўшчыне. Масей Сяднёў затрымаўся ў родных мясцінах на больш, чым меркаваў, а Цэлешыха чакаць яго не магла — у яе быў куплены білет на самалёт, — адлятала ў Фларыду, дзе мела прыстанішча... І толькі потым, пасля яе адлёту, я ўспомніў той ліст Міколы Цэлеша, які прыслаў ён пасля надрукавання яго апавяданняў у «Полымі». Якраз пра яго я не сказаў Цэлешысе. А шкада. Можа б, той ліст унёс бы якую-небудзь яснасць у загадкавую смерць яшчэ аднаго беларускага пісьменніка...

●

Загадкавая смерць... Пра адну з іх — смерць Янкі Купалы — зноў нагадаў часопіс «Полымя», змясціўшы на сваіх старонках успаміны незабыўнай Паўліны Мядзёлкі. Дзіўна, але ход думак і разважанняў блізкага народнаму песняру чалавека супаў з ходам думак і разважанняў, што выклаў у ранейшых сваіх публікацыях я — «калі прыняць пад увагу, што Янка заўсёды быў праўдамоўны, не зважаючы на высокае становішча свайго субяседніка, гаварыў тое, што думаў; калі прыняць пад увагу яго настрой, у якім ён быў пры нашым апошнім спатканні і калі ён такія думкі выказваў не толькі перада мной, то з такім настроем і думкамі такому чалавеку, як Янка Купала, у гэты жудасны час культу нельга было жыць, а зрабіць з ім тое, што сталася з Цішкам Гартным, Чаротам і іншымі, таксама было нельга — занадта вялікі шум падняўся б за мяжой...»

Прыводзіць Паўліна Мядзёлка і некаторыя падрабязнасці таго загадкавага і трагічнага здарэння — зноў маладая энергічная жанчына, якая сядзела з Янкам Купалам на «поручнях», калідорная, белы туфель... І, вядома ж, сваю няверу ў афіцыйную версію смерці народнага песняра...

Так, афіцыйную версію смерці Янкі Купалы ўсяляк прапагандаваў Міхась Лынькоў, асабліва ў год смерці народнага песняра. Зразумець Міхася Лынькова можна. Баяўся за сябе, баяўся за іншых пісьменнікаў. Перажыўшы жахі трыццатых гадоў, ён ведаў: маглі скарыстаць смерць Янкі Купалы і пачаць новыя арышты тых, хто яшчэ заставаўся. А Міхась Лынькоў любіў літаратуру, імкнуўся абараняць усіх, хто ёй служыў. І таму... Хто можа сказаць сёння, што магло быць за гэтым «таму»... І як пры кожным такім выпадку лепш памаўчым, не будзем дадумваць за тых, зто не сказаў усяго, што трэба было б сказаць...

●

Спроба ўзнавіць выданне «Нашай Нівы» ў Вільні, якую задумалі і здзейснілі маладыя літаратары ў цяперашніх умовах — не першая. У лісце да Я. Ф. Карскага /26 верасня 1921 г./ вельмі дасведчаны ў беларускіх справах Максім Гарэцкі паведамляў: «Летась увосень выйшла некалькі NN «Нашай нівы» пад рэд. Антона Луцкевіча». Так, сапраўды было такое. Выйшла дзевяць нумароў гэтага выдання. У першым з іх /чэцвер, 28 кастрычніка 1920 г.»/ ва ўступным артыкуле газета пісала: «У нязвычайна важны мамэнт нашага нацыянальнага жыцьця пачынае нанова выхадзіць «Наша Ніва».

Бязмала дзесяць год — ад 1906 да 1915 году працавала «Наша Ніва», пракладаючы дарогу, па якой і пайшло развіцьцё **беларускае нацыянальнае ідэі.** «Наша Ніва» фармавала гэту ідэю, выпрацоўвала і давала канкрэтную форму і змест тым яшчэ няясным пачуцьцям і пажаданьням, якія будзіліся ў душах сыноў беларускае вёскі, радзіўшыхся і ўзросшых ужо пасьля скасаваньня прыгону — у больш вольнай атмасфэры.

Збудзіўшыся ад вечнага сну, беларускі народ пачаў прасьвятлеўшымі вачыма ўглядацца на сьвет божы, а ў той мамэнт, калі валілася старая расейская імпэрыя, пабудаваная на ўціску народаў і тушэньні ўсялякае вольнае думкі, — у той мамэнт беларускі народ пачаў сваймі рукамі будаваць сабе новае жыцьцё, будаваць сваю **незалежную дзяржаву.** Такім парадкам нацыянальная ідэя пашырылася і абняла беларускую дзяржаўную ідэю.

Варункі для нашага дзяржаўнага будаўніцтва склаліся аднак вельмі благія. Бязупыннае быццё на Беларускай зямлі чужацкіх войск, зьмяняўшыся адна за аднэй окупацыі не далі магчымасьці нам паставіць наш дзяржаўны будынак так скора і так лёгка, як гэта ўдалося нашым шчасьлівейшым за нас суседзям. І вось цяпер усенька наша зямелька пабіта на кусочкі, і на кожным куску пануе іншая, ды заўсёды чужацкая ўлада.

Гэтыя варункі прымусілі беларусаў пры кожнай уладзе шукаць спосабаў дзеля абароны калі ўжо не свае дзяржаўнае ідэі, дык прынамся нацыянальных правоў. З гэтага вынікла і рожнароднасьць тактыкі пад рожнымі окупацыямі, рожнароднасьць так званых «орыентацый», што вельмі ж заблутала дзьве аснаўныя ідэі нашага адраджэньня: чыста нацыянальную, нязьменную пры ўсялякіх палітычных абставінах, і дзяржаўную, якая вымагае тактыкі, прытарнованай да мамэнту і акалічнасцей.

Такая блутаніна не магла не адбіцца на ўсёй беларускай ідэолёгіі, зацямняючы яе асабліва ў вачох тых, хто толькі нядаўна стаў свядомым беларусам. Вызваліцца ад яе, разагнаць той туман, якім туманнасьць і нявыразнасьць агульнага палітычнага палажэньня спавівае ідэю нашага ўсеагульнага адраджэньня, — вось мэта, якую адноўленая «Наша Ніва» ставіць сабе ў гэты мамэнт».

Нумары ўзноўленага выдання «Нашай Нівы» цікавыя ў многіх адносінах. У тым ліку і ў літаратурных. На старонках менавіта гэтага выдання надрукаваны ці не першы верш Наталлі Арсенневай «Мой родны край»:

Паўдзённы край — мой родны край,
Але яго я і ня знаю.
К далёкім мора берагом
Я толькі ў думках залятаю...

Ні рож здзічэлах Аджыкенту,
Ні гордых, мглой адкрытых гор,
Ні векавечнай песьні мора,
Што вабе ў сіні свой прастор, —

Нічога гэтага ня знаю,
А палюбіла край другі:
Няма там гор, няма там мора,
Але я зведала там гора,
Там сіла вырасла душы!

У выбраным паэтэсы «Між берагамі», што выйшла ў 1979 г. у Беларускім інстытуце навукі й мастацтва /Нью-Йорк—Таронта/, пазначана, што «першы друкаваны верш паэткі «Восень» /«Наша думка», Вільня, 8.IX.1921 г./». Выходзіць, і сама паэтэса, і каментатары памыліліся. Тая самая «Восень», перш чым з'явіцца на старонках «Нашай думкі», была змешчана на старонках «Нашай Нівы» 12 лістапада 1920 г. /N 3/.

Ёсць на старонках узноўленай «Нашай Нівы» і іншыя цікавыя паведамленні і факты. Шкада, што гэтую газету абыходзяць сваёй увагай даследчыкі, не ўспамінаюць яе ў навуковых выданнях.

•

«Дела давно минувших дней»... І ўсё ж згадваць некаторыя з іх хоць зрэдку трэба. Каб не забываліся, каб помнілі, як Масква «дапамагала» беларусам вырашаць свае нацыянальныя пытанні. Вось адзін з прыкладаў. Маленькі, дробязны, але характэрны — заключэнне па тэматычных планах выпуску і рэдпадрыхтоўкі Галоўнай рэдакцыі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі на 1982 г.

«Представленные в январе 1981 г. планы выпуска и редподготовки энциклопедической литературы в Белоруссии на 1982 г. имеют серьезные и неоправданные расхождения с утвержденными Госкомиздатом СССР планами /приказы N 296 от 13.07.80 г. и N 458 от 02.09.80 г./

Обращаем внимание на то, что Главная редакция восстановила в плане издание Истории изобразительного искусства Белоруссии в 6-ти томах, а также включила в план энциклопедию «Янка Купала», Свод памятников истории и культуры Белоруссии в 7-ми томах и издание летописей народной славы по ряду районов Белоруссии.

В связи с этим, выпуск Истории изобразительного искусства Белоруссии и энциклопедии «Янка Купала» рекомендуем из плана исключить, как не предусмотренные названными выше приказами Госкомиздата СССР. Выпуск Свода памятников истории и культуры Белорусии, в соответствии с принятым решением, возложен на издательства академий наук /в Белоруссии — на издательство «Наука и техника»/. Выпуск отдельных изданий летописей народной славы по Быховскому, Березинскому, Ляховичскому и Дубровенскому районам рекомендуем из плана издательства исключить, как непрофильные и передать другому издательству.

Обращаем внимание также на то, что резерв на 1982—83 гг. по 2 названия по 50 уч.-изд. листов планом не предусматривался.

Планы выпуска энциклопедической литературы в союзных республиках утверждаются приказами Госкомиздата СССР, которые строго контролируются. Любые изменения утвержденных планов должны быть предварительно согласованы с Госкомиздатом СССР. При этом следует иметь в виду, что решение вопросов об энциклопедических изданиях естественно-научной и технической тематики, а также переводных, опубликованных центральными издательствами находится в компетенции Госкомиздата СССР. Что касается изданий общественно-политической тематики, то вопрос об их выпуске решается по согласованию между республиканскими и союзными директивными органами.

Главное управление республиканских и областных издательств».

•

Адзін дасціпны заходнееўрапейскі пісьменнік, пабываўшы ў Савецкім Саюзе, прычыну масавага даносніцтва бачыў у тым, што, як ён гаварыў, навучылі людзей пісаць, а не навучылі пра што.

— Вось яны і пішуць адзін на аднаго, што каму ў галаву ўзбрыдзе, — смяяўся пісьменнік.

Сёння няма ўжо некаторых арганізацый, якія ахвотна прымалі даносы, рэагавалі на іх. Тыя ж, што засталіся, таксама жывуць іншым жыццём. Але колькасць даносаў і даносчыкаў не зменшылася. Пішуць з няменшым імпэтам і цяпер адзін на аднаго тыя, хто навучыўся пісаць, але не навучыўся пра што. І пасылаюць іх у газеты. І газеты ахвотна гэтыя даносы друкуюць...

1993 г.

Генадзь КАХАНОЎСКІ

15 студзеня 1994 года пасля цяжкай хваробы памёр член Саюза пісьменнікаў Беларусі, доктар гістарычных навук Генадзь Каханоўскі.

Генадзь Аляксандравіч Каханоўскі нарадзіўся 8 студзеня 1936 года ў вёсцы Дамашы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў школе, працаваў у мясцовым калгасе. Пасля службы ў Савецкай Арміі /1955—1958/ скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута /1963/. Працаваў настаўнікам у Ленкаўскай васьмігадовай школе і ў Маладзечне. З 1964 г. — навуковы супрацоўнік, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, дырэктар Мінскага абласнога краязнаўчага музея /Маладзечна/. Завочна скончыў аспірантуру пры Інстытуце гісторыі Акадэміі навук Беларусі. З 1981г. — навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі. З 1989г. — старшыня Беларускага краязнаўчага таварыства. У 1992 г. абараніў доктарскую дысертацыю. У апошні час загадваў аддзелам краязнаўства Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францішка Скарыны.

У друку з краязнаўчымі артыкуламі пачаў выступаць з 1962 г. Выйшлі кнігі нарысаў «Маладзечна» /1971/, «Вілейка» /1974/, «Адчыніся, таямніца часу /1984/, «Повязь часоў» /1985/, а таксама асобныя нарысы-даследаванні пра невядомыя факты з жыцця і творчасці Я. Купалы — «На запаветнай зямлі» /1974/ і М. Багдановіча — «У родным краі» /1983/. Аўтар манаграфічных даследаванняў «Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі XVI—XIX стст.» /1984/, «Маладзечна, 600 гадоў» /1988/, «Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму» /з Л. Малаш і К. Цвіркам, 1989/, «Прадвесне навукі» /1990/.

Г. Каханоўскі — складальнік і аўтар прадмовы зборніка «Гэй, смалі, страляй, маланка: Сатыра і гумар Заходняй Беларусі 1920—1939 гг.» /1989/. Адзін са складальнікаў і аўтараў літаратурна-мастацкіх календароў «Колядзён» /1987, 1988/, «Беларускі каляндар — 1991» /1990/, «Наш край» /1990/.

Для твораў Генадзя Каханоўскага, створаных на плённым сумежжы літаратуразнаўства і гістарычнай навукі, эсэ і нарыса, характэрны энцыклапедычнасць, шчырая зацікаўленасць пісьменніка-грамадзяніна ў пошуках і даследаванні з'яў мінулага. Напісаныя з навуковай грунтоўнасцю і вобразна-мастацкай жывасцю, дакладна і займальна, яны ўвайшлі ў скарбонку беларускай культуры і дастойна служаць справе беларускага нацыянальнага адраджэння.

Без перабольшання можна сцвярджаць, што ўсё сваё свядомае жыццё Генадзь Каханоўскі прысвяціў роднай Беларусі, яе будучыні. Ён заўсёды быў у гушчыні падзей, прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці рэспублікі, карыстаўся заслужанай павагай сярод сяброў і аднадумцаў, сваіх чытачоў. Акрамя таленту даследчыка, пісьменніка, ён валодаў дарам прыроджанай чалавечнасці, душэўнай шчодрасці і добразычлівасці.

Такім назаўсёды і застанецца ў нашых сэрцах Генадзь Каханоўскі — руплівы працаўнік, талеавіты пісьменнік, сапраўдны патрыёт сваёй Бацькаўшчыны.

Саюз пісьменнікаў Беларусі
Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францішка Скарыны
Беларускае краязнаўчае таварыства

РОДНАЯ ЗЯМЛЯ НЕ ЗАБУДЗЕ

Пасля цяжкай хваробы заўчасна пайшоў ад нас Генадзь Аляксандравіч Каханоўскі — краязнавец, гісторык, публіцыст, апантаны даследчык беларускай мінуўшчыны і сціплы руплівец на ніве адраджэння Бацькаўшчыны.

Навуковым і мастацтвазнаўчым працам Г. Каханоўскага ўласціва грунтоўная навуковая аснова, багацце фактаў і перакананасць высноў. Шырокае кола ягоных інтарэсаў уключала шматлікія грані матэрыяльнай і духоўнай культуры народа.

Ён быў адным з тых навукоўцаў, чыімі намаганнямі паўстала Беларускае краязнаўчае таварыства і па праву зрабіўся яго старшынёй. Спадчына Г. Каханоўскага — гэта працы па археалогіі, гісторыі, фалькларыстыцы, этнаграфіі, краязнаўстве, музейнай справе, даследаванні па гісторыі гарадоў Беларусі і ахове яе гістарычных помнікаў. З яго дапамогай устаноўлены помнікі, мемарыяльныя знакі і шыльды ў шматлікіх гістарычных мясцінах Бацькаўшчыны. У сваіх гістарычных творах ён аддаў належнае мноству папярэднікаў, такіх жа руплівых даследчыкаў роднага краю, вярнуў з небыцця забытыя імёны, адкрыў і ўвёў у навуковы ўжытак невядомыя раней дакументы з архіваў, бібліятэк і музеяў Беларусі і замежжа. Г. Каханоўскі быў адным з тых беларусаў, якія адкрылі родны край усяму свету.

У якасці ўдзельніка археалагічных, этнаграфічных, фалькларысцкіх эскпедыцый ён аб'ездзіў усю Беларусь, а родную Маладзечаншчыну ведаў, як ніхто іншы. Як літаратуразнавец, ён даследаваў многія цікавыя пытанні творчасці Я. Купалы, М. Багдановіча, Ф. Багушэвіча, Я. Коласа і іншых славутых пісьменнікаў, чыя творчасць з'яўляецца каштоўнейшай спадчынай беларускай літаратуры.

Усю творчую энергію душы аддаў гэты рознабакова адукаваны чалавек роднаму краю і родная зямля яго ніколі не забудзе.

Цэнтральная Рада БСДГ

Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці загадчыка аддзела цэнтра, доктара гістарычных навук, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Генадзя КАХАНОЎСКАГА і выказвае шчырае спачуванне сваякам і блізкім нябожчыка.

Аб'явы

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ МАСТАЦТВАЎ

аб'яўляе конкурс

на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу /для тых, хто валодае беларускай мовай/:

— загадчык кафедры малюнка 1
— дацэнт кафедры рэжысуры 1
— дацэнт кафедры дызайну 1
— старшы выкладчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы і дакументы згодна палажэнню аб конкурсах падаваць на імя рэктара акадэміі па адрасе:

220012, г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 81, аддзел кадраў, тэл. 32-77-34.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ПРАБЛЕМ КУЛЬТУРЫ

аб'яўляе конкурс

на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу /для тых, хто мае мінскую прапіску/.

Кафедра псіхолага-педагагічных дысцыплін і культуразнаўства

— прафесар /0,5 стаўкі/;
— дацэнт.

Звяртацца на адрас:
220086, г.Мінск,
вул. Каліноўскага, 12,
тэл. 63-05-38, 63-17-33.

ЛІМ

Заснавальнікі:
Саюз пісьменнікаў Беларусі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Выходзіць з 1932 года

Газету рэдагавалі
І.Гурскі (1935–41)
А.Куляшоў (1945–46)
М.Горцаў (1947–49)
П.Кавалёў (1949–50)
В.Вітка (1951–57)
М.Ткачоў (1957–59)
Я.Шарахоўскі (1959–61)
Н.Пашкевіч (1961–69)
Л.Прокша (1969–72)
Х.Жычка (1972–76)
А.Асіпенка (1976–80)
А.Жук (1980–86)
А.Вярцінскі (1986–90)

Галоўны рэдактар
Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Андрэй ГАНЧАРОЎ (першы намеснік галоўнага рэдактара),
Юрась ЗАЛОСКА,
Міхась ЗАМСКІ,
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ,
Барыс ПЯТРОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара),
Юрась СВІРКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі 332–461
намеснікі галоўнага рэдактара 332–525, 331–985
аддзелы:
публіцыстыкі 332–525
пісьмаў і грамадскай думкі 331–985
літаратурнага жыцця 332–462
крытыкі і бібліяграфіі 332–204
паэзіі і прозы 332–204
музыкі 332–153
тэатра, кіно і тэлебачання 332–153
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў 332–462
навін 332–462
мастацкага афармлення 332–204
фотакарэспандэнт 332–462
бухгалтэрыя 268–640

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛІМ".
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдыкцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку"

Індэкс 63856. Наклад 17.000.
Нумар падпісаны 27.01.1994 г.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Тэлетыдзень

ПАНЯДЗЕЛАК

Беларускае тэлебачанне

9.25 Пад купалам Сусвету.
9.35 Пяць хвілін на жарты.
9.40 «Угледзецца ў твар...» Рэжысёр М. Пінігін.
10.20 «Усе мы родам з дзяцінства». І Рэспубліканскі тэлевізійны фестываль, частка 1-я.
11.35 «У вайны не жаночы твар», д/ф.
12.15 «Клічаўскі пачастунак». Музычная праграма.
13.30 Навіны.
13.40 «Тры гісторыі з тэлефонам», «Першы канцэрт», к/ф.
14.40 Каралеўскае паляванне.
15.40 Тэлебачанне—школе. Песня ў творчасці беларускіх кампазітараў.
16.10 Дзіцячы парламент. Перадача 2-я.
17.30 «Шчыт, меч і пяро». Васіль Хомчанка.
18.10 Навіны /Брэст/.
18.25 Навіны Бі-бі-сі.
19.00 Аэробіка.
19.35 Бар'еры. Інваспорт-93.
20.25 «Тэлесябрына».
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Надвор'е.
21.55 Пяць хвілін на жарты.
22.00 Спартыўны тэлекур'ер.
22.20 Кантакт.
22.25 НІКа.
22.40 Памяці акцёра Ю. Казючыца, частка 1-я.

Канал «Астанкіна»

17.00, 20.00, 24.00 Навіны.
17.25 Гол.
17.55 Дакументы і лёсы.
18.05, 20.35 Надвор'е.
18.10 «Дробязі жыцця».
18.40 Мініяцюра.
18.55 «Святлана—дзяжа Іосіфа...» Частка 2-я.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.45 Каханне ў галантным стагоддзі. Расказвае Э. Радзінскі.
21.45 Канстанцін Райкін буйным планам.
22.35 Прэс-клуб.
23.45 Футбол. Кубак чэмпіёнаў Садружнасці.
0.20 Прэс-экспрэс.

Канал «Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730.
7.00 Ваша права.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Мульці-пульці.
8.00 Навіны Эй-бі-сі.
8.30 Зусім сакрэтна.
9.20 «Ваенная рэтра», канцэрт.
10.30 Новая лінія.
11.00 «Павел Карчагін», м/ф.
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 «Мая марачка», м/ф.
14.40 Паралелі.
14.55 Тэлегазета.
15.00 Бізнес у Расіі.
15.30 Там-там навіны
15.45 Вуснамі дзіцяці.
16.15 Новая лінія.
16.50 Выратаванне 911.
17.45 Руская віза.
18.15 Абракадабра.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.40 «Неймаверны крадзеж». /«Эркюль Пуаро»/.
20.40 У свеце аўта- і мотаспорту.
21.15 Без рэтушы.

Санкт-Пецярбург

6.30 «Белае верблюдзяня», мульт.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30, 22.45 Інформ ТБ.
7.05 «На парозе ночы», м/ф.
8.00 «Рашын-Піца-Блюз» у Мангейме.
9.00 «Кракакот», «Вядомае качання Цім», мульт.
9.30 Кідайка.
10.10 Там, дзе жыве Павуціныч.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 Тэледоктар.
11.15 «Сябры», мульт.
11.40 Камертон.
12.25, 14.25, 18.05, 20.40, 23.50 Музычны момант.
12.30 «Балтыйскае неба», м/ф, 1-я серыя.
13.55 «Жадаем шчасця вам», канцэрт.
14.40 Зебра.
15.40 Дамашні ўрок.
16.10 Чалавек на зямлі.
16.40 На экране — ПАР.
17.30 Адкрываю для сябе Расію.
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 «Погляд з Масквы».
19.25 Месца нараджэння.
19.35 Надвор'е-шоу.
19.40 Спорт, спорт, спорт.
20.00 Сёння.
20.35 Тэлемагазін.
20.45 «Рухайцеся за гэтым самалётам», м/ф.
22.10 «Ракавое каханне», фільмы 1-ы і 2-гі.
22.35 Ваш стыль.
23.05 «Кінаўспаміны. Канец вайны», д/ф.

АЎТОРАК

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Надвор'е.
8.30 Пяць хвілін на жарты.
8.35 «Ане Вескі», канцэрт.
9.00 Тэлебачанне — школе. Песня ў творчасці беларускіх кампазітараў.
9.30 Тэлеклуб «Гаў-гаў».
9.50 «Пастушыныя гульні». Інсцэніроўка паводле рамана Лонга «Дафніс і Хлоя».
10.30 «Усе мы родам з дзяцінства», частка 2-я.
11.55 «Тэлесябрына».
12.55 «Палесся мілае дзіця...» Я. Янішыц.
13.30 Навіны.
13.40 Дзелавая хроніка.
13.50 «Дзіна», м/ф.
15.20 Тэлебіржа.
15.30 «Нов і К»-топ-10.
16.30 Тэлебачанне—школе. Янка Купала і яго настаўнікі.
16.55 Гаспадар. Адзіная рублёвая зона: плюсы і мінусы.
17.40 Скарбы беларускай гісторыі.
18.00 Дзелавая хроніка.
18.10 Навіны /Віцебск/.
18.25 Навіны Бі-бі-сі.
19.00 Стоп-кадр.
19.15 Навошта дадзена ўлада?
20.05 Мост.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 Надвор'е.
22.00 На сесіі ВС РБ; «Ніхто, акрамя цябе»; Кантакт. Памяці акцёра Ю. Казючыца, частка 2-я.

Канал «Астанкіна»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00 Навіны.
5.20 Ранішняя размінка.
5.30 Раніца.
7.45 «Цудоўны яблык», мульт.
8.20 Вясёлыя ноткі.
8.40 «Проста Марыя».
9.30 Чалавек і закон.
10.00 Маленькі канцэрт.
10.10 Наш музычны клуб.
10.50 Прэс-экспрэс.
11.20 «Саламяны капялюшык», м/ф.
13.30 У палацы на Садовым кальцы.
14.25 Дзелавы веснік.
14.40 Хроніка дзелавога жыцця.
15.10 Справа.
15.20 «Мая сям'я і іншая жывёла».
15.55 Вяртанне да гледача.
16.10 Наш музычны клуб.
16.50 Азбука ўласніка.
17.25 За кулісамі.
17.50 Дакументы і лёсы.
18.00, 20.35 Надвор'е.
18.05 «Проста Марыя».
18.55 Тэма.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.45 Лідэр.
21.30 З першых рук.
21.45 Баль алімпійцаў.
23.00 Кіно да запатрабавання.
23.30 Жыццяпіс.
0.20 Прэс-экспрэс.
0.30 Аўтаралі «Руская зіма».

Канал «Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... Патрабуюцца...
6.30 Формула 730.
7.00 Вольны час.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Мульці-пульці.
8.00 Навіны Эй-бі-сі.
8.30 «Жоўтая падводная лодка».
11.00 «Мой сябра Іван Лапшын», м/ф.
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 «Урок жыцця», м/ф.
15.15 Канцэрт.
15.30 Там-там навіны.
15.45 Студыя «Рост».
16.15 Новая лінія.
17.00 Рамансы П. І. Чайкоўскага.
17.30 Рубяжы.
17.45 Прасцей простага.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.40 «Санта-Барбара».
20.30 Арт-абстрал.
21.15 Цёх дом.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 Покліч Вадалея.

Санкт-Пецярбург

6.30 «Жыла-была пчолка», мульт.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30, 22.45 Інформ ТБ.
7.05 Адам і Ева.
7.35 Новыя часы.
8.10 До-бра-шоу.
9.10 Нямецкая хваля.
9.40 Казка за казкай.
10.15 Залаты ключ.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 «Але не зразумелі вы казаных ім слоў», д/ф.
11.40 Камертон.
12.25, 14.25, 18.05, 20.40, 0.20 Музычны момант.
12.30 «Балтыйскае неба», 2-я серыя.
13.50 «Мелодыі старога замка», канцэрт.
14.40 «Белая косць», м/ф.
15.20 Тэлемагазін.
16.25 «Ці лёгка быць храбрым», мульт.
16.35 «Дамашні ўрок».
16.55 Там, дзе жыве Павуціныч.
17.10 Тры колы, фаліянт і іншыя...
17.30 Новы Пецярбург.
18.10 Вялікі фестываль.
18.30 Інформ ТБ.
18.55 «Партрэты». Актрыса Л. Лявонава..
19.40 Спорт, спорт, спорт.
20.00 Сёння.
20.35 Тэлемагазін.
20.45 «На парозе ночы», м/ф.
21.35 Блеф-клуб.
22.15 Да 150-годдзя М. А. Рымскага-Корсакава.
22.35 Ваш стыль.
22.45 Інформ ТБ.
23.50 Еўрапейскі калейдаскоп.

СЕРАДА

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Надвор'е.
8.30 Пяць хвілін на жарты.
8.35 «Дывертысмент», канцэрт.
9.00 Тэлебачанне — школе. Янка Купала і яго настаўнікі.
9.25 «Ніхто, акрамя цябе».
10.10 «Маэстра, клоўн і мы», канцэрт.
10.40 Аэробіка.
11.15 Песню бярыце з сабою, частка 1-я.
13.30 Навіны.
13.40 «Загадкавы спадчыннік», м/ф.
15.50 «Сава», «Даніла і Няніла», «Вясёлы падманшчык», мульт.
16.20 «Байгич», кінанарыс.
16.40 Відзьма-нявідзьма.
17.40 Закон і мы.
18.10 Навіны /Гомель/.
18.25 Навіны Бі-бі-сі.
19.00 «Карамболь». А. Камбурава.
19.35 «Спыніся, імгненне...» Скульптар А. Дамброўскі.
20.05 Дзелавая размова.
20.30 Кантакт.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 Надвор'е.
22.00 На сесіі ВС РБ; «Ніхто, акрамя цябе»; Валейбол. «Энка» — «Нёман»; Кінарэжысёр Л. Голуб.

Канал «Астанкіна»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00 17.00, 20.00, 24.00 Навіны.
5.20 Ранішняя размінка.
5.30 Раніца.
7.45 «Школа пажыўнікаў», мульт.
8.20 Сарока.
8.40 «Кот у ботах». спектакль.
9.30 Клуб падарожнікаў.
10.20 Джэм.
10.50 Прэс-экспрэс.
11.20 «Чыста англійскае забойства», м/ф, 1-я серыя.
12.40 «Рускія гонкі», д/ф.
13.35 Й. Гайдн. Сімфонія N 24.
14.25 Прадпрымальнік.
15.20 «Мая сям'я і іншая жывёла».
15.50 Джэм.
16.20 «Лятаючы дом», мульт.
16.50 Тэхнадром.
17.25 Кампанія «Мір».
17.50, 20.35 Надвор'е.
17.55 Футбол. Кубак чэмпіёнаў Садружнасці. Паўфінал. У перапынку /18.45/ — Добрай ночы, малышы!
20.45 Шчаслівы выпадак.
21.50 Фільмы нашай памяці. «Сярожа».
23.30 Максіма.
0.20 Прэс-экспрэс.
0.30 MTV.

Канал «Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... Патрабуюцца...
6.30 Формула-730.
7.00 Паездка Грыбаедава да Чаадаева.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Мульці-пульці.
8.00 Навіны Эй-бі-сі.
8.30 Добрая раніца.
9.00 Без рэтушы.
9.55 «У небе і на зямлі. 10 год з жыцця В. Чкалава», д/ф.
11.00 Новая лінія.
11.30 «Малыш», м/ф.
12.25 Мульці-пульці.
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 «Варвара-краса, Доўгая Каса», м/ф.
14.50 Мульці-пульці.
14.55 Тэлегазета.
15.00 Залатая шпора.
15.30 Там-там навіны.
15.45 Студыя «Рост».
16.15 Новая лінія.
17.00 Мір і вайна.
17.30 М-трэст.
17.45 «Князь Уладзімір Палей», д/ф.
18.35 ЭКС.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.35 «Санта-Барбара».
20.25 L-клуб.
21.15 Зала чакання.
22.05 «Яблычны пірог», мульт.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 «Настальжы».
23.25 Памяці вялікага мастака. П. І. Чайкоўскі.

Санкт-Пецярбург

6.30 «Сініошны калодзеж», мульт.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30 Інформ ТБ.
7.05 «На парозе ночы», м/ф.
8.00 «Цюінвал. Спынены час песень».
8.30 «Партрэты». Актрыса Л. Лявонава.
9.10 Нямецкая хваля.
9.40 Там жыве Павуціныч.
9.55 Тры колы, фаліянт і іншыя...
10.15 «Бюро знаходак», мульт.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 «Мінула сто гадоў», канцэрт.
11.40 «Сярэбраная ніць».
12.20, 14.25, 18.05, 20.40, 0.50 Музычны момант.
12.25 О-ля-ля!
12.55 «Актрыса», м/ф.
14.40 «Лала».
16.05 Тэлемагазін.
16.10 «Асляня», мульт.
16.30 «Дамашні ўрок».
17.00 Ваша права.
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 Без назвы.
19.10 «Страсці па каве». На музыку І. С. Баха.
19.40 Спорт, спорт, спорт...
20.00 Сёння.
20.35 Тэлемагазін.
20.45 Ж. Сіменон. «Ён прыехаў у дзень памінання», тэлеспектакль. У перапынку /22.52/—Ваш стыль; Інформ ТБ.

ЧАЦВЕР

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Складчына.
8.30 Пад купалам Сусвету.
8.40 Надвор'е.
8.50 Пяць хвілін на жарты.
8.55 «Музычныя серады ў М. А. Рымскага-Корсакава», канцэрт.
9.15 «Ніхто, акрамя цябе».
10.00 Кінарэжысёр Л. Голуб.
11.45 Песню бярыце з сабою, частка 2-я.
13.30 Навіны.
13.40 «Мелодыі белай ночы», м/ф.
15.15 «Варатар XX стагоддзя», д/ф.
16.15 Тэлебіржа.
16.25 Тэлебачанне—школе. Кандрат Крапіва і яго драматургія.
17.05 Роздум пасля з'езда фермераў.
17.50 Складчына.
18.10 Навіны /Гродна/.
18.25 Навіны Бі-бі-сі.
19.00 Зачытайце маё пісьмо...
19.05 Эпіцэнтр.
19.30 «Тэлесябрына».
19.35 Дзедка за рэпку...
20.05 «Кола лёсу», кінанарыс.
20.15 Пазіцыя ўрада.
20.30 Кантакт.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 Надвор'е.
22.00 На сесіі ВС РБ; «Ніхто, акрамя цябе»; Адраджэнне беларускай капэлы.

Канал «Астанкіна»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00 Навіны.
5.20 Ранішняя размінка.
5.30 Раніца.
7.45 «Ноч нараджэння», мульт.
8.20 «Наваселле ў Братка Труса», мульт.
8.40 «Проста Марыя».
9.30 У свеце жывёл.
10.10 ...Да 16 і старэйшым.
10.50 Прэс-экспрэс.
11.20 «Чыста англійскае забойства», 2-я серыя.
12.40 «Чаму куры грошай не клююць?», мульт.
12.50 А. Шнітке. Фартэпіянны квартэт.
13.00 На шляху да Уэмблі.
14.25 Прадпрымальнік.
15.05 Як дабіцца поспеху.
15.15 «Мая сям'я і іншая жывёла».
15.55 Музограф.
16.20 ...Да 16 і старэйшым.
17.25 Лабірынт.
17.50 Дакументы і лёсы.
18.00, 20.35 Надвор'е.
18.05 «Проста Марыя».
18.55 Чалавек са скрыні. Да 70-годдзя рэжысёра Л. Пчолкіна.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.45 Лато «Мільён».
21.15 «Твін Пікс».
22.10 Музыка ў эфіры.
23.30 Акадэмія.
0.20 Прэс-экспрэс.
0.30 На шляху да Уэмблі.

Канал Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730.
7.00 Сігнал.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Паехалі.
8.00 Навіны Эй-бі-сі.
8.30 Мульці-пульці.
8.40 Покліч Вадалея.
9.40 «К-2».
10.30 Новая лінія.
11.00 «Санта-Барбара».
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 «Справа была ў Пянькове», м/ф.
15.00 Канцэрт.
15.15 Мульці-пульці.
15.25 Там-там навіны.
15.40 Студыя «Рост».
16.10 Новая лінія.
16.55 Глобус.
17.25 Азы кар'еры.
17.40 Будні.
18.25 Я — лідэр.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.40 «Санта-Барбара».
20.30 Міф Дзмітрыя Пакроўскага.
21.20 Айчына мая.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 ЭКП.
23.05 Дыялог з сабой.
23.30 Джазавая музыка.

Санкт-Пецярбург

6.30 «Перапалох», мульт.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30, 22.45 Інформ ТБ.
7.05 «Яшчэ не ўсё страчана», д/ф.
8.10 Еўрапейскі калейдаскоп.
8.40 Новы Пецярбург.
9.10 Нямецкая хваля.
9.40 Казка за казкай.
10.10 «Бюро знаходак», мульт.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 Сем сланоў.
11.40 «Спявае Іван Пятроў».
12.00, 14.25, 18.05, 20.40, 0.05 Музычны момант.
12.05 «Рухайцеся за гэтым самалётам», м/ф.
13.30 Папараць-кветка, канцэрт.
14.40 Гістарычны альманах.
15.25 «Каронны нумар», м/ф.
16.30 «Кракакот», мульт.
16.40 «Дамашні ўрок».
17.10 Дзецям пра зверанят.
17.30 Рэформа і ўлада.
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 Партрэты.
19.40 Спорт, спорт, спорт...
20.00 Сёння.
20.35 Тэлемагазін.
20.45 «На парозе ночы», м/ф.
21.35 «Каўбой», канцэрт.
21.50 «Вячэрні звон».
22.35 Ваш стыль.
23.05 «Вячэрні звон».

ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Надвор'е.
8.30 Пяць хвілін на жарты.
8.35 Старонкі беларускай музыкі. Іграе І. Шуміліна.
9.00 Тэлебачанне—школе. Кандрат Крапіва і яго драматургія.
9.40 Пазіцыя ўрада.
9.55 «Ніхто, акрамя цябе».
10.40 «Карамболь». А. Камбурава.
11.15 Песню бярыце з сабою, частка 3-я.
13.30 Навіны.
13.40 Дзелавая хроніка.
13.50 «Ленінградская сімфонія», м/ф.
15.25. «Казка пра старое рэха», «Цінка-павуцінка», мульт.
15.45 Тэлекафэ «Мая мама».
16.30 Запрашальны білет.
17.15 «Цэнтр» у Польшчы.
18.00 Дзелавая хроніка.
18.10 Навіны /Магілёў/.
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00 Рок-айленд-шоу.
20.20 «Тэлесябрына».
20.30 Кантакт.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 Надвор'е.
22.00 На сесіі ВС РБ; «Ніхто, акрамя цябе»; «Асуджаны на самоту», м/ф. /Японія/.

Канал «Астанкіна»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.45, 20.00, 24.00 Навіны.
5.20 Ранішняя размінка.
5.30 Раніца.
7.45 «Як кошка з сабакам», мульт.
8.20 «Журботны горн», м/ф.
9.35 «Скарбніца мудрасці», мульт.
9.50 «Песня жаваранка», д/ф.
10.20 Сустрача з Г. Літвіненкай.
10.50 Прэс-экспрэс.
11.20 «Партрэт», тэлеспектакль.
12.55 Там, за воблакамі...
13.15 Тэатральны раманс у выкананні М. Навахіжына.
14.25 Дзелавая хроніка.
14.35 Брыдж.
14.55 Бізнес-клас.
15.10 «Воўчая шкура», мульт.
15.20 «Журботны горн», м/ф.
16.30 Рытмы Шры Ланкі.
16.45 Азбука ўласніка.
16.55 Футбол. Кубак чэмпіёнаў Садружнасці. Фінал.
18.50, 20.35 Надвор'е.
18.55 Поле цудаў.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.45 «Твін Пікс».
21.40 Чалавек тыдня.
21.55 У пошуках страчанага. Амерыканская актрыса М. Кор'юс.
22.35 Тэлескоп.
23.15 Музагляд.
0.20 Прэс-экспрэс.
0.30 Праграма «Х».
0.45 Пляцоўка агляду.

Канал «Расія»

6.00, 13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
6.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
6.30 Формула-730.
7.00 Не быць дыназаўрам.
7.20 Час дзелавых людзей.
7.50 Паехалі.
8.00 Навіны Эй-бі-сі.
8.30 Міф Дзмітрыя Пакроўскага.
9.15 Зала чакання..
10.05 Наш сад.
10.35 Новая лінія.
11.05 «Санта-Барбара»..
12.55 Белая варона.
12.40 Сялянскае пытанне.
13.25 Тэлетэатр Расіі. Г. Бёль. «Няўлюўныя».
14.35 Яны жывуць па Карану.
14.50 Мульці-пульці.
15.00 Тэлегазета.
15.05 Бізнес у Расіі.
15.35 Там-там навіны.
15.50 Паралелі.
16.05 Новая лінія.
16.55 Дысней па пятніцах.
17.45 Шарман-шоу.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 Падрабязнасці.
19.40 «Ваяж тэрору», м/ф., 2-я серыя.
21.15 Ніхто не забыты?
21.25 «К-2».
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 Вячэрні салон.

Санкт-Пецярбург

6.30. «Сябры», мульт.
6.45, 11.30, 14.30, 18.30, 22.45 Інформ ТБ.
7.05 «На парозе ночы», м/ф.
8.00 «Вячэрні звон».
9.10 Нямецкая хваля.
9.40 Дзецям пра зверанят.
10.00 «Жыла-была пчолка», «Гарлачык», мульт.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 «Чаканне», канцэрт.
11.40 «Крэпасць неадольная», д/ф.
12.10, 14.25, 18.05, 20.40, 0.45 Музычны момант.
12.25 «Цела Леніна», д/ф.
13.15 Чэмпіянат Расіі па бальных танцах.
14.40 «Адкрываю для сябе Расію».
15.10 «Я цябе ніколі не забуду», м/ф.
16.35 «Ці лёгка быць храбрым», мульт.
16.45 Пра Маякоўскага.
17.15 «Небяспечнае напружанне».
17.30 «Цюінвал. Горад, дзе не чутна песень».
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 «Гісторыя хваробы», м/ф.
19.40 Спорт, спорт, спорт...
20.00 Сёння.
20.35 Тэлемагазін.
20.45 Хранограф.
21.45 Пецярбургскі ангажэмент.
22.35 Ваш стыль.
23.05 «Ён наводзіць жах», м/ф. /ЗША/.

СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Пяць хвілін на жарты.
8.25 Надвор'е.
8.35 «Бабуля, навучы», мульт.
8.45 «Ніхто, акрамя цябе».
9.30 Здароўе.
10.00 Паказвае Гродна.
11.00 Тыдзень планеты.
11.15 «Асуджаны на самоту», м/ф. /Японія/.
12.35 20 мінут рэдактара.
12.55 Шматгалоссе. Перадача з Віцебска.
13.55 «Мой маленькі поні».
14.25 Панарама Прыдняпроўя.
14.55 Алімпійскі сілуэт.
15.20 Брама. Права на права.
16.05 «Вялікія аўтамабілі свету», 1-я серыя.
16.35 «Нов і К»-топ-10.
17.35 «Крок».
19.20 Чэмпіянат Беларусі па спартыўных танцах.
20.20 «Сямейныя вечары», д/ф.
20.35 Кальханка.
21.00 Панарама.
21.35 Пад купалам Сусвету.
21.45 Пяць хвілін на жарты.
21.50 «Кароткая гульня», м/ф.
23.20 Міс Грацыя-93.
23.45 НІКа.
24.00 «Каскад».
0.15 Відзьма-нявідзьма.

Канал «Астанкіна»

6.00, 14.00, 20.00, 24.00 Навіны.
6.25 Ранішняя размінка.
6.35 Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.10 Азартныя гульні.
7.40 Бог у помач.
8.00 «Марафон-15».
8.30 Кампанія «Мір». Ч. Айтматаў.
9.55 Ранішняя пошта.
10.25 Смак.
10.40 Кнюкны двор.
11.20 Сола.
11.50 Ахоўная грамата.
12.20 Дапамажы сабе сам.
13.00 Лёгкая атлетыка.
14.25 «Пэпі Доўгаяпанчоха».
14.55 Жыццё і палітыка.
15.25 «Ультра-сі».
16.15 Марыя Калас. Вядучыя — М. Магамаеў і С. Балза.
17.00 «Эрмітаж», фільм 3-ці.
17.30 Рэха тыдня.
18.00 Брэйн-рынг.
18.50 «Цудоўная пара», м/ф, 2-я серыя.
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.35 Надвор'е.
20.45 «І мора раскажа...», м/ф, 1-я серыя.
21.40 Музычнае надвор'е.
22.55 Апошні кінасеанс.

Канал «Расія»

8.00 Рэтра-шлягер.
8.30 Непазнаны Сусвет.
9.00 Студыя «Рост».
9.30 Пілігрым.
10.15 Праграма «45».
11.00 «Вострыя мёртвых», д/ф.
12.30 Сігнальны экземпляр.
12.40 Сялянскае пытанне.
13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
13.20 «Аляксандр Неўскі — цэль сусветная», д/ф.
13.30 Тэлеконкурс юрыстаў.
14.30 Гранд-рэпартаж.
15.00 «К-2»: «Зоркі Амерыкі».
15.30 Фільм-прэм'ер.
15.45 Футбол без граніц.
16.40 Прэзентацыя вечара Шатландскага тэлебачання: «Сільвер», м/ф «У іх будзе музыка», д/ф.
18.15 Вуснамі дзіцяці.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 «Фатальная памылка», м/ф /Шатландыя/.
21.00 «Конэры», д/ф /Шатландыя/.
22.00 Рэпарцёр.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 Праграма «А».
23.55 «Тое, што ты павінен даць», м/ф /Шатландыя/.
0.55 Праграма «А».

Санкт-Пецярбург

7.00, 18.30, 22.30 Інформ ТБ.
7.20 «Ён наводзіць жах», м/ф /ЗША/.
9.10 Нямецкая хваля.
9.40 Сам-насам з музыкай.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 Канцэрт па заяўках.
11.30 Тэледоктар.
11.45. «Навальніца», м/ф.
13.25. Сярэбраная ніць.
14.00 Сёння і штодзённа.
14.20 Рознакаляровы сабака.
14.40 Дзецям пра зверанят.
15.00 «Сініца, гай і агонь», мульт.
15.20 «Тры з палавінай дні з жыцця Івана Сяменава — другакласніка і другагодніка», м/ф.
16.45 Гістарычны альманах.
17.30 Спартыўны агляд.
18.05 Дарожныя прыгоды.
18.10 Вялікі фестываль.
18.55 Камертон.
19.40 Экспрэс-кіно.
20.00 Надоечы.
20.35 Ваш стыль.
20.40 «На парозе ночы», м/ф.
21.30 Тэатральная правінцыя.
22.50 Б. Шоу. «Прафесія місіс Уорэн», тэлеспектакль.

НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.00 Раніца рэспублікі.
8.10 Пад купалам Сусвету.
8.20 Пяць хвілін на жарты.
8.25 Слова да чалавека
8.55 Справы вайсковыя.
9.40 Урокі здароўя.
10.05 «Кароткая гульня», м/ф.
11.35 MTV. Лепшыя хіты.
12.05 Аэробіка.
12.40 Латарэя аўтографаў.
13.20 Тэлевізійны клуб «Гаў-гаў».
13.40 Кінаэкран-94. Люты.
14.45 АВС-клуб.
15.00 Шоу-TV «Тры апельсіны».
15.45 Азбука для бацькоў.
16.15 Літаўсынка.
16.45 Край. Р. Кобец.
17.25 «Гінес-шоу».
17.55 Ваўчок-шоу.
18.25 Запрашаем на вячоркі.
19.40 Студыя «Тэлесябрына»
20.00 Панарама.
20.35 Пад купалам Сусвету.
20.40 Кальханка.
21.00 Пяць хвілін на жарты.
21.10 «Доктар Паполь», м/ф /Францыя/.
22.55 «Не забудзьце ўключыць тэлевізар».
23.05 Каралеўскае паляванне.
0.05 Гран-пры РБ па лёгкай атлетыцы.

Канал «Астанкіна»

6.00, 14.00, 17.20, 24.00 Навіны.
6.20 Ранішняя размінка.
6.30 Тэлесерэнада.
7.00 Гадзіна сілы духу.
8.00 Без паўзы.
8.30 Раным-рана.
9.00 Палігон.
9.30 Тыраж «Спортлато».
9.45 Пакуль усе дома.
10.15 Ранішняя зорка.
11.05 Новае пакаленне...
11.45 Пад знакам «пі».
12.30 Правінцыя.
13.00 «Піф і Геркулес».
13.10 «Падводная адысея каманды Кусто».
14.20 Кампанія «Мір».
15.00 Клуб падарожнікаў.
15.50 «Кот Фелікс», «Сапраўдныя паляўнічыя на прывідаў».
16.40 Панарама.
17.10 Тэлелоцыя.
17.35 Галасы Расіі.
19.00 Надвор'е.
19.05 КВЗ-94.
21.00 Нядзеля.
21.45 Спартыўны ўік-энд.
22.00 Праменад у Марыінскім.
22.50 Аўта-шоу.
23.10 Вялікая прагулка.
23.45 «Парк культуры», «Босы вучоны», мульт.
0.20 Святло ласкавых зорак.

Канал «Расія»

8.00 Добрай раніцы.
8.30 Вялікі хакей.
9.00 Студыя «Рост».
9.30 Казырная дама.
10.00 Аты-баты...
10.30 Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з «Малой Еўропы».
11.00 «Лістапад», м/ф.
13.00, 19.00, 22.20 Весткі.
13.20 Не высечы...
13.35 Шэсць сотак..
13.55 Расійская энцыклапедыя.
14.25 Лепшыя гульні НБА.
15.20 Каробка перадач.
15.35 У свеце жывёл.
16.35 Кіно ў лютым.
16.55 Чароўны свет Дыснея.
17.45 Шпінаж.
18.15 «Семп'ес для чорна-белага кіно», м/ф.
18.45 Свята кожны дзень.
19.25 «Фаварыты месяца», м/ф.
21.45 У Ксюшы.
22.40 Аўтаімгненне.
22.45 Зоркі гавораць.
22.50 Спартыўная карусель.
22.55 Піна Баўш і іншыя.

Санкт-Пецярбург

7.00 «Гаючае слова».
7.30 «На парозе ночы», м/ф.
8.20 Пецярбургскі ангажэмент.
9.10 Экспрэс-кіно.
9.25 «Паліклініка ката Леапольда», «Асляня», «Чароўная птушка», мульт.
9.55 Новыя часы.
10.30 Хуткая дапамога.
11.00 Нядзельны лабірынт.
13.05 «Кошчын дом», тэлеспектакль.
14.30 Кідайка.
15.10 Залаты ключ.
15.20 «Перапалох», мульт.
15.35 Актуальная экалогія.
16.05 «Ашык-Керыб», м/ф.
17.40 Аўтапілот.
17.55 О-ля-ля!
18.30 Інформ ТБ.
18.55 «Йа Набіль», м/ф.
19.30 Эскізы харэаграфіі.
20.00 Вынікі.
21.05 Ваш стыль.
21.10 «Дамскі кравец», м/ф.
22.40 Адамаў яблык.
23.40 «Дзень добры, Вольга. Хело, Вольга».

31 студзеня - 6 лютага